ЛіМ

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

2 снежня 1994 г. № 48 (3770) Кошт 75 руб.

ЦІ ВАРТА АДРАДЖАЦЬ УНІЯЦТВА?

Язэп ПАЛУБЯТКА:
"Самае слушнае і разумнае на сённяшні дзень было б тое, каб Беларуская праваслаўная царква стала сапраўды аўтакефальнай, а наша каталіцкае духавенства мела стасункі з Рымам, а не з духавенствам суседняй дзяржавы".

4

У МЁРТВЫ СЕЗОН НА КУБЕ

Алесь ЖУК:
"Прамовы гучалі кароткія, з традыцыйнымі заклікамі ў канцы: "Куба — сі, янкі — но!" У час гэтых прамоў цябе зноў быццам ахутвала нябачная субстанцыя адчужанасці, якая не давала зразумець, што на самай справе адчувае і думае радавы кубінец".

5, 12

"ПРАФЕСІЯ НАС НАВАТ НЕ КОРМІЦЬ..."

Ігар ЗАБАРА:
"Я пацікавіўся, колькі каштуе ў Лондане тэатральны білет: ад 15 да 40 фунтаў. Сведчанне не апошняга месца тэатра ў грамадстве. Пустых тэатраў там няма. Пэўна, у кожным беларускім тэатры ёсць адзін-два спектаклі, на якіх зала не пустуе... Ці заўсёды ў гэтай пустаце вінаватыя акцёры? Але што трэба зрабіць, каб акцёры не зараблялі на жыццё абы-чым? Каб лепш займаліся спектаклямі?"

10



ДА СУСТРЭЧЫ, «ВОСЕНЬ»!

Махнуў лістапад снегавым крылом, пакінуўшы на ўспамін галасы і фарбы прамінулай "музычнай восені". І што б там ні казалі саматужныя эксперты па афішах, а галасы традыцыйнага, 21-га ўжо, фестывалю мастацтваў падаліся досыць паўнагучнымі, фарбы — вясёлкавымі. Не маючы аніякай фінансавай магчымасці зманіць з сусветнай гастрольнай арбіты якую-небудзь "валютную зорку", арганізатары сёлетняй "Беларускай музычнай восені" здолелі ўсё ж надаць фестывалю міжнароднае гучанне. У канцэртах удзельнічалі лепшыя нашы выканаўцы, былі й госці з адметнымі праграмамі. Была і публіка ў залах. Было з чаго і выбіраць.

20 лістапада прэм'еру Сімфоніі N 6 "Апакаліпсіс" прэзентаваў наш госць і добры сябра беларускай музыкі А. Янчанка: сам быў за дырыжорскім пультам, удзельнічала вялікая група выканаўцаў, тэкст з "Адкрыцця св. Іяана" чытаў акцёр-купалавец А. Мілаванаў. Першае выкананне блізкага па духу твора і завяршыла фестывальную дэкаду 30 лістапада: гэта была араторыя "Адкрыццё св. Іяана Багаслова" (раздзелы Свяшчэннага Пісання) В. Кузняцова. Між гэтымі двума асноватворнымі канцэртамі была і вялікая праграма Акадэмічнага народнага хору Беларусі пад кіраўніцтвам М. Дрынеўскага, і незвычайная імпрэза да 10-годдзя Дзяржаўнага ансамбля народнай музыкі "Свята", мастацкі кіраўнік якога В. Купрыяненка дэбютаваў яшчэ і ў нязвыклым амплуа дырыжора Камернага аркестра. У зале на Залатой Горцы прайшла ўражлівая чарада камерных канцэртаў...

Да сустрэчы, "Восень"! Няхай і праз год не паменее ў тваім календары сонечных філарманічных дзён.

С. ВЕТКА

Фота В. СТРАЛКОЎСКАГА

На здымках: з. а. Расіі І. Бачкова; з. а. Беларусі В. Купрыяненка.



ЛіМ КОЛА ДЗЁН

Нядзеля 27 лістапада была днём святога Піліпа. Лічылася, што пасля гэтага дня надыходзілі сапраўдныя халады, пра што ў народзе гаварылася вобразна: святы Піліп дзеці адзявае. А з 28 лістапада бярэ пачатак апошні ў годзе пост — калядны, або Піліпаўскі, які працягваецца да самых Каляд. Калісь з Піліпаўкай, парою, калі дзень "толькі да палудня", людзі звязвалі самыя розныя спадзяванні на характар надыходзячай зімы (па календары яна пачалася ўчора) і будучых вясны і лета. Казалі, напрыклад: калі калядныя запусты суправаджае непагадзь, то можна разлічваць на ўраджайнае лета. Гэта — калісь. А якімі прыкметамі кіравацца і з чым звязваць лепшыя спадзяванні нам сёння? Баліць душа не толькі ад благіх прадчуванняў, што заўтра жыць будзе цяжэй, чым сёння, а і ад няпэўнасці, нявызначанасці лёсу Бацькаўшчыны...

ЗВАРОТ ТЫДНЯ

Работнікі культуры і мастацтва звярнуліся са Зваротам да Прэзідэнта А.Лукашэнкі і спікера парламента М.Грыба. Чым выкліканы Зварот? Вядома ж, сённяшнім бядотным станам нацыянальнай культуры, творчых арганізацый і ўстаноў краіны. Сярод падпісантаў Звароту — многія вядомыя і шаноўныя імёны. Толькі ж — ці будзе пачуты іх голас гэты раз? Неаднойчы раней ён аказваўся голасам просьбіта ў пустыні...

ЗАГАДКА ТЫДНЯ

Як паведамляе "Звязда", справа небезвядомага Івана Місуны (сына былога першага сакратара Мінскага гаркама КПБ Мар'яна Місуны) набыла нечаканы працяг. Першамайскі народны суд г. Мінска атрымаў з Вярхоўнага суда РБ ліст з запатрабаваннем крымінальнай справы І.Місуны і з паведамленнем пра прыпыненне выканання прыгавору. Карэспандэнт газеты, натуральна, здзіўляецца: навошта такая спешка і як можна спыніць выкананне прыгавору, калі ён і так не выконваецца, бо І.Місуна ўцёк з залы суда? Ды самае дзіўнае ў тым, што на лісце пазначана: "копія Місуне Івану Мар'янавічу". Што гэта азначае? Хіба Вярхоўны суд ведае аб месцазнаходжанні беглага рэкеціра?

ПРАЎДА ТЫДНЯ

Пасля паездкі ў Польшчу Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.Грыб наладзіў прэс-канферэнцыю. Мечыслаў Іванавіч расказаў аб сустрэчах і перамовах, праведзеных нашай дэлегацыяй у суседняй краіне, падсумаваўшы аповяд словамі: "Навошта шукаць сяброў далёка за акіянамі, лепей прыгледзецца да сваіх суседзяў". Як кажуць, святая праўда! Ды толькі вось... Гаворачы аб становішчы беларусаў у Польшчы і палякаў у Беларусі, спадар Грыб зазначыў, што тут, маўляў, праблем няма. Што ж, пэўна, таксама праўда. Прынамсі, адносна беларусаў у Польшчы. Праблем сапраўды няма, бо і беларусаў там, бадай, таксама ўжо няма? Куды дзеліся? Асіміляваліся? Апалячыліся?..

АДРАС ТЫДНЯ

У Шклове, пасля працяглага супраціўлення мясцовых улад, створана нарэшце раённая арганізацыя Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Узначаліла яе супрацоўніца раённай газеты Вольга Паўлава. Гэты факт набывае асаблівую падсветку ў сувязі з тым, што спадарыня Паўлава жыве ў прэзідэнцкай вёсцы Рыжкавічы. Значыць, ёсць там і свядомыя беларусы? Праяўляла нацыянальную свядомасць, скажам, і жонка Прэзідэнта Галіна Радзівонаўна, заяўляючы неяк, што ў Беларусі павінна быць адна дзяржаўная мова — беларуская. Дарэчы, як паведамляе "Свабода", Галіна Радзівонаўна абяцала быць і на ўстаноўчай канферэнцыі ТБМ, ды штосьці перашкодзіла...

АДКЛІКАННЕ ТЫДНЯ

З паведамленняў друку стала вядома аб адкліканні П.Садоўскага з пасады пасла Беларусі ў Германіі. Аб прычынах гэтага акта не гаворыцца, аднак жа... Сярод дыпламатаў, якім было даручана прадстаўляць у краінах свету новую незалежную Беларусь, П.Садоўскі быў у ліку тых нямногіх, якія маглі гэта рабіць прафесійна і годна. Дык чаму ж тады? Няўжо адкліканы ён за тое, што "сведамы беларус" ды прыхільнік БНФ?

ІМЯ ТЫДНЯ

Усё ж слушна казаў коласаўскі дзяк Бацяноўскі: "Няма на свеце праўды, якая б не сталася яўнай, і ўсякую гардыню наказуе гасподзь". Праўда і справядлівасць заўсёды прабіваюць сабе дарогу. Гарадок Косава каля Івацэвіч першым надаў адной са сваіх вуліц імя слаўнага Касцюшкі, а цяпер вось Касцюшкава вуліца з'явілася і ў Лунінцы. Які горад наступны?

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Але ёсць і яшчэ адна грань праблемы. Вядома, кепска, што Прэзідэнт прыйшоў да ўлады без праграмы, але яшчэ горш — і без каманды. Памятаю выказванне аднаго з самых блізкіх ягоных саратнікаў напярэдадні выбараў, калі вынікі іх былі прадвызначаны на карысць Лукашэнкі: "Мне робіцца страшна: што мы будзем рабіць з уладай, калі пераможам?" Так і атрымалася. Улада аказалася цвёрдым арэшкам, адсюль і рознамаснасць "каманды", што сабралася пасля выбараў. У ёй людзі розных поглядаў, перакананняў, часам проста супрацьлеглых, а часам і проста тыя, што адбываюць нумар ці паказваюць сваю адданасць за прадастаўленае крэсла. Большасць з гэтых людзей ці не гатовыя працаваць на дзяржаўным узроўні, ці проста не жадаюць праводзіць палітыку пустых абяцанняў, за якія рана ці позна давядзецца адказваць".

(Генадзь Карпенка. "Казна пустая. Ці напоўняць яе абяцанкі?" "Народная газета" за 30 лістапада).

ЛІЧБЫ ТЫДНЯ

З серады, 30 лістапада, паўлітэрка "Пшанічнай" і "Сталічнай" каштуе 6230 рублёў, а пляшка "Маскоўскай" і "Рускай" адпаведна — 6160 і 6220 рублёў.

Праезд у электрычках з учарашняга дня падаражаў у два з паловай раза. У сярэднім у два разы ўзрасліі тарыфы на паслугі сувязістаў.

На гэтым тыдні ўрад выдаткаваў 9 млрд. рублёў на будаўніцтва жылля ваеннаслужачым і 18 млрд. рублёў для выраду з-пад дэнамінацыі ўкладаў насельніцтва, што былі ўнесены па стане на 1 студзеня 1991 года.

У чарзе на атрыманне жылля стаіць 700 тысяч сем'яў.

Больш за 10 тысяч пенсіянераў атрымліваюць пенсію меншую за мінімальную зарплату, 750 тысяч жывуць менш чым на 25 тысяч рублёў у месяц. Амаль кожны трэці жыхар Беларусі знаходзіцца за рысай беднасці.

70 мінчан бясплатна паабедалі клопатам Беларускага хрысціянска-дэмакратычнага саюза і Мінскага Свята-Петрапаўлаўскага сабора.

Аляксандр Курловіч на чэмпіянаце свету ў Стамбуле ўстанавіў ажно шэсць сусветных рэкордаў. У рыўках ён двойчы фіксаваў вагу 200,5 і 205 кілаграмаў, у штуршках — 252,5 і 253 кілаграмы, а ў суме двухбор'я атрымалася 453 і 458 кілаграмаў.

У нашай краіне зарэгістравана 1538 сумесных прадпрыемстваў і 553 замежныя фірмы. 68 юрыдычных і фізічных асоб з Беларусі ўдзельнічаюць у вытворчай дзейнасці за межамі сваёй дзяржавы. 12 прадпрыемстваў з удзелам беларускага капіталу зарэгістравана ў Польшчы, 8 — у Літве, па 5 — у Аўстрыі, Балгарыі, Венгрыі, 4 — у Кітаі, па 3 — у Германіі і ЗША, па 2 — у Латвіі і Чэхіі, па 1 — у Англіі, Канадзе, Егіпце, В'етнаме, Ліване, Турцыі, Швейцарыі, Іарданіі, Італіі, Румыніі, Мадагаскары, Марока, Бельгіі, Сінгапуры, Галандыі, С'ера-Леоне, Гібралтары, Нігерыі, Нікарагуа...

18 лістапада адбылося пасяджэнне рэспубліканскай рады Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Рада прыняла дзве спецыяльныя пастановы і зварот да грамадзян Беларусі. Прапануем гэтыя дакументы ўвазе чытачоў "ЛіМа".

АБ ВЫБАРАХ У ВЯРХОЎНЫ САВЕТ

Заклапочаныя лёсам нацыянальна-культурнага адраджэння Бацькаўшчыны і выказваючы напярэдадні выбараў у Вярхоўны Савет і мясцовыя органы ўлады рэспублікі сваю грамадзянскую пазіцыю, рэспубліканская рада Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны пастанаўляе:

1. Лічыць удзел суполак і сяброў ТБМ у выбарах у Вярхоўны Савет і мясцовыя органы ўлады краіны найважнейшай агітацыйна-асветніцкай кампаніяй, скіраванай на прапаганду ідэй нацыянальна-культурнага адраджэння, на пашырэнне ў грамадскім ужытку беларускай мовы і ўмацаванне дзяржаўнасці Беларусі.

2. Рэкамендаваць арганізацыям, сябрам ТБМ імя Ф.Скарыны прыняць на аснове дзейнага заканадаўства краіны актыўны ўдзел у вылучэнні кандыдатаў, прапагандзе перадвыбарчых праграм, у агітацыйна-масавай працы на ўсіх этапах правядзення выбараў. Прапанаваць усямерна падтрымліваць тых кандыдатаў, у праграме якіх яскрава выяўлена ідэя нацыянальна-культурнага адраджэння і станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы.

АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ МОЎНАЙ ПАЛІТЫЦЫ

Грунтуючыся на Канстытуцыі, на дзейным заканадаўстве аб мовах, аб культуры, аб адукацыі Рэспублікі Беларусь і выказваючы занепакоенасць тым, што дзяржаўная моўная палітыка ў Беларусі не ажыццяўляецца належным чынам, а апошнім часам нават інспіруецца пэўнымі сіламі супрацьдзеянне яе ажыццяўленню, рэспубліканская рада Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны

пастанаўляе:

1. Запатрабаваць ад усіх дзяржаўных структур і службовых асоб Рэспублікі Беларусь няўхільнага выканання палажэнняў Канстытуцыі краіны, у якіх замацаваны дзяржаўны статус беларускай мовы.

Асудзіць непатрыятычныя праявы нацыянальна-дзяржаўнага нігілізму і грэблівага стаўлення да мовы беларускага народа з боку асобных дзяржаўных служачых, пэўных грамадскіх аб'яднанняў альбо іншых структур.

2. Звярнуцца да Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь з грамадскай ініцыятывай зацвердзіць у Законе аб бюджэце на 1995 год і ў падатковым заканадаўстве такія палажэнні, якія б гарантавалі паспяховае і поўнае ажыццяўленне Закона аб мовах, Закона аб культуры, Закона аб адукацыі і іншых нарматыўных актаў, якія рэгулююць моўна-культурныя дачыненні ў грамадстве.

Лічыць недапушчальным згортванне канкрэтных праграм дзяржаўнай падтрымкі беларускай культуры, кнігавыдання, перыядычнага друку і іншых сродкаў масавай інфармацыі, нацыянальнай сістэмы адукацыі. У адпаведнасці з Законам і неад'емным правам народа беларускае слова ў сацыяльна-грамадскім ужытку Бацькаўшчыны павінна мець сапраўды дзяржаўнае ґучанне.

3. Усведамляючы асабліва важную ролю школы ў справе дзяржаўнага і моўна-культурнага адраджэння Беларусі, аказваць больш дзейсную падтрымку органам, установам і работнікам азначанай галіны, якія самаахвярнымі высілкамі ствараюць падмурак нацыянальнай сістэмы адукацыі, забяспечваюць навучальна-выхаваўчы працэс згодна з патрабаваннямі заканадаўства. Без нацыянальнага дашкольнага выхавання, без сапраўды беларускай сярэдняй і вышэйшай школы не мае будучыні беларуская дзяржава.

4. Падтрымаць зварот бацькоў, вучняў беларускіх школ і класаў да Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб пераводзе Беларускага дзяржаўнага універсітэта на беларускую мову з 1 верасня 1995 года.

5. Ухваліць ініцыятыву шырокай грамадскасці Беларусі аб неадкладным стварэнні другога, цалкам беларускамоўнага, нацыянальнага канала Беларускага тэлебачання і звярнуцца да Кабінета Міністраў Рэспублікі Беларусь з прапановай вырашыць гэта пытанне з улікам інтарэсаў незалежнай краіны, якая не можа развіваць сваю дзяржаўнасць і нацыянальную культуру без дастаткова развітой інфармацыйнай прасторы.

ДА ГРАМАДЗЯН БЕЛАРУСІ!

Апошнім часам, небеспадстаўна разлічваючы на падтрымку найвышэйшых асобаў улады, у нашай краіне актывізавалі сваю дзейнасць антыбеларускія сілы, якія маюць за мэту спыніць працэс беларускага нацыянальнага адраджэння і станаўлення незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Дзеля гэтага ў сродках масавай інфармацыі — у газетах, на радыё і тэлебачанні ставяцца пад сумненне праўдзівыя факты беларускай гісторыі, ідзе байкот выканання Закона аб мовах, адкрыта гучаць заклікі да замены дзяржаўнай нацыянальнай сімволікі, да вяртання Беларусі ў абдымкі імперыі.

Запаволілася работа па аднаўленні гістарычных беларускіх найменняў вуліц, вёсак і гарадоў у нашай краіне, навучальныя ўстановы, калгасы і саўгасы па-ранейшаму носяць імёны партыйных дзеячаў і дзяржаўных кіраўнікоў былога Саюза, а таксама людзей, якія засведчылі сябе ў гісторыі як ворагі незалежнай беларускай дзяржавы. Рускамоўныя шыльды па-ранейшаму застаюцца на сценах большасці адміністрацыйных будынкаў, навастворaных устаноў і камерцыйных структур, у значнай ступені рускамоўным застаўся гарадскі і міжгародні транспарт. Шэраг газет і часопісаў на нашай мове, сістэма беларускага кнігавыдання пакідаюцца сёння на волю стыхіі дзікага рынку. Тармозіцца падрыхтоўка да пераводу вышэйшых навучальных устаноў на беларускамоўнае навучанне, і беларус па-ранейшаму не мае магчымасці атрымаць адукацыю ў ВНУ на роднай мове. Ідзе адкрыты наступ на беларускую мову ў школах, сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Прылюдна, у стылі мінулых часоў, нацыянальна свядомыя грамадзяне Беларусі абвінавачваюцца ў нацыяналізме, распальванні нацыянальнай варожасці, разбурэнні стабільнасці і спакою ў грамадстве — толькі за тое, што беларус пачаў гаварыць на мове сваёй дзяржавы, на мове сваёй зямлі, мове сваіх продкаў. І ўсё гэта адбываецца ў краіне, дзе прадстаўнікам іншых нацыянальнасцяў, таксама як і іншым мовам, ніхто і нішто не пагражае. Беларуская зямля, на жаль, становіцца прытулкам усяму антыбеларускаму, карумпаванаму, крымінагеннаму. Гэта не можа не трывожыць усіх сумленных грамадзян Беларусі, бо пад пагрозай незалежнасць нашай дзяржавы.

Рэспубліканская рада ТБМ заклікае ўсіх свядомых грамадзян Беларусі, патрыётаў Бацькаўшчыны, стварыць супрацьстаянне гэтай змрочнай антыбеларускай імперскай плыні, на падставе Канстытуцыі і законаў не даць магчымасці задушыць імкненне беларусаў стаць сапраўднымі гаспадарамі на сваёй зямлі.

Набліжаюцца выбары ў Вярхоўную Раду краіны. Гэта выключна адказныя выбары. У нас ёсць магчымасць выбраць у вышэйшы орган сваёй улады людзей адданых Беларусі, людзей, заклапочаных яе лёсам, самаахвярных і сумленных. Толькі ўсведамляючы свой нацыянальны абавязак і вялікую адказнасць перад дзецьмі і ўнукамі, перад будучыняй Радзімы, мы можам разлічваць на годнае месца ў супольнасці еўрапейскіх народаў.

Жыве Беларусь!

НЕ ЗАПЛАЦІЎ — ВЫСЯЛЯЙСЯ!

КРЫТЫЧНЫЯ НАТАТКІ ПА "КВАТЭРНЫМ ПЫТАННІ"

Калі ў некага і развіта пачуццё ўласніка, дык гэта ў дзяржавы. На гэты раз дзяржава вырашыла "пагуляць" мускуламі на рынку жылля, які манапольна ёй належыць.

"Пробныя шары", запушчаныя праз прэсу, невыразныя тлумачэнні адказных міністраў, а таксама іх запэўніванні ў поўнай і гарантаванай абароне малазабяспечаных далі лёгка пралічваемы эфект. Публіка, вопытная ў стасунках з уладай, хутка зразумела, што насоўваецца абавязковае і незваротнае павышэнне квартплаты, прычым на нябачаным узроўні. І не памылілася...

Так, месячная плата за аднапакаёвую кватэру, па разліках Мінжылкамгаса, складзе 138,4 тысячы рублёў, а за трохпакаёвую — 292,5 тысячы рублёў у месяц. У залежнасці ад колькасці жыхароў магчымы адхіленні ў суме плацяжу, але нязначныя.

Вядома, павышэнне платы за жыллё — мера, з пункту гледжання ўсіх аўтараў рынкавых рэформ, зусім неабходная. І ў далейшым. І ў далейшым штатныя прапагандысты ўрада будуць узмоцнена спасылацца на вопыт Захаду, дзе доля квартплаты ў выдатках сям'і дасягае 30—40%. Аднак гэта, мякка кажучы, паўпраўда.

Пачнём з таго, што за свае грошы кватэранаймальнік на Захадзе атрымлівае жыллё еўрапейскіх альбо амерыканскіх стандартаў. Да гэтага неабходна дадаць, што доля муніцыпальных кватэр у структуры, скажам, еўрапейскага рынку жылля традыцыйна невялікая. Паняцце ж "дзяржаўнае жыллё" хутчэй супастаўляльнае з тым, што мы называем "ведамаснымі" кватэрамі. У некаторых еўрапейскіх краінах, у прыватнасці, у Францыі і Германіі, некаторыя катэгорыі чыноўніцтва атрымліваюць службовыя кватэры. Што ж тычыцца большасці грамадзян, то яны або з'яўляюцца ўласнікамі жылля, або наймаюць кватэру ў прыватных асоб.

У Вялікабрытаніі за дзесяцігоддзе праўлення Маргарэт Тэтчэр колькасць людзей, якія валодаюць уласнымі дамамі, павялічылася з 53% у 1979 годзе да 68% у 1989 годзе. Пры гэтым асігнаванні на грамадскае жыллёвае будаўніцтва скараціліся з 1984 па 1989 год на 60%. Адначасова інтарэсы кватэранаймальнікаў абаронены законамі, якія абмяжоўваюць апетыты домаўладальнікаў. У прыватнасці, у шэрагу краін закон забараняе павышэнне кватэрнай платы без згоды арандатара (наймальніка),

ГРОЗАЎ ПАМЯТАЕ

26 лістапада высілкамі Аргкамітэта БНФ па святкаванні 74-ых угодкаў Слуцкага збройнага чыну ў вёску Грозаў Капыльскага раёна прыехала група беларускіх навукоўцаў, інтэлігенцыі, рабочых, студэнтаў, вайскоўцаў. Яны ўшанавалі памяць 2-га Грозаўскага палка, які быў сфармаваны ў лістападзе 20-га года з мясцовага насельніцтва для абароны Беларускай Народнай Рэспублікі. Палкавыя батальёны вялі цяжкія баі з наступальным войскам бальшавіцкай Расеі. Баронячы годнасць Случчыны, яны баранілі годнасць усёй Бацькаўшчыны. І толькі сіламі прафесійнага расейскага войска — Омскай дывізіі пры ўдзеле кітайскіх "інтэрнацыяналістаў" — Грозаўскі полк адступіў за дэмаркацыйную мяжу ў Польшчу.

У гонар гэтай падзеі ў Грозаве пры ўдзеле вялікай колькасці мясцовых людзей быў усталяваны сімвал-крыж, які асвяціў настаяцель Івянецкай Свята-Ефрасіннеўскай царквы айцец Віктар. На мітынгу выступілі старшыня аргкамітэта, прафесар беларускага эканамічнага універсітэта Мікола Савіцкі, навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Ніна Стужынская, народны дэпутат РБ, галоўны рэдактар газеты "Свобода" Ігар Гермянчук, старшыня рады згуртавання "Бацькаўшчына" Ганна Сурмач.

Сімвалічна прагучалі выступленні маладога грозаўскага настаўніка Міколы Рыбака і грамадзяніна Бельгіі, ураджэнца Клецкага раёна Янкі Жучкі, які і на чужыне захаваў памяць аб яркіх падзеях не такой далёкай мінуўшчыны. Была выказана падзяка ў адрас старшыні Грозаўскага сельсавета сп. А. Грыцкевіча: ён падзяржаўнаму паставіўся да неабходнасці ўшанаваць светлую памяць змагароў за Беларусь.

У гэты ж дзень быў ускладзены вянок ля крыжа ў вёсцы Семежава, дзе размяшчаўся штаб слуцкіх паўстанцаў.

Мікола АНЦЫПОВІЧ

Фота У. КАРМІЛКІНА

Памяркуем

ЯШЧЭ АДНА «ГАРАЧАЯ КРОПКА»...

Імя Джахара Дудаева ў нас на слыху даўно: усё, што адбывалася ў Чачні, расійская прэса падавала выключна як генеральскую прыхамаць. Маўляў, мяцежны вайсковец прыйшоў да ўлады і насуперак волі народа ўзяў курс на ізаляцыю. Уражлівая ілюстрацыя да ролі асобы ў гісторыі...

Такое паняцце, як "незалежнасць", у афіцыйных сродках інфармацыі не ўжывалася. Прэса ўвогуле была падазрона стрыманай у ацэнках і фармулёўках сутнасці падзей (як і адносна Сербіі, Абхазіі, Асеціі... (Не то "авантуру" Дудаева напачатку хацелі ціха "замяць", не то шукалі спосабу, як змагацца з падобным "авантурызмам". Балазе — не ўпершыню, і маецца цэлы арсенал прыёмаў. Маленькая Чачня хоча быць вольнай ад вялікай Расіі?! Гэта быў прамы выклік, прэцэдэнт, небяспечны для федэрацыі. Натуральным чынам спрацаваў імперскі аварыйны механізм, былі націснуты патрэбныя кнопкі, прыведзены ў рух патрэбныя сілы. У тэлесюжэтах пачалі з'яўляцца незадаволеныя палітыкай Дудаева жанчыны. (Бясспройгрышная карта! Слабы пол найперш выручае ў далікатных сітуацыях.) Пасля знайшліся незадаволеныя мужы, браты, пляменнікі і іншыя сваякі, закіпелі страсці вакол дудаеўцаў, — загаварылі пра апазіцыю. З апазіцыі вылучыўся лідэр, у момант вока зляпалі "Временный совет", аднекуль узялася зброя разам з расійскімі афіцэрамі, — вось табе і арганізаванае супроцьдзеянне ўраду Дудаева!

А хіба ў Чачні можа быць ціхамірнае супроцьстаянне? Не такі гэта народ, каб у парламенце вырашаць свае рознагалоссі. З характарам народ, з характарам! Са здольнасцю да ўчынкаў, з мужнасцю, з самапавагай. Гарачы, адным словам.

Так з'явілася яшчэ адна "гарачая кропка" на карце.

У народа, які раздзяліўся ў сабе, мала шанцаў на перамогу. А бывае ж яшчэ і нябачнае, непрыкметнае, неўсвядомленае раздзяленне. Ну, такое хаця б, як у беларусаў. Адны хінуцца на Усход, другія паглядаюць на Захад, а трэція проста жыта сеюць. І такое раздзяленне, як на мой розум, па сваіх выніках не намнога лепш за ўзброеную сутычку. Гэта — як багна, што зацягвае ахвяру паволі. Як хвароба, загнаная ўглыб, якая, тым не менш, тлее і атручвае грамадскі арганізм.

Дык няўжо "або — або"? Няўжо няма нейкага трэцяга цывілізаванага шляху, каб "выздаравець", г.зн. усвядоміць уласныя слабыя бакі, вызначыць сутнасць светапоглядных і палітычных разыходжанняў, знайсці, урэшце, спосаб паразумецца на зямлі немалога, пасярэдзіне Еўропы размешчанага народа?

Падобна, што на чужых памылках сапраўды не вучацца. Інакш, зыходзячы з законаў логікі, пасля Французскай рэвалюцыі з яе Канвентам і гільяцінай у свеце ўжо не магло быць ніякіх сацыяльных рэвалюцый. Тым не менш...

Нядобрыя падзеі адбываюцца ў межах былога СССР. Снуюць танкі, гараць будынкі, тузаюцца пад чужой рукою невідушчыя лялькі-марыянеткі, вось толькі кроў ліецца зусім не "тэатральная" — сапраўдная чалавечая кроў.

"Почему война на территории России остается тайной для России?" — пытаецца перадавы артыкул "Известий". Учытайцеся: вайна на тэрыторыі Расіі... А што наконт тайны, дык усе гэтыя закулісныя крывавыя "гульні" — тайна адно для тых, хто не жадае ні чуць, ні бачыць, ні разумець...

Г.К.

СЯРОД ДВАЦЦАЦІ — ТРОЕ БЕЛАРУСАЎ

Міжнародная армянская асамблея, штаб-кватэра якой знаходзіцца ў Маскве, але якая звязана з усімі армянскімі дыяспарамі свету, прысудзіла першыя прэміі імя Фрыцьёфа Нансена ў галіне літаратуры, культуры і навукі. Прэміі носяць імя вялікага нарвежца ў знак прызнання заслуг гэтага чалавека перад армянскім народам: ён актыўна супрацьстаяў генацыду армян у 1915 годзе. І сама прэмія прысуджаецца за асаблівыя адносіны да Арменіі.

Сярод 20 першых лаўрэатаў — Васіль Быкаў, Рыгор Барадулін і Васіль Якавенка. В. Быкаў нямала спрыяў таму, каб перамагла справядлівасць у справе аднаго армянскага палітычнага дзеяча, якая разглядалася ў Брэсцкім абласным судзе. Высока ацэнены і публіцыстычныя нататкі В. Быкава "Аб Арменіі". В. Якавенка ў самы цяжкі час карабахскага канфлікту асабіста быў у эпіцэнтры падзей, словам і справай дапамагаючы стабілізаваць сітуацыю. Р. Барадуліну прэмія прысуджана за цыкл вершаў аб Арменіі і за пераклад кнігі армянскага класіка Г. Нарэкацы.

Пошта

РАЗМОВА ІДЗЕ...

Размова ідзе,
А справа стаіць.
Размова ідзе,
Ім не баліць.
Ім не баліць,
Бо жабрацтва мяжа
Не побач з імі,
Далёка ляжыць.
Размова ідзе,
Душа не баліць
Аб тых,
хто не ведае,
Як ім пражыць.
Аб тых, хто завецца
Працоўны народ,
Аб тых, да каго
Прэзідэнцкі зварот.
Аб тых, абяцанкі
Каму раздаюць.
Аб тых, з каго скуру
Бясконца дзяруць.
Размова ідзе
На высокім узроўні
Пасля адпачынку
Ад поўні да поўні.
А цэны імкліва
Працягваюць скокі,
Бо робіць не тое
Форум высокі.
Размова ідзе,
Размова ідзе.
Хто праўду
нам скажа
І нас павядзе
Нарэшце да праўды,
Да лепшага свету?
Ці будзе, скажыце,
Калі-небудзь гэта?
Размова ідзе,
Размова ідзе...

Фёдар ШКІРМАНКОЎ

г. Слаўгарад

СЛОН СУПРАЦЬ МЫШЫ?

26—27 лістапада ў Віцебску праходзіў "Першы з'езд нацыяналістаў". Людзям, здольным на гумар, сама назва мерапрыемства адкрыла б вочы на, так бы мовіць, чарговую ідэалагічную містыфікацыю (папярэдняя была разыграна С. Адамовічам і К° акурат па выбарах прэзідэнта і мела назву — газетную — "Правы рэванш"). Аднак нездарма ходзяць анекдоты пра "неулыбчивость" людзей у форме: віцебская міліцыя і АМАП успрынялі з'езд маладых інтэлектуалаў-містыфікатараў няйнакш як збор змоўшчыкаў з мэтай гвалтоўнага палітычнага пераварфоту ў межах вобласці і зрабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб яго прадухіліць (пра гэта дружна пісалі ці не ўсе штодзённыя газеты і, напэўна, яшчэ доўга будуць пісаць). Карацей кажучы, "камандна-адміністрацыйны дэбіл" (тэрмін Алеся Адамовіча) ў чарговы раз супраць мышы выпусціў слана... Змагаючыся, такім чынам, са "сланом" у сваім уяўленні, а не з рэальнымі малойцамі са Славянскага сабора, філіі ЛДПР і "Русского национального единства", што падчас разборак з неіснуючым "Правым рэваншам" вальготна пачуваліся на вуліцах Віцебска. Выснова з гэтага можа быць толькі адна: прырода і асабліва псіхіка нашай міліцыі наўрад ці змяніліся з восені 1988 года.

Н. К.

паколькі гэта ўяўляе сабой аднабаковыя змены ўмоў дагавору. Ды і скасаваць дагавор раней тэрміну без згоды арандатара жылля можна толькі ў судовым парадку.

Пра замежны вопыт мы яшчэ пагаворым, а пакуль вернемся да рэальнасці беларускай. Задума правесці шокавае павышэнне квартплаты саспела, відаць, па той прычыне, што дзяржава канчаткова страціла кантроль над іншымі спосабамі папаўнення бюджэту. Калі ж гаварыць пра жыллёвую рэформу, дык яна павінна праводзіцца з крыху іншымі задачамі. Стратэгічнай мэтай такой рэформы павінна стаць стварэнне жыллёвай сістэмы, пры якой большасць домаўладальнікаў будзе здольна аплачваць поўны кошт свайго жылля, набытага па рынкавых цэнах, у той час як дапамога дзяржавы накіроўваецца толькі тым, хто мала забяспечаны. Ключавым палажэннем павінна стаць менавіта здольнасць грамадзян аплачваць жыллё.

Адна справа — плаціць за аднапакаёвую кватэру 140 тысяч рублёў у месяц пры мінімальнай зарплаце, скажам, 600 тысяч. І іншая — у нашых цяперашніх умовах, калі 5 мільёнаў чалавек апынуліся за мяжой беднасці. Толькі не трэба спасылацца на адрасную дапамогу тым, хто мае патрэбу. Растлумачу гэта на прыкладзе.

У 1949 годзе відны эканаміст аўстрыйскай школы Людвіг фон Мізес у сваёй кнізе "Дзеянні чалавека" заўважыў, што спроба дамагчыся льгот для якіх-небудзь сацыяльных груп шляхам умяшальніцтва ў рынкавы механізм звычайна дае супрацьлеглы эфект.

Магчыма, не ўсе ведаюць, але "шведская мадэль" таксама прадугледжвае жыллёвыя субсідыі маламаёмасным. На мяжы 80—90-х гадоў там быў падрыхтаваны ўрадавы даклад аб жыллёвай палітыцы. Высновы былі несуцяшальныя. Большую частку штогадовай датацыі на жыллё ў 38 млрд. шведскіх крон атрымалі пласты насельніцтва з высокімі даходамі. Сем'і, якія зарабляюць ад 90 да 110 тыс. крон у год, атрымалі з гэтага датацыйнага фонду ў сярэднім 6500 крон. А сем'і з гадавым даходам 210 тыс. крон і больш — 21500. Гэта ў Швецыі, краіне з распрацаваным кадыфікаваным правам, даўнімі традыцыямі павагі да закона і развітым грамадскім кантролем. У што ж ператворыцца "дапамога бедным" у нас? І колькі спатрэбіцца антыкарупцыйных камісій?

Дадам, што сваім рашэннем улады зводзяць на нуль перавагі прыватызацыі — па той прычыне, што ў структуры платы за жыллё пераважную частку будуць займаць плацяжы за камунальныя паслугі, электраэнергію, ацяпленне, газа- і водазабеспячэнне. А манаполія на гэтыя паслугі ў нас належыць роднай дзяржаве. Дадайце сюды яшчэ мяркуемы падатак на нерухомасць, а таксама падаткатворчасць мясцовых улад. Не здзіўляе, што цяпер прыватызавана толькі крыху больш за чвэрць жыллёвага фонду.

Магчыма, чытачам ужо абрыдлі спасылкі на "перадавы вопыт". Але цяжка ад іх стрымацца, асабліва гледзячы на вынікі "рэфарматарскага" старання беларускіх улад. Вучыліся б, на старэйшых гледзячы, як гаварыў пан Фамусаў...

У Англіі кожны, хто займаў жыллё, пабудаванае на дзяржаўныя грошы, мог яго выкупіць на выгадных умовах, калі пражыў у ім больш за два гады. Цана ўстанаўлівалася адпаведна з рынкавай вартасцю, а ў выпадку нязгоды з ёй — судовымі інстанцыямі.

Устаноўленая такім чынам сума змяншалася на трэць праз два гады карыстання жыллём, а потым — на 1% кожны наступны год. Максімальная скідка даходзіла да 60%. Акрамя таго, пакупнік меў права на іпатэчную пазыку, якая прадастаўлялася на такіх умовах, каб штомесячныя выплаты ў кошт яе пагашэння не перавышалі па памеры ранейшую квартплату. Зрэшты, для Беларусі такое рашэнне не больш чым фантастыка.

Але існуюць і іншыя апрабаваныя метады пераводу эксплуатацыі жылля на рынкавыя рэйкі. З мэтай паслаблення шокавага эфекту ад павышэння цэн на жыллёва-камунальнае абслугоўванне можна было б прадугледзець паступовае павышэнне аплаты паслуг на працягу 3—5 гадоў, а не некалькіх месяцаў, як гэта спрабуюць зрабіць у Беларусі.

Прычым, сістэма кампенсацый павінна залежаць ад жыллёвых умоў грамадзян. Інакш кажучы, плата за жыллё і паслугі павінна быць рознай для насельнікаў дэпутацкіх гняздзечкаў на вуліцы Дразда і баракаў, скажам, па вуліцы Шчорса — у Мінску, напрыклад.

На першым этапе агульная сума выплат не павінна перавышаць 5% ад сукупнага даходу сям'і ў сярэднім, а не 15%, як плануюць у нас. І толькі праз некалькі гадоў, к канцу рэфармавання, доля аплаты жылля можа дасягнуць нават і 20% сукупнага даходу сям'і, што дазволіць аплачваць за кошт насельніцтва 70—80% затрат па найме або арэндзе жылля. Астатнія 20—30% выдаткаў на ўтрыманне, рамонт і камунальныя паслугі павінны фінансавацца з мясцовых бюджэтаў у форме безнаяўных выплат эканамічна абароненым пластам насельніцтва.

У процілеглым выпадку ўжо да вясны нас могуць чакаць масавыя адмовы плаціць за кватэры і камунальныя паслугі. Спробы ж гвалтоўнага ўтрымання запазычанасці і высяленне з кватэр могуць выклікаць такую сацыяльную напружанасць, з якой у рэспубліцы яшчэ не сутыкаліся.

Ёсць і яшчэ адзін змрачнаваты прагноз. Аўтары праекта жыллёвых рэформ у Беларусі мяркуюць, што высокая аплата прымусіць людзей, галоўным чынам пенсіянераў, пазбаўляцца лішкаў жыллёвай плошчы, адначасова зарабляючы на гэтым "добры прыварак" да пенсіі. Тэарэтычна можа і так. Але ў нашых умовах гэта, хутчэй за ўсё, абернецца масавымі афёрамі, складаннем фіктыўных завяшчанняў і г. д. Прыкладаў гэтага — шмат, дастаткова расійскія газеты пачытаць. З нядаўняга часу і ў нашых выданнях замільгалі падобныя факты. Нерухомасць заўсёды ў цане!

Аляксандр МАМЕТАЎ

У «ЛЯЛЬКІ» — НАВАСЕЛЛЕ

У будынку былога Віцебскага гаркама партыі адкрывае новы сезон тэатр лялек "Лялька". Радасць наваселля прыйшла яшчэ з адной прыемнай падзеяй. На трэцім Міжнародным фестывалі "Інтэр-лялька-94", які прайшоў у Ужгарадзе і ў якім бралі ўдзел калектывы з Расіі, ЗША, Чэхіі, Сербіі, Венгрыі, Румыніі, Украіны, віцебскія лялечнікі занялі першае месца. А галоўны мастак тэатра Аляксандр Сідараў стаў лаўрэатам прэміі імя Л. Мазалеўскай за сцэнаграфію спектакля "Загубленая душа".

На здымках: артысты віцебскага тэатра лялек "Лялька"; галоўны мастак тэатра, лаўрэат прэміі імя Л. Мазалеўскай Аляксандр Сідараў.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

УСЁ ЛЕПШАЕ — ДЗЕЦЯМ...

Радуе, што ў часы нялёгкага лёсу многіх устаноў сістэмы адукацыі яшчэ адзін даўгабуд перастаў быць такім. У Баранавічах расчыніў свае дзверы перад дзецьмі Дом школьніка. Размясціўся ён у перабудаваным будынку былога гаркама. Мноства пакояў, залаў, вестыбюляў аддадзена ў распараджэнне дзятвы. Адначасова 3600 навучэнцаў горада могуць займацца тут любімай справай. З дапамогай вопытных педагогаў і майстроў школьнікі спасцігаюць асновы эстэтыкі, мастацкай і тэхнічнай творчасці, займаюцца любімымі відамі спорту і мастацтва.

Ёсць у Дома школьніка і свае праблемы. Перш за ўсё — гэта недахоп абсталявання, асабліва для гуртковай работы. Пакуль яшчэ няма ў яго надзейных спонсараў, а аддзел народнай адукацыі, якому належыць дом, са сваім небагатым бюджэтам не ў сілах забяспечыць яго ўсім неабходным.

На здымку: чарговую абрадавую кампазіцыю рыхтуюць члены клуба "Крынічка".

Фота Эдуарда КАБЯКА, БЕЛІНФАРМ

Думка чытача

ЦІ ВАРТА АДРАДЖАЦЬ УНІЯЦТВА?

Шмат хто з адраджэнцаў, прачытаўшы назву артыкула, незадаволена хмыкне; зацятыя прыхільнікі беларускасці выкажуцца пра аўтара гэтых радкоў больш абразліва. Не мною прыдумана — кожнаму сваё. Я ведаю: выказваць сумненне наконт рэлігіі і беларускасці зараз усё роўна, што стаяць у спёку босымі нагамі ў прысаку: знізу будзе пячы агонь, зверху пражыць сонца. Я не збіраюся аспрэчваць галоўнае — у беларусаў павінна быць адзіная рэлігія. І тым не менш, калі абмяркоўваецца нейкая праблема, варта ўлічваць погляды ўсіх, нават тых, хто не мае ў гэтым пэўнага інтарэсу: ні казённага, ні ўласнага...

Перш чым пачаць разгляд сутнасці самога пытання, звернемся крыху да гісторыі.

У кастрычніку 1596 года на царкоўным саборы ў Берасці паміж найвышэйшымі праваслаўнымі і каталіцкімі іерархамі Вялікага княства Літоўскага было падпісана ўзаемапрымальнае пагадненне. (Заўважым: на той час!). Якія ж прычыны прымусілі дзве царквы адной дзяржавы пайсці на пэўны кампраміс, знайсці шляхі паразумення і ўз'яднацца? Хто ці што прымусіла іх да гэтага?

Па-першае, у той час узнікла агульная патрэба супрацьстаяць магутнаму рэфармацыйнаму руху, які ўсё больш і больш уплываў на жыццё вернікаў ва ўсёй Еўропе, у тым ліку Вялікім княстве Літоўскім. Па-другое, праваслаўная царква ВКЛ імкнулася да уніі з каталіцкай царквой яшчэ і таму, што над ёй паўстала рэальная пагроза з боку ўтворанай у 1589 годзе Маскоўскай патрыярхіі, якая абвясціла сябе пераемніцай Канстанцінопаля (які ў 1453 годзе быў заваяваны туркамі) і прэтэндавала на падпарадкаванне земляў, населеных праваслаўнымі. Ідэю царкоўнага ўз'яднання актыўна падтрымліваў і ўрад Вялікага княства Літоўскага, бо слушна разлічваў праз яе дасягнуць спакою ў дзяржаве, спыніць нарастанне канфліктаў на рэлігійнай глебе.

У чым быў сэнс гэтага гістарычна-значнага пагаднення? Якія прывілеі атрымлівалі яго ўдзельнікі і якія бралі на сябе абавязкі? Згодна з умовамі таго пагаднення праваслаўныя іерархіі атрымлівалі некалькі месцаў у Радзе Вялікага княства і прытым прызнавалі над сабою выключна ўладу папы рымскага, пры гэтым пазбаўляліся адразу ўсялякіх прэтэнзій з боку маскоўскіх патрыярхаў. Разам з тым у праваслаўнай царкве Вялікага княства захаваліся ўсходнія грэка-візантыйскае набажэнства і рытуалы, заставаліся таксама непарушнымі ўсе зямельныя ўладанні. У царкоўнай практыцы прадугледжвалася карыстанне старым юліянскім календаром.

Пра жыццёвую неабходнасць і палітычную правільнасць гэтага пагаднення сведчыць той факт, што на працягу XVII стагоддзя да уніяцтва схіліліся амаль усе праваслаўныя вернікі Вялікага княства.

Вось такія былі перадумовы і вынікі таго пагаднення. А цяпер давайце вернемся ў сённяшні дзень і паспрабуем правесці аналіз такой з'явы, як уніяцтва, зараз.

На думку тых, хто хоча вярнуць уніяцтва, яно павінна з'яднаць беларускую нацыю, стаць яе стрыжнем. Тут я ва ўсім згодзен. А вось як гэта павінна адбыцца? Вернікі добраахвотна пяройдуць ва уніяцтва? Аб'явяць такімі сябе касцёл і царква?.. Беларуская праваслаўная царква сёння поўнасцю залежыць ад маскоўскага патрыярхата. Я нават не бяру да ўвагі, што ўсе казанні ў яе сценах вядуцца на расейскай мове. Проста няма ніякай гутаркі пра яе аўтакефальнасць, а тым болей пра уніяцтва. А гэта самы сапраўдны раскол, чаго ні ў якім разе не дапусціць маскоўскі патрыярхат. Тым болей няма перадумоў для гэтага расколу. Ці пойдуць да уніі вернікі? Не. Гарадское насельніцтва ў большай частцы рускамоўнае, да беларускасці ставіцца калі не варожа, дык абыякава. Вясковае насельніцтва больш кансерватыўнае. Для яго больш зразумелым будзе казанне пропаведзі ў царкве па-беларуску, чым вяртанне да уніі.

Што датычыць каталіцтва, то тут назіраецца звычайная гульня ў палітыку. Калі і можна пачуць тут беларускае слова, то яно, пэўна, кажацца для таго, каб было больш зразумелым так званым "беларускім палякам". Спрэс польскія святары, і казаць пра нейкі клопат пра беларускасць проста дзіва. У тым яны ні ў якім разе не зацікаўлены. Аб гэтым сведчыць і з'яўленне польскіх штандараў на касцёлах, і шматлікія замежныя місіі, і мнагалюдныя вандроўкі нашых вернікаў у Польшчу за кошт іх касцёла (сустрэча з папам рымскім у Беластоку, фестываль каталіцкай моладзі ў Чэнстахове і іншыя дробныя мерапрыемствы).

Польскі клір таксама не зацікаўлены ў адраджэнні уніяцтва. І надалей тут, пэўна, можна будзе назіраць палітычную гульню ў беларускасць.

І яшчэ адна акалічнасць. У памкненні набыць сабе новых вернікаў праваслаўнае і каталіцкае духавенства ставіцца адзін да другога непрыязна. З гэтай прычыны не бачна падставы, на якой дзве канфесіі маглі б аб'яднацца зараз. Хутчэй за ўсё дзве канфесіі з'яўляюцца прычынай раз'яднання нацыі.

Што датычыць каталіцкіх вернікаў, дык яны добраахвотна не памкнуцца да уніяцтва. Усё тут абумоўлена сацыяльным складам вернікаў. Калі вясковае насельніцтва (маюцца на ўвазе католікі) у асноўным усе наведваюць касцёл, то ў гарадах і мястэчках пераважаюць служачыя дробных устаноў. А яшчэ, нягледзячы на тое, што наша грамадства павярнулася тварам да бога, усё ж нашыя людзі ў значнай ступені атэісты. Калі бываеш на богаслужэнні, то можна заўважыць, што большасць з прысутных — тыя, каму ўжо за пяцьдзесят. Усе астатнія звяртаюцца да храма выпадкова, падчас хрышчэння, вянчання ці пахавання. Яны абыякава ставяцца як да каталіцтва, так і да праваслаўя, і не стануць сябе звязваць нейкай "новай рэлігіяй". Тым болей варта заўжды памятаць, што ў касцёле пануе дух польскасці і вернікі каталіцкія лічаць сябе палякамі. Старэчы і вясковы кансерватызм, а таксама польскасць вернікаў стануць на шляху уніяцтва.

Сёння вернікам усіх канфесій даводзіцца той факт, што уніяцтва — нацыяналістычнае беларускае веравызнанне, паколькі там ідзе богаслужэнне на беларускай мове. На сённяшні дзень слова "нацыяналістычны" ўспрымаецца намі толькі ў адмоўным сэнсе. Але ж нават тым жа прыхільнікам уніяцтва варта памятаць, што беларускае слова ўжываецца і ў праваслаўнай царкве, якая знаходзіцца за мяжою. Іменна дзякуючы праваслаўнай царкве нашыя землякі за мяжою захавалі сваю мову і звычаі.

Адраджэнню уніяцтва замінае яшчэ і тое, што адсутнічае матэрыяльная база. Адсутнічаюць храмы, адсутнічае царкоўны інвентар. Можна з упэўненасцю сказаць, што ні праваслаўная царква, ні каталіцкі касцёл сваёй маёмасцю не паступяцца. Уніяты ў сувязі з малой колькасцю вернікаў сваіх грашовых сродкаў на пабудову храмаў не маюць і наўрад ці прыдбаюць дапамогу аднекуль збоку.

Варта быць рэалістамі і сказаць сабе праўду: на сённяшні дзень на шляху адраджэння уніяцтва больш перашкод, чым неабходнасці ў ім.

Сёння ніхто не адраджае Вялікае княства Літоўскае, хоць усе мы сцвярджаем, што ВКЛ — старажытная беларуская дзяржава: зараз мы будуем новую беларускую дзяржаву ў новых межах і ў новых гістарычных умовах. Мы сцвярджаем, што ў нас існавала старажытная беларуская мова, але не збіраемся ўводзіць яе ва ўжытак: яна — наша спадчына. (Праўда, сённяшні правапіс не можам як след унармаваць, але гэта іншая справа, якая не робіць гонару вялікім камісіям і яе тытулаваным сябрам).

Унія 1596 года — гэта частка нашай гісторыі, прынята яна была ў пэўных палітычных умовах і адпавядала рэаліям таго часу. Цяпер жа з адраджэннем уніяцтва на Беларусі можа з'явіцца яшчэ адна канфліктная сіла. Не варта заплюшчваць вочы не тое, што ўсе канфлікты, якія адбываліся і адбываюцца ў свеце, маюць рэлігійнае адценне. І тым самым, таго не жадаючы, мы можам закласці яшчэ адну міну пад слабенькі фундамент нашай незалежнай дзяржавы...

Самае слушнае і разумнае на сённяшні дзень было б тое, каб Беларуская праваслаўная царква стала сапраўды аўтакефальнай, а наша каталіцкае духавенства мела стасункі з Рымам, а не з духавенствам суседняй дзяржавы. Вось тады толькі ўзнікнуць перадумовы, каб дзве царквы загаварылі па-беларуску.

І самае галоўнае. Калі кіраўніцтва Беларусі будзе зацікаўлена ў адзінстве і цэласнасці дзяржавы, то яго палітыка будзе скіраванай у рэчышча беларускасці. І яно будзе тады зацікаўлена, каб у межах дзяржавы была адзіная рэлігія. Вось толькі тады могуць быць створаны ўмовы для новага аб'яднання дзвюх канфесій. На якіх прынцыпах можа адбыцца аб'яднанне — зараз сказаць немагчыма.

Язэп ПАЛУБЯТКА

г.Масты

Марцін КОЎЗКІ

ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Лямпачка Ільча — свеціць, пакуль вакол цемрадзь.

●

Пазванілі з Крамля. "Шмат пісьмаў ідзе ад беларусаў Іосіфу Вісарыёнавічу, і ўсё скаргі. Трэба наладзіць контрпрапаганду, выбіць козыры з рук ворагаў".

"Як гэта лепш зрабіць?" — спыталіся ў Мінску.

"Таварыш Сталін лічыць: дастаткова апублікаваць пісьмо на яго імя ў адказ паклёпнікам".

"Будзе зроблена, — адрапартавалі ў Мінску, — дазвольце толькі праявіць ініцыятыву, напісаць вершам".

Дазволілі. У маладосці правадыр таксама пісаў вершы.

Так беларусы сталі заснавальнікамі новага жанру ў савецкай літаратуры: пісьмаў народаў правадыру. Многія кіраўнікі атрымалі тады ўзнагароды. А партыя паклапацілася, каб ужо ўсіх шкоднікаў пазбавіць права на перапіску.

●

Заняпад езуітаў пачаўся, калі "Ганаровы езуіт" загучала злавесней за проста "езуіт".

●

Вандэйская хроніка. Нехта з аддаленай вёскі падаў заяву аб павелічэнні пенсіі, бо споўнілася пяцьдзесят гадоў, як ён у партыі. Няясна, ці будзе просьба задаволена, але старшыня выканкама (былы сакратар райкама) наклаў на пісьме рэзалюцыю: "прашу разгледзець".

●

Як па мне, дык хай на тэлебачанні перадаюць адны прагнозы надвор'я, людзі ўсё адно не вераць, але цешацца.

●

Жабракі паспрачаліся, дзе лепш жылося б — у багатай краіне ці ў беднай.

— У багатай, — сказаў адзін, — падавалі б часцей і больш.

— Яно-то так, — сказаў другі, — але крыўдна пачуваць сябе жабраком, калі вакол столькі багатых, у беднай жа краіне і жабрак чалавек, вунь колькі нас!

— Гэта праўда, мы свабодныя людзі, — сказаў трэці, і ўсе рушылі да падземнага пераходу на цэнтральнай плошчы, дзе ў іх было месца працы.

●

Прадстаўніца Забалачанскага раёна прыняла ўдзел у гульні на маскоўскім тэлебачанні "Поле цудаў". Забалачанцы выпаў шчаслівы нумар, яна ледзь не выйграла мільён, але скрыначка ў дзяўчыны аказалася пустой. "Складайце далей свае крыжасловы, — усцешылі няўдачніцу на тэлебачанні, — можа, Беларусі яшчэ пашанцуе". Цяпер усе надзеі забалачанцы ўскладаюць на "Поле цудаў".

●

Мова з часам мяняецца, гэта не дзіва, але як дэградуе парой сама ідэя: калі дзяды гаварылі "я шчаслівы", унукі кажуць цяпер "я балдзею".

У МЁРТВЫ СЕЗОН НА КУБЕ

ЭСЭ

Алесь ЖУК

ЗГАДАЎСЯ гэты чалавек, з якім жыццё звяло мяне выпадкова некалькі разоў, нечакана, калі слухаў паведамленне пра масавыя ўцёкі кубінцаў з радзімы за мяжу, пра тое, як іх вылоўліваюць у акіяне амерыканцы. Хударлявы, немаладога веку, у форме прапаршчыка, са спакойнымі вачыма і натруджанымі шафёрскімі рукамі, ён уразіў мяне найперш тым, што не адмовіўся і кульнуў ажно тры чаркі гарэлкі, разам з намі закусіў селядцом і беларускім салам з чорным хлебам... Адбывалася ўсё гэта дзесяць гадоў назад, на пачатку лістапада ў цэнтры Гаваны, адвячоркам, у гатэлі "Вэдадо". Прапаршчык быў пры выкананні службовых абавязкаў — за рулём чорнае "Волгі", якая прывезла да нас памочніка камандуючага войскамі супроцьпаветранай абароны на Кубе, вядома ж, нашага, савецкага... Капітан, на якога мы здзіўлена зірнулі, растлумачыў нам:

— Для яго гэта норма. Больш і кроплі не возьме. А машыну яго ўсе ў Гаване ведаюць...

І сапраўды, прапаршчык не піў болей. Пасядзеў з намі моўчкі. Слухаў, пра што мы гаворым, і глядзеў спакойнымі, зусім цвярозымі вачыма, быццам праз нейкае тоненькае, амаль непрыкметнае шкло, потым устаў і пайшоў на вуліцу да машыны.

На Кубу мы з сябрам трапілі неспадзявана. Чамусьці прапанову на паездку перадалі ў Саюз пісьменнікаў, адтуль нам, хаця паездка арганізоўвалася па лініі таварыства дружбы. Можа, прапанова тая дайшла да нас таму, што пуцёўка была платная, каштавала па тым часе немалыя грошы, а з Кубы — тады ўжо гэта бралася пад увагу — нічога не прывязеш, не прыбарахлішся, адным словам. Была яшчэ і такая акалічнасць, як высветлілася потым, што паездка рыхтавалася мэтавая, а таму ў групе павінны былі прысутнічаць прадстаўнікі розных слаёў насельніцтва. Вось і сабралі пісьменнікаў, мастака, інжынера, журналіста, рабочых у дадатак да дэлегацыі аднаго нашага слаўнага раёна, якая рабіла візіт ветлівасці да сваіх калег з калектыўнай гаспадаркі-пабраціма на Кубе. Заадно было вырашана зрабіць візіт ветлівасці ад імя нашай сталіцы горада-пабраціму Камагуэю. Цяпер ужо не памятаю, на якім узроўні было тое пабраціцтва, хутчэй за ўсё на абласным, хаця правінцыя Камагуэй і не сталічная.

Узначальваў дэлегацыю раённы кіраўнік. Акрамя самой дэлегацыі, узмоцненай прадстаўнікамі слаўнай інтэлігенцыі, у яго распараджэнні была і група хлопцаў і дзяўчат з мастацкай самадзейнасці, усе яны, акрамя інтэлігенцыі, вядома, ехалі бясплатна...

Але ўжо калі пачынаюцца выпадковасці, то адной ніяк абысціся нельга. Таму і сустрэўся сябру ў Доме літаратара госць з братняй Украіны, і не проста госць, але і перакладчык нашай літаратуры. За час сяброўскага абеду сябра даведаўся, што сын перакладчыка служыць на Кубе, у Гаване, і што самы найлепшы падарунак для тых, каго закінуў лёс у краіны далёкія, наш чорны хлеб і селядзец. Таму і везлі мы за акіян буханкі чорнага хлеба і вялікую бляшанку сапраўдных селядцоў, пісьмо ад бацькі сыну, на канверце якога быў запісаны тэлефон.

Гэты сын і прыехаў да нас на сустрэчу на службовай "Волзе", і яго шафёр практычна быў першым кубінцам, якога мы пабачылі зблізку, пабылі ў адной кампаніі. Першымі ж, вядома, былі кубінскія мытнікі, якія правяралі чамаданы. Праз некалькі дзён мы зразумелі, чаму гэтак прагна глядзелі яны і на бутэлькі з гарэлкай, і на пачкі цыгарэт. Для звычайнага кубінца гэта былі дарагія і маладаступныя рэчы. Але везці гарэлку і цыгарэты дазвалялася, затое вэнджаныя каўбасы і тыя ж селядцы на мытні канфіскоўваліся. Потым нам тлумачылі, што прадукты гэтыя адпраўлялі ў дзіцячыя дамы і бальніцы. Магчыма, гэта і праўда, але на колькі тых дамоў і бальніц хапала канфіскаваных прысмакаў? Ды і не ўсё канфіскоўвалася, бо бляшанку з селядцамі мы ўсё ж пранеслі.

Не буду апісваць звычайныя ўражанні паўночнага чалавека, які меней чым праз суткі апынуўся ў тропіках, дзе яркае сонца, дзе цепла на ўсе дваццаць пяць градусаў па Цэльсію. І ў дадатак сапраўдны акіян, які плешчацца аб набярэжную Малекон праз нейкія два кварталы ад гатэля. Для нас гэта быў працяг лета, свята сонца і вады, для кубінцаў — восень, мёртвы сезон, калі ўжо ні яны самі, ні замежныя турысты не купаюцца, калі на ўсёй інтурыстаўскай трасе камфортныя гатэлі і вілы пустыя. Турыстаў з капіталістычных краін амаль няма, калі не лічыць асобныя групы з даволі пажылых людзей, якія аддаюць перавагу падарожкам не ў летнюю спякоту. З улікам гэтага сервісу, які прастойвае, і быў вызначаны час нашае паездкі. Мы мелі ў сваім распараджэнні камфартабельны аўтобус з кандыцыянерам і барам, месца ў гатэлях і на вілах на ўсёй інтурыстаўскай трасе. Па ёй мы і праехалі амаль усю Кубу з поўначы на поўдзень, ад райскай курортнай правінцыі Пінар дэль Рыо, два дні купаліся ў акіяне і загаралі на пляжах знакамітага Варадэра.

Але ўсё гэта датычыць кубінскай прыгажосці і экзотыкі, пра якую ў нас у свой час шмат і надакучліва пісалася. Вярнуся да тых уражанняў, якія засталіся не на паперы, а ў душы. Дык вось, адно з першых — адчуванне нябачнай, нематэрыяльнай перагародкі, якая існавала паміж кубінцамі і намі. Яна, нібы нейкая нябачная субстанцыя, прысутнічала усюды, і ты якімсьці дзесятым чуццём адчуваў, што яна ёсць. Але пераканацца, што гэта так, а галоўнае зразумець, дзеля чаго і чаму існуе гэта субстанцыя, нельга было. Пра якое адчужэнне гаворка, калі над усёй Кубай лунаў, паўтаруся, на кожным кроку лозунг: "Русіка — сі, янкі — но!" І гаварылася гэта шчыра. Праўда, ад гэтай палымянай сяброўскасці не заставалася і шчэнту, калі справа даходзіла да грошай, — чалавек ці з кубінскімі песа, ці з савецкімі рублямі меў аднолькавую вагу, а справядлівей — ніякай.

Цяпер усміхаюся з таго нашага паблажлівага здзіўлення ад пустых паліц у магазінах, дзе, здавалася, ніколі не было ні прадуктаў, ні прамтавараў. Гэта датычыла гэтак званых тархетных магазінаў, ад слова "тархета" — картачка. Мы дзівіліся з гэтых картачак, паперын са шматлікімі квадрацікамі. На іх было распісана ўсё, што трэба рэвалюцыйнаму кубінцу на год— і колькасць шкарпэтак, і прасцін, і штаноў, і дзіцячых сукеначак. Але і гэтыя гарантаваныя па дзяржаўнай цане тавары былі не кожнаму даступныя — не хапала грошай. Таму зразумелая была радасць кубінкі, якая за аддадзеную тархетку на джынсы атрымала ад нашай дзяўчынкі шакаладку. І як зайздросцілі нашай дзяўчынцы яе сяброўкі, што панабіралі з сабой мыла, а не шакаладак, бо жадаючых абмяняць тархетку на шакаладку адразу ж з'явілася ў магазіне. Не ведаю, хто давёў нашым турысткам, што на Кубе не стае мыла, у крайнім выпадку на інтурыстаўскай трасе яго хапала. А вось цыгарэты і шакалад былі сапраўды залатым таварам.

Побач з тархетнымі магазінамі існавалі і не тархетныя, у якіх хапала і прадуктаў, і адзення, але па цэнах недаступных ні кубінцу, ні савецкаму турысту. Гэта нас найбольш здзіўляла і абурала. Цяпер, праз дзесяць гадоў, калі мы патрымалі ў руках свае картачкі, калі можам толькі палюбавацца на прысмакі і тавары ў магазінах, міжволі думаеш — хто ж каго перагнаў? Тады мы, савецкія на Кубе ў мёртвы сезон былі ўпэўнены, што перагналі мы, а Куба безнадзейна адстала.

Як адстала яна і ў дачыненні нагляднае агітацыі. Гэта было відавочна. У нас тады і на сценах будынкаў, і над будынкамі віселі партрэты членаў Палітбюро, каляровыя і шматквадратнаметровыя, а лозунгі і прывітанні партыі-рулявому мясціліся, пачынаючы ад забягалавак да прыдарожных адхонаў на чыгунцы. На звышрэвалюцыйнай Кубе гэтага не было, дакладней былі і лозунгі і партрэты Фідэля напару з Чэ Геварам, выкананыя сціпла, з густам і дарэчы размешчаныя. Але рэвалюцыйнасць давала адчуць пра сябе. У мастацкай школе, сцены якой былі ўвешаны мілымі дзіцячымі малюнкамі, над класнымі дошкамі альбо побач з імі красаваліся дзяржаўныя гербы. На цыгарнай фабрыцы, у цесным, з нізкаю столлю памяшканні, дзе за сталамі адзін пры адным рабочыя ўручную скручвалі знакамітыя кубінскія цыгары, дзе нельга было прадыхнуць ад дыму і табачнага пылу, на вентыляцыю грошай не выстачыла, затое ў канцы цэха на адзіным пустым стале стаяў напагатове мікрафон — у любы час можна пачынаць мітынг і гаварыць прамову.

Пра тое, што многае капіравалася з нашых завядзёнак, сведчыць і "План мероприятий для белорусской делегации в г. Камагуэе с 5 по 11 ноября 1984 г." У дні святкавання 67-й гадавіны Вялікага Кастрычніка намячаўся мітынг на рамонтным прадпрыемстве імя Леніна, прыём і экскурсія на прадпрыемстве імя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Назвы прадпрыемстваў і мерапрыемстваў гучаць звыкла. У нас бы кожнае мерапрыемства заняло цэлы вечар з доўгімі прамовамі і мастацкай часткай. На Кубе арганізацыя мерапрыемства была іншай. У час перапынку на абед у залу прыходзіла брыгада ці дзве рабочых, роўна столькі, колькі стаяла крэслаў. Прамовы гучалі кароткія, з традыцыйным заклікам у канцы: "Куба — сі, янкі — но!". У час гэтых прамоў цябе зноў быццам ахутвала нябачная субстанцыя адчужанасці, якая не давала зразумець, што на самай справе адчувае і думае радавы кубінец, які здзяйсняе рэвалюцыю ўсім жыццём. Наконт усталяванага ў нас у Саюзе вобраза кубінца-рэвалюцыянера ў савецкіх спецыялістаў на Кубе было сваё разуменне. З іроніяй яны расказвалі пра распарадак жыцця кубінцаў. Устае кубінец досвіта і спяшаецца рабіць рэвалюцыю ў чаканні святочнага абедзеннага часу. Пасля абеду пачынаецца падрыхтоўка да вечара, калі прыходзіць час займацца любоўю. З вечара і да раніцы ніякіх рэвалюцый не існуе. Якая б доля іроніі не была ў гэтым тлумачэнні, але святочна прыбраныя кубінкі пачыналі з'яўляцца на вуліцах адвячоркам, а вечарамі вуліцы закіпалі ад святла і мнагалюддзя, як у нас некалі ў святочныя дні...

Што датычыць турысцкіх гатэляў і вілаў, то рэвалюцыя не сягала туды ні партрэтамі, ні лозунгамі. Цішыня, чысціня, амаль нябачная абслуга, штодня замененая бялізна, шыльдачкі на дзвярах з просьбай не турбаваць, кафетэрыі зранку і начныя бары і танцавальныя залы ўвечары. Столікі ля басейна ў гатэльным двары, дзе можна піць кактэйлі, "Трапіколу" і купацца... Ад рэвалюцыйнасці хіба што рабочыя патрулі з даўгаствольмі рэвальверамі на баку, хутчэй за ўсё, каб пакрасавацца перад самімі сабой, нагадаць, што рэвалюцыя не скончылася і вораг не дрэмле. Але ўсё гэта толькі пры ўваходзе ў гатэль і не далей. Унутры свой даўно ўсталяваны парадак, песні пад гітару, якія суправаджаюць абед шаноўных гасцей у рэстаране, для паездак камфартабельныя іспанскія аўтобусы... Узнікала адчуванне, што гэтыя незапоўненыя гатэлі, і рэстараны, і басейны ў гатэльных дварах быццам нечага чакаюць, хутчэй за ўсё чалавечага тлуму і мнагалюддзя, як чакае і абслуга чаявых не цыгарэтамі, а сапраўдным калі не доларам, то хоць цэнтам.

Для кожнага сваё чаканне. Жонка нашага знаёмага капітана чакала хутчэйшага ад'езду з Кубы. Хударлявенькая, невысокага росту, цярплівая і мілая, яна рада была нашаму прыезду ў госці. Прывёз нас той самы ўсёразумеючы маўклівы прапаршчык, да якога, як да роднага, кінуўся чатырохгадовы Тарасік. Малога назвалі ў гонар Шаўчэнкі, і маці ганарылася, што малы ўжо пачаў гаварыць па-ўкраінску. У закрытым ваенным гарадку ўсе гаварылі па-руску. Ужо крыху пазней, калі асвоіліся, разгаварыліся, жанчына паказвала нам тое месца, дзе яшчэ нядаўна стаяў у яе пры ложку "калашнікаў" з прымкнутым магазінам на ноч. Гасцілі мы на Кубе пасля таго, як кубінскія пагранічнікі абстралялі амерыканцаў, якія блакіравалі савецкі транспарт, што вёз на Кубу "МІГ". Зачаліць савецкае судна амерыканцы наўрад ці адважыліся б і без кубінскага ўмяшання, з-за якога пачаў загарацца маленькі другі "кубінскі крызіс". А побач палала Нікарагуа не без удзелу Савецкага Саюза, які дзейнічаў цераз Кубу...

Дык вось, у гэтыя трывожныя дні, калі мужчыны былі пераведзены на казарменнае становішча, іх жонкі з дзецьмі заставаліся ў ваенным гарадку. І на ноч, паклаўшы дзіця з аднаго боку, з другога ставілі пры ложку, каб быў пад рукою, аўтамат. Хаця смешна думаць, што аўтаматы гэтыя маглі ім у чымнебудзь дапамагчы...

Так жылі савецкія ў сталіцы Кубы. Ды, мабыць, не ўсё гаварылі нам нашы гасцінныя гаспадары, бо адвезці нас дадому ў гатэль прыехаў той самы прапаршчык. Мы заседзіліся, загаварыліся, думалі, што выклічам таксі. Капітан растлумачыў нам, што ў начны час таксі не прыедзе сюды, бо тут, навучаныя горкім вопытам, спачатку страляюць, а потым крычаць: "Стой, хто ідзе?". Якім вопытам навучаныя і чаму страляюць, мы не адважыліся ўдакладняць, бо разумелі, што капітан і так сказаў нам тое, пра што гаварыць не дазволена.

У тыя дні ў савецкіх спецыялістаў на Кубе было одно жаданне — як найхутчэй вярнуцца дадому. А вось у Наташы, мілай беларускі з Чэрвеня, такой магчымасці не было. Яна мела кубінскае прозвішча і народжаную там дачушку. Яе муж, які скончыў інстытут у Мінску, працаваў пад бацькавым кіраўніцтвам інжынерам на прэстыжным рыбакамбінаце, які, акрамя ўсяго іншага, пастаўляў на сусветны рынак свежаахалоджанае ільдом мяса лангустаў. Наташа любіла мужа, падружылася са свекрывёй, асвойвала мову, жыла ў дастатку — а вось грамадзянства не змяніла, страхуючы невядома ад чаго сябе і сваю дачушку.

Гэтакіх, як мы, савецкіх турыстаў на Кубе сустрэлі толькі адзін раз — на знакамітым курорце Варадэра. Я і сёння не магу ўявіць тыя бясконцыя пясчаныя пляжы запоўненымі людзьмі, бо калі мы прыехалі туды, дык, акрамя нашай групкі, такой маленькай на пляжных абшарах, нікога не было. Пяшчотная зялёная акіянская вада заліва, пясок, сонца і цішыня. Цішыня і вымерласць і ў самім курортным пасёлку гатэляў, вілаў, бараў і іншых прыемных устаноў. Картасхема гэтага курортнага пасёлка друкуецца асобна на ўсіх кубінскіх картах. Гэта сапраўды горад святла, свята, карнавалу. Але на той час, калі мы прыехалі туды, свята скончылася, паспелі прыбраць смецце, усё вымесці, вымыць, вычысціць. На другі дзень да нас далучылася група ленінградцаў, не памятаю, з якога завода, і таму вечарам у бары на віле "Карыба" было і шумна і душна. Піцерцы мацюкалі тых, хто ўтравіў іх у гэтую экзатычную паездку, бо ўжо тады была мода на прывезеныя з-за мяжы "анучкі". Натуральна, што "анучкамі" піцерцы запасціся не маглі і перад ад'ездам прасаджвалі грошы ў бары. Пры гэтым прысутнічалі і два кубінскія ахоўнікі граніцы з "калашнікавымі" на плячы руляй долу. Адзін з іх тоўсты, у расшпіленай ледзь не да пупа армейскай кашулі, упацелы ад выпітага, чапляўся час ад часу позіркам за маю бародку і ў знак прыязнасці пасля чарговага заказанага яму кактэйля паўтараў "Леніно—Куба". Барадатых людзей на Кубе рэдка калі сустрэнеш, хаця па нашых уяўленнях, кубінцы усе барадатыя. Выключэнне сам Фідэль і яго бліжэйшыя саратнікі. У знак асаблівай павагі да"савецкага" пагранічнікі дазволілі нам купацца ў начны час, мабыць, цяроза разважыўшы, што да Савецкага Саюза адсюль ніхто ўплаў дабірацца не адважыцца. Цяпер думаю, што такі дазвол яны б выдалі не толькі "савецка", а і іншым, хто пачаставаў бы іх у бары. Вось толькі наўрад ці пасмелі б паказацца там улетку і наўрад ці пачаставалі б іх валютныя турысты.

Крышку іншая Куба, не гарадская, не курортная, а сялянская прыадкрылася нам не на знакамітай ферме Рауля Кастра, а ў правінцыі Камагуэй, у сельскагаспадарчым кааператыве — пабраціме калгаса імя Леніна на Случчыне. Кубінцы ўжо пагасцілі на Случчыне, а таму вырашылі сустрэць гасцей не горш. Вазілі нас па гаспадарцы ў самаробных адкрытых вагончыках на гумавых колах, страката размаляваных, і цягаў вагончыкі таксама стракаты трактарок. А потым частавалі па-кубінскіх мерках шчодра, нават бананы былі на стале і ром. Пасля гэтага наладзілі ўрачыстае гуляння.

У час гэтага гуляння мы з сябрам адышліся да трох кубінскіх хлапчукоў, якія дзяжурылі на конях. На мігах мы хутка паразумеліся — за цыгарэты хлапчукі давалі праехаць на кані.

(Працяг на стар.12)

ТВЛ, ТРАНСЛАГІЗМ, ПАЛІДРОМ...

19—20 лістапада ў Наваполацку пад эгідай Таварыства вольных літаратараў і Беларускага Фонду Сораса адбылася канферэнцыя "Альтэрнатыўная літаратура: паасобныя намаганні да агульнай мэты. Новыя імёны новай Усходняй Еўропы". Дзякуючы фундацыі БФС, канферэнцыя была арганізавана на належным — міжнародным — узроўні: у ёй удзельнічалі літаратары і крытыкі з Гародні, Менска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Смаленска, Харкава і іншых гарадоў краін СНД (на жаль, не здолелі прыехаць дэлегацыі з Польшчы і Чэхіі). У праграме "Альтэрнатыўнай літаратуры" былі навуковыя даклады і паведамленні, літаратурная вечарына, экскурсія па Полацку. Адбыўся цікавы абмен думкамі паміж прадстаўнікамі літаратурных суполак, замацаваліся пэўныя кантакты. У прыватнасці, жвавыя дыскусіі выклікалі паведамленні, прысвечаныя новаму літаратурнаму накірунку — транслагізму (С. Мінскевіч, А. Туровіч, літаратурнае аб'яднанне пры рэспубліканскім тэатры "Вольная сцэна "Табала "S-ТЭТ"). Наступнай мяркуецца правесці канферэнцыю, прысвечаную лакальнай літаратурнай з'яве — палідрому, з удзелам прадстаўнікоў транслагізму (Мінск), трансрэалістаў (каардынатар — А. Голубеў, Смаленск), даследчыкаў па паліндрамістыцы (Г. Лукоўнікаў, Масква), сяброў суполкі "Лагасат" (Харкаў). Падрыхтоўка канферэнцыі ўжо пачалася.

Н. К.

ПАКУЛЬ НЕ ЗАВЯЛІ КВЕТКІ

Празаік Алесь Масарэнка па-ранейшаму плённа працуе ў галіне апавядання, аповесці, рамана, але і ўсё ўпэўненней пазірае на паэзію. Прынамсі, з вершамі выступае ён у рэспубліканскай перыёдыцы. Вершы прачытаў і ў час прэм'еры сваёй чарговай кнігі "Пакуль не завялі кветкі". Аддаў перавагу паэзіі, нягледзячы на тое, што згаданая кніга... празаічная.

Калегі, сябры па пяры, сказалі Алесю Герасімавічу столькі ўхвальных слоў адносна мастакоўскіх вартасцяў яго празаічных твораў (вядучы вечарыны сакратар рады Саюза пісьменнікаў А. Пісьмянкоў, М. Тычына, рэдактар згаданай кнігі А. Рыбак, А. Слесарэнка, Л. Левановіч, І. Шаўлякова, якая выступіла ад рэдакцыі часопіса "Першацвет"), што нельга было не паверыць ім. Таму і засталося А. Масарэнку даказаць, што ён з паэзіяй таксама можа паразумецца, размаўляць нароўных.

А яшчэ ў час вечарыны гучалі песні. І народныя, у выкананні Н. Захаранкі і У. Берберава. І сучасныя. Алеся Герасімавіча вельмі парадавала дачка, маладая пісьменніца Ю. Алесьніна, якая разам з навучэнкай Беларускага гуманітарна-адукацыйнага цэнтра Т. Сідарэнкай выканала свае песні. На ўласныя вершы і музыку напісала.

КАЛІ МУЖЧЫНА ПРОСІЦЬ...

Свет, як кажуць, не без... дзіўных людзей. Ёсць пісьменнікі, якія, як той чорт кадзіла, баяцца пародый. Зусім іншага складу характару Вячаслаў Стома. Спаткаўся неяк з паэтам-парадыстам Анатолем Зэкавым. Так і так, маўляў, у вялікай крыўдзе я на цябе, браце. На іншых пародыі пішаш, а мяне абыходзіш. Зэкаў паспрабаваў апраўдвацца: "Я ж практыкуюся ў жанры паэтычнай пародыі". "А хіба не ведаеш? — здзівіўся В. Стома. — Я ж не толькі прозу пішу, а і вершы". Паразумеліся на тым, што А. Зэкаў паабяцаў напісаць на яго пародыю.

І слова сваё стрымаў. Як жа інакш, калі мужчына просіць... Пародыю гэту А. Зэкаў прачытаў на творчым вечары В. Стомы, што нядаўна адбыўся ў Доме літаратара. І патрэбна сказаць, яна стала вельмі да месца. Як і іншыя выступленні. Пра творчасць В. Стомы (а ён найперш вядомы як празаік) гаварылі сакратар рады Саюза пісьменнікаў У. Паўлаў (вядучы вечара), народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін, М. Матукоўскі, С. Законнікаў, А. Вольскі. Сваю лепту ў вечарыну ўнеслі канцэртмайстар Л. Матукоўская, бард А. Атаманаў і іншыя.

ЧУЖОМУ НАВУЧАЙСЯ, СВАЙГО НЕ ЦУРАЙСЯ

Гэтая народная прымаўка хораша перадае наш сённяшні стан у духоўных, культурных памкненнях. Тут, сапраўды, нельга замыкацца ва ўласнай шкарлупіне. Пра гэта, дарэчы, памяталі нашы лепшыя адраджэнцы яшчэ ў пачатку стагоддзя. Прынамсі, згаданыя словы вынес у загаловак аднаго са сваіх артыкулаў, апублікаваных у газеце "Наша Ніва" (1913, N 42), Лявон Гмырак. Імі ж, пачынаецца і коласаўскае "Другое чытанне для дзетак-беларусаў".

Пра неабходнасць "і чужому навучацца, і свайго не цурацца" напамінае ў прадмове да другой кнігі "Нарысаў па гісторыі беларуска-рускіх літаратурных сувязей", выпушчанай выдавецтвам "Навука і тэхніка", Тамара Чабан. Так ужо склаліся абставіны, што беларуская літаратура ў пачатку XX стагоддзя вымушана была развіваць паскорана, дзеля таго, каб, як і сам народ, заняць годнае месца сярод іншых. А дзе паскарэнне, там не абысціся без вопыту іншых. А бліжэй іншых была менавіта руская літаратура. Да ўсяго нельга забываць, што многія нашы, нават вядомыя пасля, аўтары пачыналі пісаць па-руску. У той жа час літаратары, якія пісалі па-руску і нават па-руску друкаваліся, каб быць лепш зразумелымі тутэйшаму люду, — пераходзілі на беларускую мову. Нарэшце, нельга ігнараваць асабістыя ўзаемаадносіны і кантакты паміж рускімі і беларускімі аўтарамі.

І што асабліва важна, як сведчыць Т. Чабан, "узаемасувязі з рускай літаратурай адбываліся па-за межамі афіцыйнай дзяржаўнай палітыкі русіфікацыі і насуперак ёй. Праводзячы гэту палітыку, самадзяржаўе і чыноўніцтва зусім не былі зацікаўлены ў прапагандзе сярод беларускага насельніцтва лепшых, перадавых твораў рускай літаратуры".

Значыць, сувязі былі падказаны жыццём. І самой літаратурай, якой станавілася ўсё больш цесна толькі ў нацыянальных рамках. Як мацаваліся гэтыя сувязі, яскрава відаць з аглядных артыкулаў, прысвечаных асноўным галінам творчасці — паэзіі, прозе, драматургіі, крытыцы, дзіцячай літаратуры, напісаных той жа Т. Чабан, С. Лаўшуком, М. Мушынскім, Э. Гурэвіч, а таксама В. Бароўкам. Для асэнсавання згаданай праблемы імі прыцягнуты вельмі шырокі матэрыял, што дазваляе атрымаць цэласную і поўную карціну беларускай і рускай літаратур.

У кнізе вылучаны тры артыкулы-партрэты, у цэнтры якіх класікі нацыянальнай літаратуры. Ц. Ліякумовіч прасочвае, як "перадавая руская літаратура... дапамагала Я. Купалу пазбегнуць правінцыйнай абмежаванасці, убачыць неабходнасць удзелу беларусаў у агульнай барацьбе супраць царызму і розных форм прыгнечання, убачыць у адзінстве працоўных залог будучай перамогі". М. Тычына падрабязна аналізуе стасункі з рускай літаратурай Я. Коласа. А В. Каваленка пераканаы: "М. Багдановіч стварыў свой глыбока індывідуальны творчы стыль, у якім арганічна аб'ядналіся дакладнасць, прастата і яснасць рускага класічнага верша з дасягненнямі паэзіі пачатку XX стагоддзя — музыкальнасцю, імпрэсіяністычнасцю, унутраным напружаннем лірычнага кантэксту".

"Нарысы..." будуць складацца з чатырох тамоў. Наперадзе — два наступныя. Думаецца, выданне гэтае будзе карысным найперш настаўнікам, студэнтам-філолагам.

З. В.

СВЯТОЕ СЛОВА — ПАМЯЦЬ

Гісторыя, як мы ведаем, гэта ці не пастаяннае змаганне за ўладу, высвятленне ўзаемаадносін паміж рознымі палітычнымі сіламі. Так было і ў глыбокую даўніну. У прыватнасці, калі ў 1139 годзе на вялікакняжацкі трон сеў Усевалад II Ольгавіч, не спыняліся спрэчкі з пакрыўджанымі князямі, а сярод іх аказаліся і родныя браты Усевалада Ігар і Святаслаў. Засталося сведчанне аб тагачасных падзеях у Іпацьеўскім летапісе. Як сведчыць гэты дакумент, у 1142 годзе Усевалад звярнуўся да братоў і прапанаваў ім узяць сабе Гарадзец, Рагачоў, Брэст, Драгічын, Клецк.

1142 — год першага ўпамінання ў летапісе горада Рагачова. З таго часу, як вядома, шмат вялікіх і малых падзей адбылося і ў самім Рагачове, і вакол яго. Шматвекавую гісторыю гэтага кутка краю адлюстроўвае гісторыка-дакументальная хроніка Рагачоўскага раёна "Памяць", выпушчаная выдавецтвам "Беларуская энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі.

Як і ў папярэдніх выпусках, тут выкарыстаны шматлікія дакументы з дзяржаўных і асабістых архіваў, розныя публікацыі ў газетах і кнігах, успаміны ўдзельнікаў і сведкаў падзей.

У прыватнасці, прыводзіцца вытрымка з таго ж Іпацьеўскага летапісу, змешчана Даравальная грамата князя Вітаўта віленскім канонікам на бярэзінскую зямлю паміж Стрэшынам і Рагачовам, датаваная 3 красавіка 1399 года. Тут жа — пісьмо каралевы Боны Рагачоўскаму аканому пра скаргу сялян с. Лучын на павелічэнне паборaў і павіннасцей (1548 г.), падборка "Рагачоў у Баркулабаўскай хроніцы", "Звесткі пра вёску Азяраны з "Могилёвских губернских ведомостей"... Артыкул вядомага мастацтвазнаўцы М. Шчакаціхіна "Замак у Рагачэве" перадрукаваны з часопіса "Наш край" (1926, NN 10—11)...

Аб'ектыўна адлюстраваны такзваны савецкі перыяд у гісторыі Рагачоўшчыны. Гэта бачна хоць бы па тым, што не абыдзены ўвагай ахвяры сталінізму. Праўда, паколькі рукапіс быў падрыхтаваны раней, не ўсе звесткі ўдалося ўнесці. Расказваецца пра лёс наркома асветы БССР У. Піваварава, які нарадзіўся ў вёсцы Сямінаўка Рагачоўскага раёна.

Уражвае спіс "Вернутыя імёны". Сярод ахвяр сталінізму вельмі шмат жыхароў вёскі Сенажаткі і бліжэйшых да яе хутароў.

А гэта — трагедыя нядаўняя. Пяць біяграфічных звестак, пяць партрэтаў юнакоў, якія не вярнуліся з Афганістана. І тысячы прозвішчаў тых, хто загінуў у савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гадоў, у Вялікую Айчынную, хто быў закатаваны. Такая яна, наша памяць — балючая і гэткая патрэбная!

Багата ў томе матэрыялаў, што тычацца літаратуры, мастацтва. Прынамсі, падрабязна расказваецца пра М. Сурначова, А. Макаёнка, Ф. Куляшова і іншых, хто нарадзіўся ў тутэйшых мясцінах. А поруч — матэрыялы пра тых, у чыёй біяграфіі прапісалася Рагачоўшчына. У нарысе У. Бандарэнкі "Другая радзіма пісьменніка" расказваецца пра М. Лынькова, які тут правёў дзіцячыя і юнацкія гады. "Асаблівае месца ў жыццёвым і творчым лёсе У. Караткевіча належыць Рагачоўшчыне", — гаворыць у нарысе "Пясняр Прыдняпроўя" А. Верабей. Маці пісьменніка некаторы час працавала настаўніцай у вёсцы Збароў, у Рагачове жыў яго дзед Васіль Юльянавіч Грынкевіч, які стаў прататыпам старога Данілы Загорскага-Вежы ў рамане "Каласы пад сярпом тваім". І далей аўтар піша: "Заўсёды гасцінным і ўтульным для У. Караткевіча і яго сяброў былі ў Рагачове дом на вуліцы Чкалава, дзе жыў яго дзядзька Ігар Васільевіч Грынкевіч..." А. Верабей падрабязна расказвае, наколькі праўдзіва адлюстраваны рагачоўскія назіранні ў многіх творах У. Караткевіча.

К. Кабашнікаў у артыкуле "З глыбінь народнай творчасці" разглядае фальклор Рагачоўшчыны.

Усе матэрыялы — не пералічыць. Тыя, што спрычыніліся да падрыхтоўкі гісторыка-дакументальнай хронікі (старшыня раённай камісіі В. Краўчанка), імкнуліся як мага шырэй падаць жыццё краю на працягу стагоддзяў.

З. В.

ХТО НЕ СМЯЕЦЦА, ТОЙ...

"Як вы думаеце, што агульнага ў словах гісторыя і гумар?" — такое пытанне задае, прадстаўляючы кніжку Уладзіміра Ермалаева "Хто не смяецца, той не есць", што выйшла ў "Бібліятэцы "Вожыка", Янусь Малец. Аказваецца, "агульнае тое, што і гісторыя і гумар з'яўляюцца ці не асноўнымі ў жыцці вельмі інтэлігентнага і прыемнага ва ўсіх адносінах чалавека, кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры гісторыі, сусветнай і айчыннай культуры Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі — Уладзіміра Фаміча Ермалаева. Таго самага Уладзіміра Ермалаева, вершы, мініяцюры і пародыі якога ў апошнія гады вельмі ахвотна змяшчае на сваіх старонках "Вожык".

Сапраўды, гумар — боскі дар аўтара. Каб пераканацца ў гэтым, варта прачытаць творы хоць бы з першага раздзела "Пераходны перыяд", ці, скажам, радкі з "дыялога за "круглым сталом", названага "На што спадзявацца". У апошнім спрэчка бабы з дзедам аб тым, што такое постсацыялізм, гучыць актуальна і дасціпна.

А вось чатырохрадкоўе "Такі час". Зноў не адмовіш аўтару ў досціпе:

Бацька-рысь падлетка-рыся
Павучаў: — Жаваць вучыся!
Хто каго перажуе,
Той таго перажыве.

І наступныя раздзелы — "Дарагой цаною", "Мора па калена", "А яшчэ быў выпадак" — таксама пацвярджаюць, што сур'ёзнае і смешнае ў жыцці ўзаемазвязаны. Асабліва, калі за пяро бярэцца чалавек, які валодае пачуццём гумару. А пачуццё гэтае, як бачым, у аўтара ёсць, таму так пільна пасвойму прыглядаецца ён да рэчаіснасці, вышукваючы тое, што проста просіцца на... пяро.

"Тэорыя адноснасці", "Татальны дэфіцыт", "Падатлівая жонка", "Ні ў полі, ні ў хаце" — гэтыя і іншыя творы свайго роду малюнкі з натуры. І кожны з іх выклікае ўсмешку.

"Хто не смяецца, той не есць!" — пераканаы У. Ермалаеў. Бадай што і праўда. Прынамсі, кніжка ягоная алетыту дадае безумоўна.

А. М.

СПАДЧЫНА Ў "СПАДЧЫНЕ"

"Дыярыуш князя Міхала Казіміра Радзівіла" — унікальнейшы помнік нашай літаратуры і нацыянальнай гісторыі. Пачынаючы з чацвёртага нумара, часопіс знаёміць з ім чытача ў перакладзе В. Арэшкі (дарэчы, з багатымі ілюстрацыямі). І яшчэ адно вяртанне да падзей, што маюць дачыненне да знакамітага роду Радзівілаў — змешчаны нарыс Э. Рудскага "Барбара Радзівілянка — другая жонка Жыгімонта Аўгуста".

І ўвогуле пяты нумар закранае самыя розныя па часе пласты нацыянальнай мінуўшчыны. Мяркуйце самі: "Рэлігійны элемент у беларускай народнай творчасці" Л. Гарошкі, "Пачаткі беларускага крыніцазнаўства" Д. Карава, "Беларуска-літоўскія дачыненні: 1918—1922 гг." А. Грыцкевіча, "Вэндэнская унія" В. Чаропкі, "Анёл Доўгірд — філосаф з Вільні" Р. Тамушанскага (пераклад з англійскай Г. Тарасавай), "Князі на абшарах Вялікага княства Літоўскага" Ю. Вольфа.

Леў Сапега, Іван Балотнікаў, Марына Мнішак, Ілжэдзмітрый Другі і іншыя постаці, вядомыя яшчэ па школьным падручніку гісторыі, "сустракаюцца" ў драме І. Чыгрынава "Хадзілі мы паходамі".

На каляровай уклейцы — працяг знаёмства з гербамі беларускай шляхты, адлюстраванне мундзіраў ваяводскай і павятовай шляхты.

ТАК ТРЫМТЛІВЕЙ

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЯЗЭПА СЕМЯЖОНА

Самы кавалерысты, самы шляхетны ў нашым у бальшыне сваёй сяляніста саматужным Саюзе пісьменнікаў быў, вядома ж, ён. І самы артыстычны.

Яшчэ школьнікам чытаў я паэзію Бёрнса ў ягоных надта ж беларускіх, надта ж сакавітых і самавітых перакладах. А калі здаваў на першым курсе універсітэта "тысячы" па англійскай мове, узяў дый рызыкнуў перакласці колькі вершаў Бёрнса. Надрукаваў іх у універсітэцкай шматтыражцы. І раптам перадаюць, што мяне шукае Язэп Семяжон. Зразумела ж, быў узрадаваны і ўстрывожаны. А гэта ладзіўся вечар Бёрнса, і Язэп Семяжон запрасіў студэнта прыняць удзел, пачытаць свае пераклады вялікага шатландца.

І сёння помняцца мне першыя замаразкі. Ідзём з Язэпам Ігнатавічам праветраным, пуставатым праспектам. Мяне палоніць дужа прыгожая беларуская мова знанага перакладчыка. Ён вядзе мяне да сябе дамоў у цесную кватэру ў раёне Круглай плошчы. Нешта елі, нават ці не чарку бралі. Але святам для мяне было знаёмства з маці Семяжона. Я зразумеў, адкуль у яго такая крынічная беларуская мова. Адкуль панавітасць аблічча й натуры. Маці праспявала яшчэ некалькі народных песняў. І потым праз гады, калі спяваў Семяжон, чуў я, што спеў ягоны — водгалас матчын. Асабліва задушэўна, будзячы векавы сум душы беларускае, зацягваў закаханец ва ўсё роднае песню, што пачыналася: "Ой, закурэла сырымі дрывамі". Тлумачыў неаднойчы, што песня з часоў паўстання ледзьве не Вашчылы.

Дома ў нас пра стараннага, працавітага, цягавітага чалавека казалі дакладна: цягун. Дык вось Язэп Семяжон быў цегуном. І выкладаў, і перакладаў. Шмат. Як цяпер перад вачыма почырк пісьменніка — акуратны, кожная літара выпісана, уборысты і разам з тым нетаропкі, грунтоўны. Пальцы абдымалі ручку далікатна й натхнёна, годна й з ласкавым прымусам. Так каханак абвівае, як той хмель зеляненькі, стан абранніцы, піток, якому не пагражае апраметная алкагалізму, крамяную постаць добрай чаркі. Працаваць даводзілася багата, бо позна стаў бацькам дваіх дзяцей. А пасад у апараце Саюза пісьменнікаў не меў дый не імкнуўся мець іх. Усё сваім мазалём, калі можна так сказаць пра перакладніцкую працу.

Пра пераклады Язэпа Семяжона можна казаць, як пра адметную, семяжонаўскую школу. Ён быў паэтам, але рэалізаваўся як паэт праз пераклад. Пісаў як бы на зададзеную тэму. Не трымаўся ні літары арыгінала, ні нават колькасці радкоў пры перакладзе шмат якіх твораў. Ну, гэта, да прыкладу, праявілася ў перабольшванні паэтычнай плошчы "Пана Тадэвуша". Як паэт ён усяму хацеў надаць беларускі каларыт, усё збеларусіць. Яму нішто не замінала з верша аўстралійскага паэта невялікага памерам і зусім на іншую тэму зрабіць ледзь не мініпаэму, як перасяленцы з Беларусі стрыгуць авечак, а пасля гуляюць па ўсіх канонах беларускага застолля. І гучала ўсё каларытна, пераканальна, дасканала.

Прынёс Язэп Семяжон у выдавецтва яшчэ матузаўскіх часін невялічкую як бы анталогію сучаснай в'етнамскай паэзіі, зразумела, рэвалюцыйнай. Кажа, карыстаўся французскімі перакладамі. Я, малады рэдактар і па завядзёнцы тае пары пад добрым градусам, хацеў, прачытаўшы па дыяганалі, падпісваць рукапіс. Але нешта спыніла мяне. Назаўтра на свежую галаву пачынаю чытаць. У в'етнамцаў чамусьці "балацявінкі сціснула лядком", "в'етнамская пушча". Усё гэта здорава па-беларуску, але ўжо вельмі далёка ад рэалій гэтай рэвалюцыйнай краіны. І чамусьці рыфма яўна ж не беларуская: "берасклет — на нет". Усумніўся я й давялося перакладчыку тое-сёе правіць. Дарэчы, заўсёды відаць, з чаго перакладаў перакладчык — з арыгінала ці з расійскага перакладу. Помніцца, як у свой час рэдагаваў пераклады класічнай балгарскай паэзіі й у аднаго тады маладога перакладчыка ўсё значна лягчэй чыталася назад, па-расійску. Часцяком чысты расійскі пераклад як той нячысцік блытае.

Язэп Семяжон быў не проста перакладчыкам, ён быў нібыта сааўтарам паэта, якога з беларускімі ласкавымі прымусамі запрашаў гаварыць па-беларуску, вучыў гаварыць па-беларуску. Традыцыі перакладу расійскага, беларускага, еўрапейскага ўвогуле акрэслілі такія формы, як наследаванне, перайманне, паводле чаго, з чаго. Мне асабліва падабалася ў аднаго паэта-выгнанца — перайманне названа пазыкай. Але апошнім часам з нейчай не сказаў бы лёгкай рукі пачаў гуляць ледзь не на навуковым узроўні тэрмін пераўтварэнне. Адразу кідаецца і ў вока і ў вуха няўклюднасць і штучнасць. А штучнасць хоць і блізкага гучаннем да штукарства, але сэнсам сваім хадульная. Не скажаш жа, да прыкладу, штукарскае асемяненне, яно ўсё-такі штучнае. Яшчэ не хутка генная інжынерыя дасць Байрана й Купалу, Леніна ці Сталіна, відаць, можа даць. Пераўтварэнне гучыць, як перастраўліванне ежы, як нястраўнасць. Не паэтычна. Даходзіць ледзь не да анекдотаў. У шаноўным "ЛіМе" нататка пра Марыю Камісараву блытаецца па-школьніцку: Марыя Камісарава перакладала беларускіх паэтаў (ідзе пералік), а вершы Марыі Камісаравай пераўтваралі (таксама ідзе пералік). Гэта ўжо на ўзроўні суверэннасці дзяржавы ці што. Зноў жа пра гэтае пераўтварэнне. І нескладовае у яшчэ болей робіць грубаткім слова. А згадайце хоць бы калыханку: "Пайшоў кот у дулі, памарозіў лапкі, скочыў на палаткі". Не ўскочыў, а скочыў, бо у ў дадзеным выпадку парушала б і лёгкасць вымаўлення, і самую меладычнасць.

Здаецца, яшчэ ў бытнасць Язэпа Семяжона ўзнікла гэтае халодна-робатнае паняцце. Але Семяжон паўсюль пісаў пераклад. А яму як нікому ставілі ў віну неадэкватнасць арыгіналу, празмерную вольнасць. Асабліва за пераклад лацінамоўнай паэмы класіка беларускай літаратуры Міколы Гусоўскага.

Позняй восенню 1992 года надарылася мне пабыць у Белавежы. Рабілі мы дакументальна-публіцыстычны фільм пра славутую нашую пушчу, якая сімвалізуе беларускую зямлю — палавінілі яе, драталі яе, вынішчалі яе насельніцтва мацнейшыя й зайздрослівыя суседзі. Каралеўскія, царскія, савецкаімперскія паляванні. Здавалі й здаюць у арэнду ці на адстрэл усім, хто мае ўладу, хто мае валюту. Здымаем кадры ціхае прыроды, а не моўкнуць аўтаматныя чэргі, як на палігоне. Чарговы часовы гаспадар, лясны князёк узбіўся на пасаду, бо ўмеў добра варыць юшку цэкоўскаму начальству і не толькі з Менска. Тут з сівых часін вырашаўся лёс цэлых дзяржаў, тут падпісаўся прысуд і чырвонай імперыі. Тут трагічнае і камічнае ўпоплечкі. У свой час афіцыянт былога рэстарана "Беларусь", вядомы разведчык у апошнюю вайну, сібірак, апякун нашых паэтаў-пітакоў распавядаў, як цяжка давялося яму прыслужваць Хрушчову і Мазураву. На вячэру стаяла чатыры пляшкі "Белавежскай горкай". Дзве з гарэлкай, дзве з гарбатай пад колер акавітай. І высокае жанглёрскае майстэрства трэба было мець, каб не пераблытаць, а наліваць спакойна і пашанліва Хрушчову гарэлку як гарэлку, а Мазураву гарбату як гарэлку. Казаў былы разведчык, што здабываць "языка" было меней рызыкоўна. Ну паколькі пайшло такое адхіленне, варта прыгадаць, калі верыць успамінам целаахоўніка Машэрава, якія былі надрукаваны ў "Вечернем Минске", Пётр Міронавіч быў узяў з сабой на паляванне і аўтара "Грознай пушчы". Праўда, паэт доўга не вытрымаў і яму ў машыну загрузілі кабанчыка. (Васілю Быкаву дык толькі свінню падкладвалі). Не буду супастаўляць "Песню пра зубра" з "Грознай пушчай". Розны час, розныя задачы.

Мікола Гусоўскі глядзеў на пушчу, на радзіму сваю не толькі з далечыні вечнага горада, але і з вышыні, з вышыні касмічнай свайго таленту, таму так абсяжна і так дэталёва канкрэтна паўстае перад вачыма чытача пушча, наш край, наш народ. Язэп Семяжон вачыма сучасніка ўбачыў вынішчэнне зуброў, як вынішчэнне беларускага генафонду. І як жа добра было чытаць-перачытваць велічную паэму ў самой пушчы. Як жа па-беларуску гучала яна. Дробязнымі здаліся ўсе папрокі перакладчыку пра адвольнасць. Як зубру камарыныя ўкусы. Толькі паэт-перакладчык (гэтак і значылася ў адным з даведнікаў Саюза пісьменнікаў былога саюза) мог бронзу латыні напоўніць пахам жывіцы, верасу, пералоўніць свістам, шчэбетам, рыкам. Хоць бы да прыкладу:

Ржэ і храпе, да знямогі цюгакае пушча...
Раптам спыніўся і чмыхам
адкінуў сабаку:

А гэта ўжо пра бліжэйшыя, нашыя часіны:

Не ўкрадзеш у пушчы —
грэх не адпушчан.

Вінюся і каюся, што не сказаў Язэпу Ігнатавічу тады добрых, канкрэтных слоў ухвалы, а абмежаваўся віншаваннем і агульным захапленнем.

У творчасці Язэп Семяжон быў апантаным, нястомным, акрыленым вялікай ідэяй беларускасці. У жыцці быў шчырым і непасрэдным, даверлівым і ўважлівым. Як сапраўдны беларус. Не любіў хваліцца, умеў часам нават прыбядніцца, пашкадаваць сябе. Але толькі сам. Не дапускаў, каб іншыя яго шкадавалі.

Прыехаўшы адкуль-небудзь з-за мяжы, абавязкова падкрэсліваў, што павінен быў ехаць імяніты сваяк, але не выпала таму, дык і паслалі Семяжона. Трэба прызнаць, што і сапраўды ездзіў слынны перакладчык небагата.

Вярнуўся з Польшчы. Пытаюся, што ўразіла. Адказвае: новыя будовы мадэрновых касцёлаў. І тут жа дадае, што ўсё ўражанне ад Польшчы сапсавалі новыя чаравікі, якія дужа цісналі, да мазалёў.

У вагоне з Семяжонам у Маскву ехалі нейкія ханыгі — выпівохі, як ён іх ахрысціў. Накуплялі ў Менску розных каўбас. Закусваюць пад інтэрнацыянальную маскоўскую. Прапануюць свайму спадарожніку. Той адмаўляецца. Дзівяцца, што ў нас усё ёсць, што такія каўбасы (славутыя машэраўскія два планы ва ўсесаюзны кацёл), Семяжон слухае і рэзюміруе: "Так, каўбасы добрыя, але яны нам не па кішэні". Захацелася прыбядніцца.

Шэнціла мне ездзіць з Язэпам Ігнатавічам у Рыгу на нейкую канферэнцыю па пытаннях перакладу. Старэйшы таварыш рыхтаваўся да выступу, а я ўсю ноч па маладосці піў з качагарам гатэля ў ягонай душнай і без вугалю на агні качагарцы.

Прылятаем у Ерэван. Сустракае машына з Саюза пісьменнікаў Арменіі. Едзем у горад з аэрапорта. Па дарозе Семяжон знянацку пытаецца ў вадзіўца: "А што гэта ў вас, землятрус ці віхор прайшоўся?" Вадзівец не разумее пытання. Тады госць з далёкай Беларусі ўдакладняе: "А чаму ў вас на дамах даха ў няма? У нас дык усе хаты з дахамі". Вадзівец тлумачыць, што даху ў Арменіі пляцкатыя.

Надумаўся Машэраў ледзь не ўсяму Саюзу пісьменнікаў паказаць паказушныя гаспадаркі. Усё па рытуале: хлеб-соль, багатыя застоллі. Пасля Докшыц едзем асалавелыя, Язэп Ігнатавіч смачна спіць, адвесіўшы валявую сківіцу. На хаду пішацца: "В большие думы погружен, спит по-английски Семежен". Гэта пра докшыцкае застолле жартавалі пра Лось: "Дуня з'ела парася — і на тым нарада ўся!"

Паездка была з размахам. Былі й на Нарачы, на кацярках прагульвалі. І апошняй кропкай на Нарачы быў банкет. Па пратаколе. Запомнілася доўгая прамова гаспадара рэспублікі. Афіцыянткі, як карыятыды тыя, застылі з падносамі. Потым адна з афіцыянтак нахіляецца над панавітым госцем і пытаецца, што есці будзе ён. Семяжон крыху капрызліва адказвае, што з'еў бы маннай кашы, бо яму зуб баліць. А на стале толькі птушынага малака й не было. Афіцыянтка як не зарыдала ад злосці: "Дзе я вам манную кашу вазьму?"

Любіў казаць Семяжон пра візіт да яго на новую кватэру швагеркі з імянітым шваграм. Швагерка, агледзеўшы зноў жа цеснаватую і няўтульную кватэру на апошнім паверсе без ліфта, заявіла: "Як для людзей са становішчам, дык, вядома, кепская кватэра, але як для вас, дык з галавой". На гэтую кватэру, распавядаў Семяжон, прыходзіў шваґра фатаграфавацца са сваёй маці. Старая жыла ў зяця.

З добрай дозай акторства (у Галубка ж пачынаў шлях у прыгожае) канстатаваў, як здзівіліся ў атэлье "Элегант", калі ён заказаў пашыць гарнітур з сукна, якое падаравала афіцэрам яшчэ англійская каралева.

Гэта стаўшы перад адным прыжыццёвым класікам, склаўшы дужыя мужчынскія рукі над забаронным месцам, амаль прасяваў: "Я маўчу, хай лепей мае вочы гавораць..."

Гэта ўжо не сам, а Рыгор Хацкевіч казаў, які адбыў тэрмін на сталінскіх курортах, як сядзеў з імі колькі часу ў падвале ў Менску і Язэн Семяжон. Бог уратаваў ад ГУЛАГа.

Любіў паэт-перакладчык усё крышку экзальтаванае, узвышанае. Нават кнігу выбраных перакладаў назваў "Сем цудаў свету". Душа прагла цудаў. І Язэп Семяжон тварыў цуды як перакладчык самага высокага кшталту. Перакладаў Язэп не столькі з мовы на мову, як ад душы на душу. Так цяплей. Так трымтлівей. Так трывалей.

Рыгор БАРАДУЛІН

ДОБРЫ ВЕЧАР, "СТАЛІЦА"!

Менавіта "добры вечар", бо гаворка ідзе пра новы штотыднёвік, заснавальнікам якога з'яўляецца журналісцкі калектыў мінскай гарадской газеты "Добры вечар". Гэты грамадска-палітычны і інфармацыйна-рэкламны штотыднёвік будзе выходзіць па пятніцах на шаснаццаці палосах фармату "ЛіМа". Падпісчыкі самога "Добрага вечара" атрымаюць яго бясплатна, астатнія змогуць набыць у кіёсках. І не толькі мінчане, а і жыхары Брэста, Віцебска, Гомеля і іншых гарадоў нашай дзяржавы.

Першы выпуск "Сталіцы" з'явіўся ў мінулую пятніцу і атрымаўся цікавым, змястоўным, багатым на самыя розныя матэрыялы. Для лімаўцаў прыемным было яшчэ і тое, што "Сталіца" вучыцца не ў аднаго свайго "бацькі" "Добрага вечара", а і ў ..."ЛіМа". Прынамсі, на другой паласе выдання мы сустрэлі рубрыкі, якія можна ўбачыць і на другой паласе нашага штотыднёвіка: "Набытак тыдня", "Канцэрт тыдня", "Ацэнка тыдня" і г. д. Што ж, вучыцца адзін у аднаго ніколі не лішне, каб жа толькі ішло гэта на карысць!

У ВЯНОК ПАЭТУ

З 9 снежня ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча пачне працаваць выстава "Быць можа, я не скончу жыць...", прымеркаваная да дня нараджэння аўтара "Вянка". Будуць прадстаўлены творы жывапісу, графікі, скульптуры.

Адкрыццё выставы 9 снежня ў 17.00 па адрасе: Траецкае прадмесце, вул. М. Багдановіча, 7а. Тэл. 34-42-69.

У ПЕРАКЛАДЗЕ НА РУМЫНСКУЮ...

nebănuitul vers din umbra lunii



Не раз адзначалася, што ў стасунках беларускай літаратуры з літаратурамі краін былой так званай сацыялістычнай садружнасці амаль адсутнічае ў якасці партнёра Румынія. Нягледзячы на сённяшнія неспрыяльныя абставіны, гэты прабел хоць у нейкай меры нядаўна запоўніўся. У бухарэсцкім выдавецтве "Мінерва" выйшла анталогія паэзіі некалькіх еўрапейскіх краін, якія ўваходзілі ў склад былога Савецкага Саюза, у тым ліку Рэспублікі Беларусь. Беларуская паэзія прадстаўлена ў анталогіі імёнамі Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Петруся Броўкі, Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Анатоля Вярцінскага, Рыгора Барадуліна і Алеся Разанава.

Ініцыятыва выдання анталогіі (яе назва перакладаецца прыблізна так: "Незгаданы верш на зваротным баку месяца") належыць вядомаму румынскаму паэту і перакладчыку Стэліяну Груя. Ён з'яўляецца адначасова і ўкладальнікам, і перакладчыкам, і аўтарам прадмовы.

У прадмове С. Груя вялікае месца ўдзяляе беларускай паэзіі, як класічнай, так і сучаснай, разглядае асаблівасці развіцця нашай паэзіі ў гістарычным кантэксце, у параўнанні з паэтычнымі набыткамі суседніх літаратур.

ДЛЯ ЖАНЧЫН... І НЕ ТОЛЬКІ!

Семдзесят гадоў назад, у лістападзе 1924-га выйшаў першы нумар часопіса "Работніца і сялянка". Праўда, тады выданне мела іншую назву — "Беларуская работніца і сялянка". Дарэчы, у 1931—1941 гадах часопіс выходзіў як "Работніца і калгасніца Беларусі". Цяперашняя назва ўсталявалася з красавіка 1946 года.

Да нядаўняга часу, пакуль пачаў выходзіць часопіс "Гаспадыня", а таксама розныя "Милы", "Ксюши", "Работніца і сялянка" заставалася адзіным у рэспубліцы выданнем, якое імкнулася (і гэта часцей за ўсё яму ўдавалася) шматгранна і ўсебакова паказваць жыццё беларускай жанчыны. Безумоўна, былі перыяды, калі ў паказе гэтым не абыходзілася без палітызацыі, але несумненна і іншае — "Работніцу і сялянку" любілі і з задавальненнем чыталі нават далёка за межамі Беларусі. Пацвярджэнне таму і наклад, які — бывалі гады! — значна перавышаў пяцісоттысячны рубеж.

Цяпер наклад значна ніжэйшы. Не ў апошнюю чаргу і таму, што з'явіліся іншыя выданні для жанчын. Ды і цяжкае матэрыяльнае становішча насельніцтва дае аб сабе знаць. Але тыя, хто не развітваецца з "Работніцай і сялянкай", не шкадуюць пра гэта. Па-ранейшаму на яе старонках можна знайсці самыя розныя матэрыялы. Шырока асвятляюцца і пытанні літаратуры, мастацтва, культуры. Змяшчаюцца мастацкія творы, штрыхі да творчых партрэтаў, расказваецца пра ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці, прапануюцца пераклады з іншых літаратур.

І што ўхвальна — апошнім часам часопіс усё больш прапануе матэрыялаў адраджэнскага характару.

Адным словам, ёсць у нас часопіс для жанчын. Для жанчын, але і не толькі для іх!

З юбілеем, калегі! Новых творчых поспехаў вам!

Паэзія

Данута БІЧЭЛЬ

НА АРЭШЧЫНЫМ ГАНКУ

ВОСЕНЬ

Вяжу сукенку на жыццё альбо на смерць.
Пакуль жывая, цепліцца надзея,
што нехта на мяне яе надзене...
Шчэ сілы ёсць самой сябе раздзець.

Пайшлі адсюль ніякія сябры.
Смерць не прыходзіць —
ёй кутка не маю.
У тым гаі галінак наламаю.
На сэрцы восень. Восень на двары.

Было і ўлетку горкай смакаты,
дзён-пустацветаў, выдуманай цноты,
бяссоннай, беспрасветнай адзіноты...
Тут пастаю — пад абразом святым.

НА АРЭШЧЫНЫМ ГАНКУ

Ноч перайму на Арэшчыным ганку
рэхам апошняй далёкай сваячкі.
Ноччу ў самотную Гараднічанку
знекуль вярнуліся дзікія качкі.

Ноч адмывалі крынічку ў калюжы —
вольныя, дзікія, сытыя воляй.
Пагагаталі і зніклі, як душы.
Холад застаўся. Не вернуцца болей?!

Ды прылятаюць, як зробіцца цёмна...
Дзікая рэчка — ні выйсця, ні броду.
Дзікія качкі гагочуць бяздомна.
Дзікія душы ніякага роду.

•

Птаху Максіме! Конік, агністае крылле.
Божая воля стагоддзяў у вас за спіною.
Дык падніміце мой смутак
з усёй даўніною...
Вырвіце з пекла, якое тут людзі стварылі.

Тут, у забытым кутку, я зраўняна з усімі,
з тымі, хто вусны паганіць
малітвай чужою.
Тут да цябе прытуляюся сумнай душою,
Брат, непрызнаны касцёлам,
Апостал Максіме.

КОНІК ГНЯДЫ Ў ЯБЛЫКІ НАВОРВАЕ БУЛЬБУ. ЯКУЮ КАПАЮ. ЯКУЮ НЕ САДЗІЛА...

Думаю: — Божа мой, Божа!...
Дні прападаюць у сне.
Як бы жыла я прыгожа!
Конік вазіў бы мяне.

Як жа ты там да відзэнька
зоркі згрызаеш з расы?
Косю мой, косю гнядзенькі,
Згрыз ты мае дзве слязы.

На здратаваным гасцінцы
каля халодных магіл
яблыкі ў косі на спінцы
хай не закоцяцца ў пыл.

Лепшую долю з-пад пылу
выцягнуць можна было б...
Косю ты, косю мой, мілы,
цёплыя губы і лоб.

ПАСЛАННЕ Ў РЫМ ІГАРУ ЛАШУКУ

Ойча Ігар, не вяртайся ў родны край,
тут Пан Езус памірае на крыжы,
Каля Бацькі зерні думак засявай.
Каля Бога нам сябе пабережы.

Ойча Ігару, ідзе твая даброць
светлай хваляю між поўнай цемнаты.
Толькі сам пакуль мяжы не пераходзь —
пасткі ставяць тут на ўсіх
такіх, як ты.

Гэты край — суцэльны вогненны прагон,
дзе чарцей скідае Міхал Арханёл.
Ты маліся там, каб выйграў бітву Ён,
каб вярнуліся Анёлы ў наш Касцёл.

ПРАЗАРОКІ

Светлай памяці Тамары Чабан

За Нараччу вёска стаіць Празарокі.
Жывуць там касцы і паэты-прарокі.
Жыла там Тамара, мой крытык празоры.
Аб ёй мая памяць, бы ў краі азёры...

Жыве ў Празароках матуля Тамары,
па звычцы штодзённа запальвае ў печы.
І я тут кручуся, як вецер з-пад хмары,
і вершы складаю ў халоднай пустэчы.

Смяялася: — Крытык я твой кішанковы...
Хацела б і смерцю
ўвесь свет не азмрочыць...

Захоўвае памяць банальныя словы...
Сардэчныя струны...
Тамарыны вочы...

•

Як яны з'яўляліся на маіх вачах,
так яны знікалі на маіх вачах.
Іх не куля даганяла, не канвой сцярог.
Хто ў Амерыку паехаў,
хто ў калгасе здох.

•

Мяне ніхто ніколі не кахаў
і не любіў ніхто мяне.
О, Божа!
Чаго ж я выйшла ў гэта бездарожжа,
дзе не было ў мяне ніякіх спраў?

Згрызота, смутак, холад і зіма,
маркота, змрок — такая завядзёнка.
Была ў мяне адна сяброўка Бонка.
Памерла.
І нікогачкі няма.

СНІЦЦА МНЕ ХАТКА

Сніцца мне хатка,
нізкі парожак,
Бог не застрэміць
стомленых ножак.

Носік там грэе
Бонка старая,
тая, што ў раі
кветкі збірае.

Сонейка ў поўдзень
ткнецца да клямкі —
сонныя вочы,
носік у плямкі.

Нейкі вандровец
глядзіць вінавата.
Твар не паголены...
Гэта ж мой тата.

•

Лятуць з нябёсаў зорачкі-знічкі,
спаткі кладуцца ў стог.
Пайду на луг пазбіраць медунічкі —
Іх жа пасеяў Бог.

Збіраю гэтыя Божыя слёзкі,
шнурочкам вяжу ў снапок.
І хай кладуцца дні, як пялёсткі,
ў нагрэты зоркамі стог.

ЭПІТАФІЯ

Тут жыла паэтка —
голая штыкетка...
Суткамі карпела,
ды пісаць не ўмела.
Рыфмавала вершы
пад званы на вежы,
у шуфлядзе мышкі
укладалі кніжкі...
Елі мышкі кніжкі
без ніякай меры,
ім балелі кішкі
ад сухой паперы...

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

РЫНАК

Прапала кароўка — прападай і вяроўка.
З народнага.

Пачую "рынак" —
Модная ўжо слоўка —
І мне ўяўляецца адразу Камароўка,
Якую з раем навят
Не зраўняеш,
Дзе ёсць усё,
Ды з голаду сканаеш,
Калі ў цябе ні "зубра", ні "лася".
"А як маеш грошы,
Дык і сам харошы..." —
Прыпеў адзін,
І песня ўся.

Тут плач не плач —
Не знойдзеш суцяшэння,
Тут свой закон,
Што горай ад прыгону:
Рандляр цікуе
За тваёй кішэняй,
А рэкеціры зводдаль —
За ягонай.

Пачую "рынак" —
Уздыхну па Камароўцы,
Заб'ецца сэрца часта, неспакойна:
Не злодзей жа,
А я ў пятлі-вяроўцы —
У рынак цягнуць,
Як бычка на бойню!

Той — без прымусу,
Гэты — пад прымусам,
Здалёк надзеі ўбачыўшы іскрынку,
Як на пажар,
Прастуюць беларусы:
Адзін — да рынку,
Дзесяць — па скарынку.

З АБМЕЖАВАНАЙ АДКАЗНАСЦЮ...

Не знайду я з уласнасцю яснасці,
Што нажыў быў —
Пайшло ў небыццё.
Таварыствам
З абмежаванай адказнасцю
Давяраць я павінен жыццё.

Ну а іх — як вірлівых мурашнікаў.
Што ім трапіць —
Не выпусцяць з рук.
А прыгледзішся зблізку —
Шабашнікі,
Не душа, а набіты каршук.

Я блукаю між іх, бы знявечаны,
Як не свой
На зямельцы сваёй, —
Апалячаны,
Анямечаны
І прыгнечаны "ласкай" чужой.

Шчасце ўсё — што падковай іржаваю
Над жыццём,
Падкаваным няяснасцю,
Бо дзяржава ўжо стала
Дзяржаваю
З абмежаванай адказнасцю.

•

Ляжыць зямля —
Зялёная, шырокая.
Ляжыць зямля —
Як сонцу атуліць.
Ляжыць зямля —
Азёрна-сінявокая,
Ляжыць зямля,
Што ўсім крычыць: "Баліць!"

Я крык пачуў —
Нібы ступіў у прысак.
Я вусны сціў,
Каб стогн стрымаць сілком,
Бо ў гэтым крыку —
Плач сірот-калысак
У роднай вёсцы...
Там...
Па-над Сажом...

•

Абноскі з шафы дастаю,
Вачмі пераніцоўваю.
Над імі ў роздуме стаю —
Не ў модзе кумачовае.

Як болю, зведаўшы маны,
Нібыта ўваскрасаю,
І ўжо душу,
Як рызманы,
Кручу, ператрасаю.

Проза

НОВЫЯ НАВЕЛЫ

Георгій МАРЧУК

ГРЭЙ

Ліна была шчаслівая, як ніколі ў жыцці: яна ўпершыню выбіралася за мяжу і не абы-куды, а на сваю далёкую-далёкую, якая ўжо і ў снах не снілася, радзіму Ізраіль. Ехала разам з шаснаццацігадовым сынам да дачкі, якая, з божай дапамогай, надзейна ўладкавалася аж у самім Тэль-Авіве.

Адміністратар дзіцячага тэатра, Ліна не мела, канешне ж, вялікіх заробкаў, каб набыць білеты ў два канцы да сталіцы яўрэйскай дзяржавы. Клопаты аб гэтым узяў на сябе заможны муж яе дачкі, якая дахаты ў лістах не пра ўсё і пісала, абяцаючы ўсё расказаць пры сустрэчы. Усе ў тэатры ведалі, што Ліна ляціць у Тэль-Авів, і таму неслі ёй лісты для сваіх знаёмых, дробныя падарункі, давалі такія-сякія даручэнні. Добразычлівая Ліна ўсё акуратна запісвала. Яна наогул усё і ўсюды памячала ў свае блакноты і захоўвала гэтыя запісы гадамі, хоць ты бяры ды з іх пішы летапіс тэатра. Ліна была ў прыўзнятым, цудоўным настроі, сын радаваўся паездцы радасцю спартсмена, які выйграў званне чэмпіёна свету.

Замінала ім абодвум адно: на каго пакінуць трохгадовага Грэя. Сваякі ў Бабруйску адмовіліся забраць сабаку да сябе. Дарэмна Ліна іх угаворвала і прапанавала нават грошы на харч. Даў згоду даўні яе сябра-артыст, ды нечым не спадабаўся ён Грэю. Нават напалохаў артыста, і той, небарака, два спектаклі, ранішні і вячэрні, заікаўся.

Угаварыла Ліна пабыць гэтыя тры тыдні з Грэем суседа-настаўніка. Трэба сказаць, што ўсе тры гады яны не пакідалі сваю аўчарку ніколі, і Грэй толькі яму вядомым пачуццём адчуваў ад'езд сваіх. Не разумеў: чаму Ліна дазваляе ў сваёй прысутнасці настаўніку адзяваць на яго ашыйнік? Паварочваў у яе бок галаву і запытальна глядзеў у вочы.

— Ён добры, — супакойвала суседа Ліна. — Толькі два разы і будзеце выводзіць. Раніцой і ўвечары. Ён умее цярпець. Ежу кладзіце ў міску на цэлы дзень.

Дамовіліся так: каб не трывожыць сабаку, вырашылі пакінуць кватэру тады, калі Грэй будзе з настаўнікам на вуліцы.

Так і зрабілі. Не развіталіся з Грэем, не абяцалі, што вернуцца, не папрасілі, каб чакаў. Прывёў настаўнік сабаку ў пустую кватэру, замкнуў і суткі баяўся адкрыць. Грэй, не дачакаўшыся сваіх, так выў, так скуголіў, што, пэўна, чулі яго жалобны енк у суседскім доме. З асцярогаю пераступіў парог кватэры настаўнік увечары наступнага дня.

— Грэй, Грэй... Хадзем гуляць... — асцярожна прапанаваў настаўнік.

Грэй быў амаль абыякавы да часовага гаспадара. Паддаўся на яго ўгаворы, лянiва ўстаў. Гуляў без усялякай цікавасці. Доўгімі летнімі днямі, седзячы адзін, Грэй час ад часу, як бы са сну, пачынаў жалобна выць, але выў нядоўга. Ён дзічэў. Не выказваў аніякай рэакцыі на паказны клопат настаўніка, які сабаку не любіў, а больш чакаў абяцаных долараў.

Мінулі, як у прыемным сне, сонечна-спякотныя тры тыдні ў Ізраілі, і здоўжыліся, як турэмнае зняволенне, тры тыдні для Грэя.

Прыехала Ліна з сынам дахаты. Не забылася пра Грэя, везла яму пакаштаваць Пяці Грыбаў. Адразу ж з парога сын аклікнуў сабаку, здзіўлены тым, што той не бяжыць ім насустрач. Грэй стаяў пасярод пакоя, як укапаны.

— Гэта ж мы, Грэй, не пазнаеш? — І сын нахіліўся да сабакі. Той нечакана ірвануўся да яго і адкусіў кончык носа. Гэта адбылося так хутка і так нечакана, што ні Ліна, ні сын, ні настаўнік адразу і не ўцямілі, што здарылася.

Першай апамяталася маці. Яна схапіла акрываўлены кавалачак носа, запхнула яго ў цэлафан і пацягнула сына ўніз да таксоўкі, якую, на сваё шчасце, не адпусціла, бо паднялася ў кватэру па беларускія грошы, не хочучы разлічвацца з таксістам долярамі. У клініцы сыну прышылі частку носа. Паспелі. Вярнуліся яны дахаты. Злая Ліна ашыйнікам моцна пабіла Грэя, адкрыла дзверы і выпхнула яго на лесвічную пляцоўку. І там яшчэ некалькі разоў сцебанула.

— Пошел вон! Вон пошел!

Сядзелі ў кватэры моўчкі. Не ўключалі тэлевізар. Разбіралі багаж. Нешта і пакупкі не радавалі. Пра Грэя не ўспаміналі. Ён нагадаў пра сябе сам. Вярнуўся да дзвярэй кватэры і ціха скуголіў, прасіўся, каб адчынілі.

— Можа, давай яго ўсыпім? — раілася з сынам маці.

Сын маўчаў.

— А, можа, прададзім? За яго долараў трыццаць дадуць.

Сын маўчаў.

— Што ты маўчыш? Скажы што-небудзь. Не мяне ж пакусаў, цябе, — не вытрымала Ліна.

Сын пайшоў да дзвярэй і ўпусціў сабаку ў кватэру.

Грэй быў мокры. Яго калаціла. Ён стаяў у цёмным калідоры і чакаў.

— Здзічэў. Што з яго ўзяць. Няхай жыве, — сын дараваў жахлівы ўчынак свайму сябру, і Ліна не пярэчыла, згадзілася з сынам.

ДОЎГАЧАКАНЫ НАБЫТАК

Кінуліся збіраць грошы ўсёй сям'ёю. Дачакаліся. Лічылі, што пашанцавала. З вёскі патэлефанавала стрыечная сястра і паведаміла, што ёсць мажлівасць набыць сценку па старой цане, але трэба спяшацца, бо з першага чысла сценка будзе каштаваць ужо мільён.

На сястру, якая працавала ў сельмагу, гарадскія сваякі крывіліся, бо тая ўсё толькі абяцала, і ніколі яны ад яе нічога людскага, дэфіцытнага не атрымалі.

— От мо план гарыць, дык пра нашу просьбу ўспомніла. Хто ж цяпер з прасталюддзя што дарагое купіць. Аблагадзецельствавала, — з іроніяй ацаніла прапанову радні мужа гаспадыня.

— А хоць бы й так, а хоць бы й так! І за гэта дзякаваць трэба, — адказаў гаспадар, пачухваючы сваю лысую галаву. — Калі заўтра не ўхопім... хана, пішы прапала. Папаўзуць цэны ўгару, нам да смерці мэблю не купіць.

— Пазычай. У мяне на пошце няма ў каго ўзяць. Ад палучкі да палучкі. Раз на месяц каўбасу ядуць, — як бы незадаволена агрызнулася гаспадыня, прыжмурыўшы свае нядобразычлівыя маленькія вочкі, аднак увечары падабрэла: муж прынёс з работы палучку, прэміяльныя. Гаспадыня пабегла ў ашчадны банк і зняла з кніжкі ўсе грошы, пакінуўшы на рахунку пяць рублёў. Бабуля, маці гаспадыні, хваравітая, маўклівая жанчына, якая дажывала свой гаротны век у адзінай дачкі ў горадзе, дастала і свой прыхаваны на чорны дзень капітал. Прыкінулі. Не хапала трэцяй часткі сумы. Гаспадар паехаў да свайго брата, які, не маючы ўласных вольных грошай, аднак пазычыў у суседа, якому паабяцаў адраманцтаваць пабітую машыну. Гаспадыня тым часам абышла сваіх суседзяў. Яна, празмерна гаварлівая, страх як не любіла браць у доўг, а калі і брала, дык раніцай ці апоўдні наступнага дня вяртала назад. Выйсця іншага не было: мусіла выставіць прылюдна сваё жабрацтва. Сценка ўсё ж не плацце, не каўнер, а рэч на ўсё жыццё. Сабралі грошы. Высыпалі на ложак, селі, палічылі — трохі не хапала. Прыйшла з тэхнікума дачка, аддала сваю стыпендыю, яшчэ пабегла да мянялы і прынесла грошы за шэсць долараў. Пра гэтыя яе долары бацькі і не ведалі. Паспелі, перадалі неабходную суму грошай у вёску. Сястра ажно месяц не магла пераправіць сценку ў горад. Тэлефанавалі ёй надта часта, турбаваліся — "А якая наша сценка? А шафы якія? А ці ўсё на месцы. Бо цяпер пайшлі людзі бессаромныя, усё крадуць..." Нарэшце сценку прывезлі, склалі, паставілі. Павячэралі з чаркаю самагонкі. Адсвяткавалі набыццё дарагой і доўгачаканай пакупкі, як дзень нараджэння малога дзіцяці. Кожны з прыемным сумам, які ахутвае душу, калі дзейсніцца доўгачаканая мара, думаў аб сваім.

"Не-е, што ні кажы, а кватэра зайграла. Кніжкі расстаўлю, як у інтэлігентаў. Салідна. Бар ёсць. Бутэлечкі, адна да адной, як у кіно. Салідна...", — думаў гаспадар.

"Нарэшце хоць посуд ды бялізну будзе дзе скласці. І для адзежы хопіць месца. Верхнюю ў прыхожай, а тут буду трымаць касцюм, плацце, вечна дымам ды гарэлкаю ягонай прапахвала", — думала гаспадыня.

"Начное бра куплю, дыван, замок устаўлю і забяру комнату сабе. Смяротна надакучыла з бабаю. Скуголіць, скуголіць!.. Пакурыць не магу", — думала дачка.

"Дзякуй табе, Божа, што буду тут у труне ляжаць. Дачушцы не будзе сорамна перад людзьмі. Яна такая знерваваная зрабілася", — думала пра сваё і бабуля.

ПІСЬМО ФЕЛІНІ

Кінамеханікам Тарас стаў не адразу. З дзяцінства любіў прастору, неба, ваду і марыў стаць афіцэрам марскога флоту. Патрапіў на карабель і быў блізка да сваёй мары, аднак на апошнім годзе службы па стане здароўя яго спісалі на бераг. Пасля аперацыі вярнуўся ў родную вёску прыкметна састарэлым і схуднелым. Правая нага яго не згіналася і ён пры хадзе падцягваў яе. Высокага, як таполя, памяркоўнага і незлаблівага Тараса ў вёсцы паважалі і знайшлі яму, маладому пенсіянеру, не цяжкую работу — кінамеханіка. Тады яшчэ не ў кожнай хаце быў тэлевізар і аднавяскоўцы ахвотна і часта збіраліся ў клуб пагуляць у шашкі ды шахматы, пагартаць падшыўкі газет "Правда" і "Звязда", ды паглядзець новы фільм. Ад вёскі да раённай канторы пракату дарога асфальтавая, якіх-небудзь паўгадзіны язды. Тарас з дастаўкай фільмаў не меў клопатаў. Сёння новы фільм у раённым гарадку, праз дзень — у Тараса, які без падману выйшаў у перадавікі абласной кінафікацыі, маючы штогод дыпломы ды граматы за подпісам высокіх кіраўнікоў. Кожныя пяць, семь гадоў аддзел пракату спісваў старыя копіі фільмаў. Па вялікім блаце начальнік аддзела пракату за бутэльку гарэлкі перапраўляў некаторыя са спісаных фільмаў у фільматэку да Тараса, які за гады работы добра-такі асвоіўся ў стракатым свеце сусветнага кіно і нашпігаваў сябе досыць шырокімі ведамі аб славутых акцёрах ды рэжысёрах. Копія фільма "Ночы Кабірыі" патрапіла да яго цудам: яе, спісаную яшчэ ў шэсцьдзесят шостым годзе, нейкім дзівам не паспелі спаліць. Тарас памятаў гэты фільм ад часоў, калі служыў у Кранштаце, і быў невыказна рады, што гэтая славутая карціна "для душы" (як любіў характарызаваць фільмы аднавяскоўцам) стала яго ўласнасцю. Старую копію ён бярог і ахоўваў, як поп кадзіла. Гэта быў адзін з самых яго любімых фільмаў, калі не самы любімы. Уся вёска ведала фільм Феліні на памяць, як ведалі першы слупок верша Купалы "А хто там ідзе?" Здараліся часам рэдкія перабоі з дастаўкай новага фільма, і Тарас, каб план не гарэў і каб дзень дарам не прапаў, круціў "Ночы Кабірыі". За чаркаю Тарас з пафасам адваката расказваў пра іншыя фільмы рэжысёра Феліні. Мужыкі крывіліся, бо слухалі ягоныя байкі ўжо дзесяты раз. Жанчыны наогул казалі, што Тарас памяшаўся на гэтым кіне, закахаўся ў гераіню, так старым халасцяком і застанецца. Памрэ маці, дык не будзе каму сарочку памыць, абед зварыць. "Дурнатою маецца. Каму трэба такое кіно!" Яны любілі індыйскія фільмы. Тарас астатніх фільмаў славутага італьянца не бачыў, а толькі чытаў пра іх у часопісах і газетах, якія сабе выпісваў. Прачуў ён неяк, што ёсць у вобласці копія новага фільма Феліні "Амаркорд". Паехаў да начальства і папрасіў, каб копію гэтага фільма далі яму абавязкова. Новы начальнік пракату — былы камсамольскі работнік — пераростак, суха і іранічна-здзекліва адказаў: "Табе не дамо. Гэты фільм не для ўсякай аўдыторыі. Парэзаны. На вёсцы ў цябе не зразумеюць, будуць плявацца. Я бачыў, нічога там для нас няма. Мы ў раёне адзін сеанс паставім і — назад у Маскву. Знайшлі на што золата траціць! Лухта, на адну цыцку восьмага размеру і можна паглядзець. Ты пра план дбай, а ідэалогію нам пакінь. Мы ведаем, што вёсцы можна глядзець, а што ёй не цікава".

Тарас не аскаліўся, не хапіўся спрачацца, абараняць фільм. Ён проста дачакаўся канца сеанса, забраў пад уласную гарантыю ў знаёмага калегі фільм, паабяцаўшы, што раніцою яго даставіць у будку раённага кінатэатра.

Дома шчаслівы і ўзбуджаны Тарас абышоў усе хаты, запрашаючы аднавяскоўцаў на новы фільм. Набілася ў залу багата гледачоў, праўда, паступова — хто з прычыны спраў у гаспадарцы, хто згубіўшы цікавасць — многія яны пакінулі клуб. Даглядалі фільм некалькі мужчын ды падлеткі, якім было ўсё адно, што глядзець, абы не рабіць урокі.

"Так сабе. Але ж, халера, доўгі. Каб камедыю якую прывёз", — дзяліліся яны ўражаннямі.

Засмучаны Тарас зразумеў, што гледачы расчараваны. А што значыць не ўхваліць фільм? Ганьба кінамеханіку. Ён хапіўся даказваць, тлумачыць змест фільма, у якім чалавек губляе апору ў жыцці і зноў знаходзіць. Але ў мужыкоў балелі галовы, слухаць яго не сталі, сказалі, што больш на Феліні хадзіць не будуць. Пакрыўджаны Тарас сеў увечары пісаць ліст рэжысёру з падзякай за фільмы "для душы". Напісаў некалькі сказаў і адклаў. Вырашыў зрабіць гэта другім разам. Раніцою ў суботу абышоў хаты, запрашаючы зноў на "Амаркорд". Даваў бясплатна. Унёс у касу са сваёй палучкі. Нерваваўся.

"Мо яны былі стомленыя і не зразумелі гэты шэдэўр?" — думаў ён. Акрамя дачкі заатэхніка, дзесяцікласніцы, ніхто не прыйшоў. Тарас адмяніў сеанс і, разлаваны, павёз копію ў раён рэйсавым аўтобусам...

Ішлі гады. Па-ранейшаму Тарасу падвозілі новыя і старыя фільмы, але сярод іх больш не было фільма Феліні. Патроху забываўся і выпадак з "Амаркордам".

Аднойчы дзяўчына, якая прыходзіла другі раз, каб паглядзець "Амаркорд" і якая вярнулася ў вёску пасля інстытута працаваць бібліятэкарам, напаткаўшы дзядзьку Тараса, паведаміла, што яго Феліні ляжыць у шпіталі пры смерці. "Па тэлевізары перадавалі".

— А ў маім тэлевізары лямпа перагарэла.

— Прыходзьце да нас. Можа, і сёння перададуць, — запрасіла дзяўчына.

Сціплы Тарас, каб не замінаць людзям, пачаў штовечара па чарзе хадзіць па хатах на інфармацыйную праграму. У хуткім часе ўся вёска ведала, што недзе нейкі Феліні памірае. Першым жахлівую навіну прачуў вартаўнік машыннага двара Сандронаў, які апошнія трыццаць гадоў рэгулярна слухаў па радыё галасы ворагаў далёкага і блізкага замежжа. Тарас яшчэ сумняваўся, не паверыў, чакаў афіцыйнага паведамлення па тэлевізары.

— О, паслухай, паслухай... Тарасаў Феліні ўсё ж памёр, не выхадзілі, — казаў сябар Емяльян.

— Ай, што мне да яго! У мяне галава па сваім баліць, — адказвала жонка.

Сыпаў дробны дождж. За вакном — густая, як смала, цемра. Эканомілі электрычнасць, і лямпачка свяцілася толькі ля магазіна.

— Пайду да Тараса. Не прыйшоў сёння, а па тэлевізары перадалі, што яго Феліні памёр, — сказаў сусед Васіль сваёй жонцы і пайшоў.

— Вам бы толькі выпіць.

— Ай, нічога ты не разумееш.

Сябры — руплівы Васіль, блізарукі Емяльян і задзірысты Сямён, не згаворваючыся, накіраваліся да Тарасавай хаты. Маці спала. Тарас сядзеў ля стала адзін.

— Тарас, твой Феліні памёр, — сказаў з парога Емяльян.

— Ведаю, хлопцы.

— Мы да цябе вось...

— Праходзьце, хлопцы. Мы можам дзякаваць лёсу, што жылі ў час разам з Феліні, бачым яго фільмы.

— А ты тую карціну, пра дзяўчыну, якую ўсе падманвалі, што ў цябе была, не здаў? — спытаў Сямён.

— "Ночы Кабірыі"? Ёсць. Заўтра паглядзімо.

— Даставай шклянкі. Вып'ем па сто грам, — далучыўся да іх Васіль.

Да глыбокай ночы гарэла святло ў хаце Тараса. Сябры не спяшаліся разыходзіцца, згадвалі нешта з перажытага, гутарылі, як сказаў бы Тарас, не дзеля п'янкі, а "для душы".

Тэатр

Ігар ЗАБАРА: «ПРАФЕСІЯ НАС НАВАТ НЕ КОРМІЦЬ...»

Лабараторыя Міхаіла Чэхава сёлета ладзілася ў Вялікабрытаніі і, друкуючы колькі нумароў таму інтэрв'ю з акцёрам Альтэрнатыўнага тэатра Ігарам Забарам, "ЛіМ" абяцаў падрабязна распытаць у яго, як ва ўдзельніка пра ўсё, вартае ўвагі. Ласкава просім засяродзіцца.

ВАРУНКІ, УМОВЫ, АКАЛІЧНАСЦІ

Першая неспадзеўка перад пачаткам вандроўкі ў Лондан — Эмілія Пранскутэ (актрыса, вядомая публіцы па спектаклі "Запіскі вар'ята" М. Гогаля, які быў першым на леташнім фестывалі монаспектакляў "Я"). Яна таксама прайшла конкурс з "Казановай" Марыны Цвятаевай.

Ляцім разам і далятаем да другой неспадзеўкі: у Хітроў нас чакае аўтобус і вязе... за 65 кіламетраў ад Лондана, у вёску. Добрая вёсачка, — там Эмерсан-каледж, арганізатар лабараторыі ў Вялікабрытаніі, ладзіў агульнае спатканне і жыццё ўдзельнікаў. А там вядзе рэй грамада, якая займаецца філасофіяй і мастацтвам, але не ўжывае мяса і спіртнога. Сама не ўжывае і іншым не раіць. Паколькі ў групы з СНД вольных грошай нямашака, парада набыла драматычнае адценне: увесь месяц будзем есці прарослае зерне, нейкія мюслі, падобныя да аўсяных ці какоравых шматочкаў, — іх трэба заліваць кіслым малаком. Затое аматарам мёду ды арэхаў можна было раскашаваць...

Асталёўваемся выгодна, цудоўна, у асабнячку, але засмучаюць суседкі-датчанкі. Лазенька адна на ўсіх і яны шторанiцы навыперадкі шлэпаюць мыцца... з усяго адзення маючы толькі ручнік цераз плячо... І цягнуць ветліва: "Мо-онінг!"

Нас — сто семдзесят чалавек. Лічым сваіх — нас набіраецца васемнаццаць, — тых, каго цэлы месяц будуць называць рускімі. Астатнія, што з розных куткоў і куточкаў свету прыехалі пад Лондан, не зведалі ніякіх усялякіх творчых конкурсаў і да іх падобнага: за свой кошт. Усе! Але амаль адны мы, так званыя рускія, былі прафесійнымі акцёрамі са стажам! Гэтую акалічнасць мы сцямілі толькі на трэці дзень, калі чарговая лекцыя распачалася чарговым: "Калі вы вырашылі прысвяціць сябе мастацтву..."

Дні загружаны заняткамі вельмі шчыльна. Затое — цудоўныя майстры-выкладчыкі. Напрыклад, галівудскія зоркі: Харт Хатфілд, які ў свой час атрымаў некалькі Оскараў, у тым ліку — і за працу ў фільме "Партрэт Дарыяна Грэя"; Мала Паўэр, якая сыграла Раксану ў знакамітым фільме "Сірано дэ Бержэрак"; Энтані Куін — ён сам прыехаць не змог, і мы глядзелі ягоную касету з прабачэннямі і курсам заняткаў. Нас знаёмілі з вучнямі самога Міхаіла Чэхава, і гэта чымсьці нагадвала сустрэчы з нашымі старымі рэвалюцыянерамі, што бачылі Леніна. Але да расповядаў Чэхавых вучняў у мяне быў давер, — нават тады, калі яны згадвалі Чэхава-веселуна й жартаўніка, альбо тое, як ён... не любіў Расію. А яе ж, матухну, зазвычай так шчымліва ўсе любяць...

ВЫКЛАДЧЫКІ

Іх можна было выбіраць, мяняць, але дзеля трох асоб я хоць колькі разоў перасек бы не адзін акіян. Гэта перад усімі — Сяргей Юрскі. Трэба было ехаць, каб зрабіць з ім акт з "Трох сясцёр", — а жадаючых з заяўкамі на ролі было шмат. Каб нас не перасварыць і не пакрыўдзіць, асістэнт Юрскага прапанаваў зрабіць эцюды пра персанажаў Антона Чэхава — у дзяцінстве, у маладосці і ў старасці, пры гэтым няможна было называць таго, каго паказваеш. Я хацеў рабіць Тузенбаха, якому састарыцца не давялося (загінуў на дуэлі). Трактуючы Тузенбахаву старасць, я закрыў сабе вочы двума фунтамі стэрлінгаў, як пятакамі, ды ўзяў грамніцу ў рукі... Майго персанажа пазналі, даверылі працаваць у майстра, і пазней калега сказаў мне, што Юрскі колісь сам увасабляў гэтую ролю.

Школа Юрскага — адметная сваёю методаю і спавяданнем класікі, нават у выкладанні. Сам Юрскі з Н. Ценяковай паказаў спектакль "Крэслы" Э. Ёнэскі, апісваць яго я не ў стане, але эмацыйная памяць адгукаецца на яго адразу...

Часам было сорамна за нашых. Прыехаў з Масквы Барыс Юхананаў, вядомы рэжысёр і тэарэтык сваіх спектакляў. Прывёз "Вішнёвы сад", які ідзе сем гадзін без перапынку. У паветры залы плаваюць гумовыя ёмістасці, надзіманыя геліем, выходзіць Гаеў у жаночым строі, дзейнічаюць некалькі лесбіянак-Ранеўскіх і ўсё так абгрунтавана тэарэтычна! Алег Яфрэмаў, — а ён усё жыццё займаецца Чэхавым, застаецца прыхільнікам мхатаўскай школы, — палатнеў ды чырванеў, калаціўся. Мы вырашылі ўжо, што мэтра нудзіць, — яго і праўда, моцна блажыла...

Сорам іншага паходжання — яго зразумеюць толькі суайчыннікі. Ладзілі паездку ў Стрэдфард, на радзіму Шэкспіра. Можна было наведаць яго адноўлены дом, паслухаць гісторыкаў, нават спектакль паглядзець... Нашы былі адзінымі, хто не паехаў: як заплаціць за паездку пяцьдзесят долараў?..

...Другая асоба, якою я захапіўся, — клоун, амерыканец французскага паходжання Леанард Пеціт. На ягоныя майстар-класы пакрысе перайшлі ўсе ўдзельнікі лабараторыі. Ён вучыў, як смяшыць гледача, а самому заставацца сумным, спакойным, але не выдурнявацца, не сушыць зубы, не грымаснічаць. Як смяшыць, перажываючы. Я адразу згадаў Леаніда Енгібарава, самотнага клоуна, — навучанне Пеціта блізкае да ягонага майстэрства. Я працую шмат, але нават мне пад ягоным пільным вокам было ніякавата: гэты страх ёсць заўжды, калі роля ў цябе не выбудавана. І раптам ён кажа: вы, маўляў, пераступаеце парог і трапляеце ў цырк багоў. На вас глядзяць багі. Вы самі — багі. Усё, што вы ўчыніце, — боскае. І калі пераступаеш парог такога боскага цырка, — а ўсе апантана апладзіруюць, — дык разумееш, што блага зрабіць не зможаш. Яшчэ не ведаеш, якое майстар дасць заданне, а нейкі комплекс ужо знішчаны. Ён кажа: жанглюйце. Чым? Мы ж... толькі ў трыко. А ён — чым можаце, але не так, як зазвычай у цырку. Жанглюйце веямі, вачыма, носам, надзімайце шчокі, круціце языком... Сярод нас быў адзін вядомы англійскі акцёр, — яму за пяцьдзесят, але да заняткаў Леанарда Пеціта ён ставіўся як да свайго ранішняга класа ставяцца танцоры; англічанін шкадаваў, што гадоў дваццаць таму не ведаў гэтых урокаў. Вось яшчэ адзін з іх: трэба паказаць самы адказны нумар праграмы. Урачыста, па адным, выходзім; ён урачыста абвяшчае: "Сядайце!" У гэтым сяданні і быў самы адказны нумар, але як фантастычна трэніруецца псіхіка, калі ўсё будуецца на найдметным вырашэнні шараговых, звыклых праблем! Альбо з шапкі з запіскамі я выцягнуў тэму для эцюда: "палец нагі" ды "адзінокі", атрымалася, што ўвасабляць мушу "адзінокі палец нагі". І — увасабляў. Спачатку — вачыма, потым — кісцямі рук, затым — толькі галавою, толькі хадою... А вось яшчэ, на першы погляд, дзіўнае практыкаванне. "Вас, — кажа майстар, — сорак чалавек. У кожнага ў галаве — тры мухі. Яны моцна вам назаляюць, але выявіць гэта няможна. За гэта — смяротны вырак. Хадзіце, усміхайцеся, дачыняйцеся, грамадуйце, але мух не выяўляйце!" Потым тры мухі ў галаве трактаваліся адзнакаю арыстакратызму і іх можна было паказаць, потым з галавы перамяшчаліся... ў задніцу... Смешна? Але як акцёр вучыцца разумець сябе! Потым мы зрабілі на гэтую методу пародыю, і наш хлопец на прыстойнай англійскай мове распавёў пра заданне Пеціта так: "У цябе ў задніцы кракадзіл, у галаве — тры мухі і яшчэ шмат кузурак, паказваць нічога нельга, але ўсё табе страшэнна замінае..." Сам Леанард ад пародыі плакаў. Скрозь смех.

Малу Паўэр свет памятае Раксанаю, але яна ўжо нашмат старэйшая за сваю гераіню. Затое колькі жыцця, імпэту, якое валоданне прафесіяй! У нагавіцах, на тонкіх абцасіках, валасы дагледжаныя, усмешка, і — ў руху, у руху! У самы змрочны дзень, калі я быў не ў гуморы, яна мяне так раскатурхала, што я заслужыў называцца ейным улюбёнцам, і Мала напісала мне на ўспамін: "Дзякуй за цудоўнае практыкаванне! Вы вельмі вясёлы!"

Мы ж вырашылі, што калегі-іншаземцы весяліцца не ўмеюць пасля таго, як разам адзначылі народзіны Міхаіла Чэхава. Яны запускалі балонікі з геліем ды крычалі: "Міш'я", Міш'я". Чэхаў, трэба разумець...

УРАЖАННІ ДЫ НАЗІРАННІ

Самае вялікае змацыйнае ўражанне — "Сланечнікі" Ван-Гога ў Нацыянальнай галерэі на Трафальгарскай плошчы. З шасцюдзесяцю заламі галерэі можна асвойтацца хіба за шэсцьдзесят дзён, таму мы хадзілі з каталогам, выбіраючы вядомае. Паглядзелі Веласкеса — "Раніцу Венеры", я хацеў быў яе сфатаграфаваць, але падбег паліцэйскі і засвяціў маю стужку: здымаць забаронена. Кожная работа збірае (або не збірае) купкі гледачоў — так, што спачатку кідаюцца ў вочы гэтыя купкі, а не самі работы. Да Ван-Гога я праціскаўся... Але вось назіранне: людзі ў розных залах парознаму сябе паводзяць, быццам патрапляючы пад відавочнае ўздзеянне работ! Нават пластыка мяняецца, хада, гаворка! Рубэнс неяк урачыста... разнявольвае, а ў зале Пікасо не было ніводнага чалавека з выпрастанаю спінаю, — там пачыналі дзіўна жэстыкуляваць, а то і на падлозе ладкавацца...

Я прайшоўся па месцах свайго персанажа з "Трохграшовай оперы" Мэкі-Нажа, — памятаеце, там поўна памінанняў пра Стрэнд, Пікадзілі, Соха... Было, што паўтараў радок "Якая поўня над Соха" і ўяўляў... не смейцеся, я ў Палтаве гадаваўся... уяўляў Соха вялікім балотам ды адбіткі святла ў азярынках... Паглядзеў я на гэтае балота. Каб былі грошы, ды каб быў з дачкою! Такой размаітасці чалавечых праяў, сабраных у адным месцы, такой прамысловасці забаў ды сродкаў для баўлення часу не ўяўляў. Горад у горадзе, Соха! А вось Лонданскі заапарк ад нашых адрозны тым, што там дзяцей пускаюць да жывёл — не натурыстых, не куслівых, рахманых. Я бегаў з кенгуру, хацеў у сумачку ёй залезці, яна мяне лапкамі схапіла, не пусціла...

ВЫСНОВЫ

Усе іншаземцы наракалі на лонданскую дарагавізну. Трапілі б яны да нас! Але нам трэба паказвацца ў іх, бо мы можам складаць канкурэнцыю на самым высокім узроўні. У любой краіне. У нас, бадай, ці не самыя моцныя ў свеце акцёры. Калі Юрскі па-руску паказваў "Крэслы" (без перакладу), а я не ўпэўнены, што ўсе гледачы ведалі п'есу, — яны нармальныя людзі, чытаюць што падабаецца, Ёнэску проста так чытаць не будзеш, — былі такія авацыі, такое разуменне! Я цеміў: мала, мала атрымаць дыплом і шчасліва атрымаць работу. Само жыццё вымагае з акцёра дасканалення. У нас жа мастацтва хворае на арганізацыю, на структуру, таму і акцёры — хворыя, хваравітыя. Ад паслядоўнікаў Чэхава я атрымаў урокі ды методы: як гэты боль, гэтую хваробу не дапусціць развіцца ў паталогію, а скіраваць у творчасць! Хай прабачаць калегі, але і нездаволенасць наша, і нават незапатрабаванасць — магутная перавага над дабрабытнымі заходнімі калегамі. На лабараторыі Чэхава нашы — прадстаўнікі нашай школы — рабілі і лепшыя паказы, і лепшыя ўрыўкі. Тыя, хто меўся канкурыраваць з намі прафесійна, выхаваны, між іншым, на заходнім кінематографе: усмешка, пастава, жэст, шчаслівы канец... А нас мардуюць праблемы; нам баліць жабрацтва, ганьбаванне, нястачы, небыткаванне, — і з іх расце мастацтва, і з іх узнікае славутая "руская душа", чыю загадкавасць аднолькава падзяляюць і беларусы, і ўкраінцы, і палякі. А сам Міхаіл Чэхаў? Першы раз (ай, сорамна як) у Англіі паглядзеў шэраг фільмаў з ягоным удзелам: фільмы гэтыя мусілі б быць у нашых універсітэцкіх і акадэмічных фільматэках, каб на іх студэнты вучыліся. Але ж геніяльны артыст быў вельмі хворы на манію ганення, замахваўся на самагубства, дый здолеў трагічны досвед душы аддаць мастацтву!

Іншая справа — пакуль што наша прафесія нас нават не корміць. Я пацікавіўся, колькі каштуе ў Лондане тэатральны білет: ад 15 да 40 фунтаў стэрлінгаў. Сведчанне не апошняга становішча тэатра ў грамадстве. Пустых тэатраў там няма, іх ніхто не падтрымлівае. Пэўна, у кожным беларускім тэатры ёсць адзін-два спектаклі, на якіх зала не пустое. Ці заўсёды ў гэтай пустэчы вінаватыя акцёры? Але што трэба зрабіць, каб акцёры не зараблялі на жыццё абы-чым? Каб лепш займаліся спектаклямі? Бо, калі так раскідаешся, прафесійна расці немагчыма.

Запісала Жана ЛАШКЕВІЧ

СТУДЫЯ ТВОРЧАЙ СВАБОДЫ

У мінскім Палацы моладзі адкрылася выстава навучэнцаў дзіцячай студыі выяўленчага мастацтва Рышарда Мая. Гэты вядомы мастак працуе з дзецьмі больш за 25 год. Мноства твораў вучняў гэтай адной з лепшых у Мінску студый неаднаразова ўдзельнічалі ў прэстыжных выставах у розных краінах свету. Але, напэўна, яшчэ большага поспеху педагог дасягнуў у развіцці асобы кожнага са сваіх навучэнцаў.

У гэтай студыі заўсёды пануе атмасфера амаль бязмежнай творчай свабоды і ўзаемнага даверу паміж майстрам і вучнямі. Рышард Май не вучыць дзяцей асновам "правільнага" малявання, куды больш каштоўнай ён лічыць здольнасць чалавека — хай сабе і маленькага — застацца сабой пад час вырашэння складанай эстэтычнай або жыццёвай праблемы. Мастаком чалавека робяць не прафесійныя навыкі, а максімальна развітая здольнасць да самавыяўлення. Вельмі важна таму не перашкаджаць дзіцяці бачыць свет па-свойму і класці фарбы на паперу па ўласным разуменні. Толькі свабодны, раскаваны чалавек, мяркуе Рышард Май, з павагай і адказнасцю ставіцца як да ўласнага таленту, так і да іншых людзей, да прыроды і ўвогуле да свету, у якім выпала жыць. І гэтая ж думка прыходзіць на розум, калі глядзіш на малюнкі, створаныя ягонымі вучнямі.

Н. К.

На здымках: пад час адкрыцця выставы; кіраўнік студыі Рышард Май

Фота А. МАЦЮША.

СПРАВЫ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ...

Вынікі дзейнасці Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі за два гады падведзены на яе справаздачна-выбарчай канферэнцыі. Унесены некаторыя змены ў статут ББА. Вялася гаворка аб стварэнні прафесійнага часопіса бібліятэчных работнікаў Рэспублікі Беларусь, закраналіся пытанні фінансавання гэтага выдання.

Прэзідэнтам асацыяцыі выбрана дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Г. Алейнік, віцэ-прэзідэнтам — дырэктар Беларускай сельскагаспадарчай бібліятэкі У. Голубеў. Адказным сакратаром асацыяцыі стала намеснік дырэктара гэтай жа бібліятэкі А. Гафт. Ганаровым членам рады выбраны першы прэзідэнт асацыяцыі прафесар Беларускага універсітэта культуры В. Лявончыкаў.

Музыка

«ПЯЮЧЫ ГАРБУН» У НАМАГАННЯХ ВЫПРАСТАЦЦА,

ці НАТАТКІ ПРАФЕСІЙНАГА ДЫЛЕТАНТА

"Трагедыя блазна? Ці — выкрыццё пачварнага духу?" — так назваў пісьменнік Б. Бур'ян свае "пытанні дылетанта з глядзельнай залы". Публікацыя была ў "ЛіМе" 19.08.84 г. з нагоды прэм'еры оперы "Рыгалета" і ў новым сезоне атрымала нечаканы рэзананс...

Прэм'ера прайшла, опера з'ехала на гастролі, мы — засталіся. Зразумела ж, у Іспаніі добра, а ў нас — не вельмі, бо холадна; толькі, на шчасце, — не ў тэатры, бо ўжо, дзякуй Богу, набіраецца другі склад аркестра, і падчас адсутнасці "галоўных сіл" горад не застаецца без нічога. І, між іншым, публіка гэта ацаніла, і таму ў глядзельнай зале заўсёды цёпла, часам нават і душна.

Што ж, прыемна жыць радасцямі сённяшняга дня. Ды трэба, аднак, паразважаць і над мінулым, і над будучыняй. Хаця б — з нагоды апошняй прэм'еры мінулага сезона: "Рыгалета" ў пастаноўцы Ю. Аляксандрава. Здавалася б, няма й спрэчкі: гэта — спектакль-падзея, надзвычайная для нашага тэатральнага асяроддзя. Але — ці ж наканавана яму доўгае жыццё? Што застанецца ад яго ў памяці? Якімі ідэямі, з яго народжанымі, аплодніцца развіццё беларускае оперы? Няўжо так і абмяжуемся двума слоўкамі пра тое, ці добры, ці злы чалавек гэты Рыгалета, — у дадатак да традыцыйнай раздачы кампліментаў?

Зразумела, гэткае пытанне, як маральныя якасці вышэйпамянёнага Рыгалета, заслугоўвае мо нават і рэферэндуму, бо ад самога Вердзі можна даведацца толькі пра тое, што ён спачуваў свайму герою, і гэта выключала саму неабходнасць старонняй адзнакі. Рэжысёр Ю. Аляксандраў мае поўнае права на неспачуванне, калі за ім стаіць светапогляд і канцэпцыя, яскрава і пераканаўча ўцелясненая сродкамі музычнага тэатра: рэжысёр і толькі рэжысёр бярэ на сябе адказнасць. Калі ж нам, услед за А. Ф. Лосевым (які пісаў, урэшце, пра "Травіяту") у музыцы Вердзі мроіцца боскае ўсёдараванне, — мы мусім ганіць атэізм... Зрэшты, канцэпцыя, пабудаваная на "не-спачуванні" ды атэізме, не перастане быць сапраўды мастацкай канцэпцыяй, а толькі запатрабуе ад нас пэўных дадатковых высілкаў разумення. Бо калі й мае рацыю Лідзія Гінзбург, сцвярджаючы, што не бясконцая прастора разумення мастацкага твора, бо бясконцая толькі прастора яго неразумення, дык усё ж мяжа паміж абедзвюма прасторамі ці то невідочная, ці то празрыстая, — у кожным разе амаль няўлоўная для ўспрымання. Ці возьмем на сябе адвагу ставіць дзесьці тут памежныя слупы?

Пагодзімся ж на тым, што рэжысёр мае поўнае права на таленавітае аўтарскае прачытанне, і зададзім больш плённыя пытанні. Напрыклад, што ёсць гэты спектакль для лёсу нашага тэатра? Ці станецца ён эпізадычнай з'яваю — ці мо распачне сабою шэраг падобных? А магчыма, яго наканаванне — паказаць беларускай оперы нейкі шлях "ад процілеглага"? Адказы залежаць, на мой погляд, ад таго, ці спрыяе мастацкі напрамак, у рэчышчы якога апынуўся спектакль "Рыгалета", раскрыццю ўласнага патэнцыялу тэатра, ці ж, наадварот, прымушае ахвяраваць відавочнымі перавагамі дзеля рэжысёрскага самавыяўлення або малаўразумелай тэндэнцыі?

А ўвогуле: навошта тэатр выбірае "Рыгалета"? З чыстага жадання трупы ажыццявіць пастаноўку менавіта гэтай оперы — ці паводле жадання замежнага працадаўцы, якому з ягонай далечыні нязручна вывучаць магчымасці тэатра і які зробіць шкоду нават насуперак добрым намерам, паставіўшы тэатр у зневажальныя ўмовы? Ці, можа, новая пастаноўка надарылася таму, што камусьці раптам успала на думку па кроплі выціскаць ці з сябе, ці з публікі небараку Рыгалета?

З сябе — мабыць, і трэба. Тэатр, гэты "пяючы гарбун" (між іншым, гэтак сам Вердзі сказаў пра Рыгалета) мусіць, нарэшце, выпрастацца ды выгнаць са свайго жыцця ўсё, што прыгнятае творчыя індывідуальнасці асобных артыстаў і тэатра ў цэлым: усё, што згінае да зямлі ды замінае многім і многім нашым талентам разгарнуцца на поўную моц; усё, што зневажае годнасць спевакоў і калечыць, разам з галасамі, іхнія лёсы, веру ў сябе і ў Госпада Бога. А зрэшты, ці здатны ён наогул выпрастацца, гэты "гарбун", — калі ён упарта адмаўляецца ад лячэння, замест таго займаючыся, у лепшым выпадку, самавыкрыццём?

Між тым, тут узнікае й нейкая этычная праблема. Ці наогул варта выносіць на публіку спектакль, які з'яўляецца — паводле трапнага выслоўя аднаго са спевакоў — бліскучай пародыяй на тэатральныя звычаі? Пры чым тут публіка, і ці варта разбураць чароўную "чацвёртую сцяну", што аддзяляе сцэну ад залы? Акрамя таго, за гэткім самавыкрыццём бачны аж надта празрысты ківок: "І вы, што сядзіце ў зале, — гэткія ж самыя, як мы: прыніжаныя, гарбатыя". Рацыя ў гэтым, можа, і ёсць, але ж ці ёсць маральнае права, і ці да твару оперы — браць на сябе ролю "калектыўнага прапагандыста і агітатара"? Нарэшце, гэта ўжо было, дый не па тое глядач прыходзіць у оперу...

А тады — навошта? Так ці інакш, мы сутыкаемся з пытаннем наконт вышэйшага прызначэння опернага мастацтва і яго абавязку перад гледачом. Ці магчыма звесці яго да рангу "асноўнага пытання філасофіі оперы": **што** першаснае — тэатр або музыка? З майго пункту гледжання, гэтае няслушнае супрацьпастаўленне (накшталт "лепей быць здаровым, ды багатым") якраз і піхае на шлях памылкова зразуметага сінтэзу ці няплённага пошуку ідэальнаіснуючага "спевака-акцёра", спевака-супермена, вечна юнага і зграбнага, як таполя, — пры ўсіх вакальных годнасцях.

Калі ж гаварыць пра прызначэнне оперы не з пункту гледжання акцёраў, рэжысёраў, а зыходзячы з інтарэсаў тых, дзеля каго опера існуе, — тут высвятляецца, што гэта нікога не цікавіць або цікавіць толькі ў "касавым сэнсе". Дастаткова нагадаць, што феномен нарастаючага ў апошнія гады глядацкага поспеху беларускай оперы дагэтуль так і не дачакаўся сацыялагічнага асвятлення. Я ж дазволю сабе выказаць меркаванне, што ў оперы перш за ўсё шукаюць радасці. Крыніцаю яе можа стацца сустрэча са знаёмай мелодыяй ці з упадабаным артыстам — а можа, й штось іншае: напрыклад, захапленне недасягальным вакальным майстэрствам ці "проста" асалода ад прыгажосці, пра якую сёння калі й гавораць, дык больш з пагардаю...

Опера павінна задаволіць глядацкую патрэбу ў радасці. Опера павінна адказаць любоўю на любоў — у гэтым яе спрадвечнае прызначэнне, — якое, дарэчы, не толькі не супярэчыць унутраным патрэбам самога тэатра, але ж мае на ўвазе выпрастанне, росквіт, разгортванне ягоных сіл.

Вядома, у сваёй спецыфічнасці мастацтва оперы ёсць перш за ўсё мастацтва выразных спеваў: у іншым разе яна была б толькі "дрэннай драмай". Ці не таму рэжысёрамі рабіліся буйныя музыканты: Дж. К. Меноцці, Караян? І, дарэчы, іх мастацкая ідэалогія не дужа адрознівалася ад опернай ідэалогіі тытанаў сучаснай рэжысуры — Л. Вісконці, Ф. Дзэфірэлі, Ж.-П. Панэля, якія нават і ў найбольш вытанчаных сваіх пастаноўках адводзяць тэатральным сродкам выразнасці дапаможную ролю тлумачэння, што дапамагае зразумець "прычыну" пачуцця, "схаванага" за спевам.

Але ж ці не ў тым самая сутнасць спеваў, што яны мусяць быць прыгожымі, вабіць публіку і несці ёй найвялікшую асалоду? У процілеглым выпадку публіцы лепей ісці ў драму. І яшчэ. Цалкам бясспрэчна, што менавіта вакал робіць са спевака нейкі аб'ект глядацкай любові і захаплення. Таму, калі публіка прагне аўтографаў і саўдзелу ў лёсе сваіх абраннікаў, — справа тэатра выпеставаць "зорак", здатных задаволіць глядацкую прагу. А для гэтага тэатру неабходна палюбіць, нарэшце, сваіх спевакоў, убачыць у іхніх галасах свой адзіны скарб. А палюбіўшы, падбіраць рэпертуар з такім разлікам, каб ён служыў найвыгоднай акаймоўкай — а тым часам і агранкай — для кожнага дыямента вакальнага таленту.

У гэтым сэнсе — ці ёсць падставы лічыць, што (у цэлым удалая і цікавая) пастаноўка "Рыгалета" набліжае беларускую оперу да ажыццяўлення яе наканаванасці? Ці выпрастаўся наш "гарбун" хоць на дзюйм, ці задыхаў свежым паветрам?

На мой погляд, гэтую задачу спектакль не выканаў, пры ўсіх яго неаспрэчных вартасцях. Не выканаў галоўным чынам таму, што ў спектаклі, якім яго задумаў рэжысёр — таленавіты пецярбуржац Ю. Аляксандраў, — не складваецца напраўдзе "зоркавы" вакальны ансамбль. Гэта было відавочна ўжо ў час першых чатырох прэм'ерных паказаў, якія былі асвечаны прысутнасцю і "аднаасобным аўтарствам" самога рэжысёра і — насуперак сцвярджэнню Б. Бур'яна — былі з музычнага пункту гледжання адзін горшы за другі.

Аднак менавіта на пятым, "удалым" паказе, які надарыўся неяк выпадкова (замест абвешчанага "Балю-маскарада") і неяк набраў мінімальна неабходную музычную вышыню (ці ж не таму, дарэчы, што на сцэне ўжо не баяліся адсутнага рэжысёрскага вока і цалкам аддаліся спевам?), сталася цалкам відавочна, што ажыццёўлены рэжысёрам падбор артыстаў (у тым ліку і размеркаванне на "першы" і "другі" склад) не забяспечвае належнай якасці гучання. Гэта памылка прынцыповая, бо паправіць яе немагчыма, не парушыўшы задуму аўтара сцэнічнай версіі.

Так, тэнар, які ў галасавым сэнсе як нельга лепш пасуе да партыі Герцага, акурат

аказваецца занадта ўкормленым для сукенкі ў стылі Барыса Маісеева, а тая ж сукенка акурат аказваецца рэвеляцыяй і адметнасцю гэтага вобраза. Між тым, тэнар, які годна выглядае ў той самай сукенцы, выступае ў родным тэатры гады ў рады — ужо не кажучы пра тое, што працяглае знаходжанне ў "далёкім замежжы" не лепшым чынам паўплывала на ягоны вакал. Аналагічная па сутнасці сітуацыя і з сапрана. Паводле меркаванняў рэжысёра, ідэальная Джыльда ў тэатры ёсць, — я ж, нягледзячы на ўсе намаганні, гэтую думку падзяліць не магла, пакуль у тым самым пятым спектаклі не выйшла непараўнальная Тамара Глаголева. Але ж не сакрэт, што гэтая цудоўная спявачка стала хварэе — ці ж не таму, што выступае ў партыі Аіды, якая зусім не пасуе да яе голасу (сёй-той кажа, што з ейным ультралірычным, хаця і "цёмным" па афарбоўцы голасам, нельга спяваць нават Чыа-Чыа-сан!)?

Гэта — Джыльда. Ды нават з галоўным героем усё складваецца няпроста! Размова ідзе, зразумела, пра непараўнальнага Аркадзя Саўчанку, чый Рыгалета мяне як глядачку сапраўды ўзрушвае, а рэжысёру — зыходзячы з ягоных тэндэнцый — не падабаецца. І рэжысёр дакарае спевака менавіта за тое, што ўражвае мяне: за рэдкасную выразнасць, пластычнасць і кранальнасць інтанацыі!

Усё гэта, на мой погляд, сведчыць пра тое, што рэжысёрская задума ўзнікла ў беспаветранай прасторы, без апірышча на канкрэтных спевакоў, і ўжо тым больш — без імкнення выявіць і развіць іхнія творчыя індывідуальнасці.

Мала таго, няслушным падаецца сам выбар гэтай рэпертуарнай пазіцыі — калі толькі ён не дыктаваўся вонкавымі абставінамі. Хаця б таму, што дадатковая нагрузка падае на плечы адных і тых жа спевакоў (перш за ўсё — тэнараў), і без таго да знямогі абцяжараных аднатыпным, стандартызаваным "рэпертуарам шэдэўраў": тры оперы Чайкоўскага, дзве — Пучыні, чатыры — Вердзі (а з калейдаскопам "Шэкспірыяны" нават і пяць, ці шэсць, ці сем?). І ледзь не кожны з гэтых спектакляў — "гарбаты", бо ў ім для паўнавартаснага вакальнага ансамбля нікага хранічна не хапае.

І гэта пры тым, што ў Беларускім тэатры (неверагодная рэдкасць!) ёсць поўны склад сапраўдных спевакоў бельканта: сапрана (Тамара Глаголева, Ганна Гур'ева, Ірэна Журко, Вікторыя Курбацкая, Таццяна Цівунова), мецца-сапрана (Таццяна Варапай, Наталля Руднева), тэнар (Рыгор Палішчук, Сяргей Франкоўскі), барытон (Міхась Жылюк, Уладзімір Пятроў, Віктар Скорабагатаў), бас (Алег Гардынец, Аляксандр Кеда, Віктар Чарнабаеў) — і, напэўна ж, хтонебудзь яшчэ, каго я, па няведанні, не згадала, за што ласкава прашу прабачэння. І пры тым, што ва ўсім свеце оперы бельканта (Расіні, Беліні, Даніцэцці, "італьянскі" Моцарт) карыстаюцца сёння небывалым поспехам! (Не думаю, што наш глядач быў бы ў гэтым сэнсе выключэннем).

Акрамя таго, зусім "белькантавымі" паводле свайго характару з'яўляюцца оперы С. Манюшкі, якія (вось сорам!) аж да гэтага часу не вярнуліся на яго радзіму! А яны ж непараўнальна гучаць на беларускай мове, сёння іх фрагменты цудоўна агучваюцца нашымі артыстамі (дастаткова паслухаць "Думку Ёнтака" ў выкананні Р. Палішчука)! Да таго ж, пры пастаноўцы гэтых опер не зробіць праблему ані таўшчыня тэнара, ані буйны нос сапрана. Дзякуючы гаючай моцы праўдзівай опернай умоўнасці, нікога не давядзецца запраторваць у расколіны кардонных скал — як здарылася нядаўна ў Паваронці ў партыі Радамэса; не запатрабуецца ні асаблівых пастановачных сродкаў, ні значных матэрыяльных выдаткаў. Між тым, нашыя "зоркі" бельканта напэўна ж набралі б уласцівага ім бляску ў сузор'і роўных, чаму зарукай — нядаўнія паказы "Севільскага цырульніка".

Чаму ж гэткі, мо найбольш лагічны шлях развіцця (па якім, між іншым, даволі даўно і з поспехам крочыць знаны маскоўскі калектыў Я. Колабава) не стаўся дасюль самавідавочным?

На гэтае пытанне няма адказу. Як і на пытанне, калі ж, нарэшце, выпрастаецца наш "пяючы гарбун" — дайце веры, адна з нешматлікіх лепшых оперных труп у Еўропе?

Юлія АНДРЭЕВА

Фота С. ЛАБАНДЗІЕЎСКАГА

АД БАЦЬКІ — СЫНУ

Славіцца сваім ганчарным майстэрствам старажытны Івянец. І немалая заслуга ў гэтым мастакоў-кераміста́ў, якія з рук у рукі перадаюць свой вопыт і талент маладому пакаленню.

Больш за 25 гадоў працуе на фабрыцы мастацкай кераміці Пётр Скрыпка. Колькі дзівосных прыгожых твораў стварыў ён за гэтыя гады. Цяпер Пётр Леўкавіч — галоўны мастак прадпрыемства. А зусім нядаўна яго сын Уладзімір, закончыўшы Беларускі ліцэй мастацтваў, прыйшоў працаваць да бацькі на фабрыку. Разам з сынам Пётр Леўкавіч ажыццяўляў ужо нямала творчых задум.

На здымках: мастакі бацька і сын Скрыпкі; чайны набор, што выпускае прадпрыемства.

Фота Аркадзя НІКАЛАЕВА, БЕЛІНФАРМ

КАБ НАБЛІЖАЛІСЯ СТАГОДДЗІ

"Рэха стагоддзяў" — так называецца інфармацыйны бюлетэнь, выпуск якога распачало агенцтва "Геронт-А" Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны сумесна з выдавецкім цэнтрам "Бацькаўшчына". Гэта бібліяграфічны даведнік, што будзе выходзіць раз у тры месяцы і змяшчаць звесткі пра публікацыі, што з'явіліся ў беларускім друку па пытаннях гісторыі Беларусі, краязнаўства, археалогіі, этнаграфіі — адным словам, усяго таго, што мае самае непасрэднае дачыненне да мінулага Бацькаўшчыны.

Нядаўна з'явіўся першы выпуск "РС", які, безумоўна, дае ўяўленне аб характары новага выдання. Згадваюцца публікацыі, што часава ахопліваюць першы квартал 1994 года.

Бюлетэнь складаецца з дзвюх частак. Першая падзелена на раздзелы "Гісторыя Беларусі", "Гістарычныя персаналіі" і "Дапаможныя гістарычныя дысцыпліны". Для зручнасці карыстання, публікацыі называюцца ў алфавітным парадку па прозвішчах аўтараў. Змешчаны таксама аўтарскі паказальнік.

Другі раздзел называецца "Што чытаем?" Гэтым разам Зм. Яцкевіч вельмі падрабязна расказвае пра першы абласны гісторыка-краязнаўчы часопіс на Беларусі "Магілёўская даўніна", які выйшаў сёлета ў сакавіку.

У прадмове рэдакцыйны савет выдання гаворыць: "Будзем удзячны за ўсе крытычныя заўвагі, пажаданні, прапановы". Дзве недакладнасці адразу кідаюцца ў вочы. Часопіс "Спадчына" выходзіць не раз у тры месяцы, а раз у два... Пад нумарам "23" у першым раздзеле называецца зборнік "З гісторыяй на "Вы". Называецца яго трэці выпуск, але гаворка ідзе пра другі.

І ЖОРСТКІ САВЕЦКІ РЭАЛІЗМ...

ПАСТСКРЫПТУМ ДА ФЕСТЫВАЛЮ ПОСТСАВЕЦКАГА КІНО «ЛІСТАПАД-94»

Першы тыдзень лістапада выдаўся ўдалым для тутэйшых кінаманаў. Дзякуючы намаганням кінематаграфічных колаў, спонсарам і персанальна С. Арцімовічу, сучаснае "нябачнае кіно" атрымала карт-бланш на мінскім экране. Восем дзён запар у кінатэатрах "Кастрычнік" і "Цэнтральны" публіка ўшаноўвала аншлагамі постсавецкае кіно.

Відавочна, няма сэнсу даваць хроніку кінамарафона — дзень за днём, фільм за фільмам. На гэты час фестывальная гарачая лінія ўжо прастыла. Журы вызначыла рэйтынг фільмаў. Застаецца толькі пасляслоўе.

У літаральным сэнсе "Лістапад-94" не быў фестывалем, бо шэраг заяўленых карцін атрымаў прызнанне на розных папярэдніх кінафорумах. А ў Мінску адбылася свайго роду рэтраспектыва 14 стужак, зробленых былымі савецкімі рэжысёрамі за апошнія тры-чатыры гады.

Безумоўна, праграма кінаагляду вабіла імёнамі: А. Іяселіяні, А. Канчалоўскі, К. Муратава, Н. Міхалкоў, В. Жалакявічус, В. Тадароўскі, М. Пташук. Паміж імі размеркаваліся менш знакамітыя аўтары.

Фільм А. Іяселіяні "...І стала святло" (1989) адметна вылучыўся з агульнага кінаспісу. Грузінскі рэжысёр прыемна здзівіў мастацкай прадказальнасцю, захаваўшы адметную рысу свайго стылю: немітуслівасць, нямарнасць. Яго героі не трапляюць у надзвычайныя сітуацыі. Іх штодзённы побыт становіцца ў Іяселіяні грунтам для мастацкай тыпізацыі і філасофскага абагульнення. Рытм яго выкладання роўны, камера (разам з аўтарам) далікатна захоўвае адцягненую пазіцыю назіральніка.

"...І стала святло" — гісторыя аб тым, што людзі ўсюды і заўсёды людзі. Хоць персанажы фільма выглядам розняцца з намі (цёмнаскурыя абарыгены), аднак іх экранны жыццяпіс цалкам супадае са стэрэатыпамі існавання любога чалавека: дробныя клопаты, выпадковыя сустрэчы, сваркі і плёткі, механічныя паводзіны. Тое, што зазвычай здаецца нязначным, не галоўным, у Іяселіяні набывае касмічны сэнс. Абапіраючыся на біблейскі матыў неабвержнасці светабудовы (дарэчы, назва фільма наўпрост цытуе Біблію), рэжысёр са спакойнай мудрасцю прымае раз і назаўжды ўсталяваны ход падзей, стан рэчаў. Спакайнейшай, мудрэйшай карціны на фестывалі не было. Усе іншыя фільмы аб'яднаў жорсткі савецкі рэалізм.

Па якасці вобразных абагульненняў (толькі не ў маштабе цывілізацыі, а на ўзроўні рэгіёна) вылучыліся, на мой погляд, два фільмы — "Дзеці чыгунных багоў" і "Захапленні".

Венгерскі рэжысёр Т. Тот зрабіў таленавіты фільм пра "рускі характар". Пазбягаючы грубасткай літаральнасці і кіслай канкрэтыкі, Т. Тот стварае адкрыта сімвалічную карціну "Дзеці чыгунных багоў" (1993) як своеасаблівы экранны аналаг "Катлавана". Неўтаймоўная бязмежная прорва з'яўляецца цэнтральным вобразам фільма. Рукатворныя металічныя каркасы і прыродная стыхія (вада, агонь, снег) аб'ядноўваюцца ў адзіны варожы і, адначасова, такі родны нам свет, дзе нельга разняволіцца, бо трэба пераадольваць Нешта. Героі фільма, а дакладней — тыпажы, маскі, — таксама арганічныя "малекулы" ўсё той жа пагрозлівай рэчаіснасці. Сіндром барацьбы, паталагічная неабходнасць ісці заўсёды напралом, асалода самакатавання даследуюцца рэжысёрам у манеры манументальнага абсурду. Абсурду, які ў фільме складае самую сутнасць быцця. Выяўленчы аскетызм карціны ўзмацняе абстрактную прыроду вобразаў, падкрэслівае веліч... гераічнага ідыятызму.

Фільм "Захапленні" (1994) К. Муратавай таксама можна вымяраць па шкале абсурду. Але гэта, так бы мовіць, ціхі, камерны абсурд. Іпадром, жакеі, пляж, медсястра, фатограф, цыркавая артыстка і інш. суадносяцца паміж сабой як жанглёрскія атрыбуты (кеглі, мячы, абручы). Аднак, на жаль, не валодае К. Муратава элегантнай каардынацыяй жанглёра. Таму яе фільм не заварожвае. Хутчэй наадварот. Персанажы выглядаюць як фантомы, ды і "цела" фільма нагадвае (прабачце!) прэпарыраваны труп. Што гэта? Неабарачальны, усеагульны распад сувязей — інтэлектуальных, экзістэнцыяльных, духоўных? Ці стракаты эклектызм у якасці арганізуючага мастацкага прыёму?

Не заўсёды імя майстра гарантуе адпаведны эстэтычны маштаб яго чарговага твора. На мінскім фестывалі гэта прадэманстравалі браты Міхалковы.

"Курачка Раба" (1994) А. (Міхалкова) Канчалоўскага не атрымалася цэльнай па жанры, што здзіўляе, бо рэжысёр мае пэўны вопыт працы ў Галівудзе. У сваёй стужцы А. Канчалоўскі імкнецца ўсталяваць каноны гратэску. І палова фільма пераважна вытрымана ў ім. Удалы, напрыклад, дыялог Курыцы і гаспадыні Асі, эпізод "грошы без паху". Аднак з ходам дзеяння фільм губляе тэмпарытм, пачашчаюцца стылявыя збоі. Акцёры пачынаюць іграць усё ўсур'ёз, пад "праўду жыцця". Нават абаяльная Іна Чурыкава, якая выконвае галоўную ролю, не пазбягае гэтай спакусы. А ўслед і рэжысёр абясцэньвае паўторамі ўласныя эксцэнтрычныя прыёмы (у прыватнасці, кінатрук фазіраванага руху персанажаў). Увядзенне А. Канчалоўскім у карціну цытат з папярэдняй стужкі — "Гісторыя Асі Клячкінай..." — таксама нявыгаднае, бо адцяняе калажную прыроду фільма.

Яшчэ больш заблытаная новая кінаработа Н. Міхалкова "Ганна. Ад 6 да 18" (1994). Гэтая спроба дакументальнага разважання яўна распадаецца на тры асобныя тэмы:

— палітычная гісторыя (СССР)-Расіі дванаццаці апошніх гадоў у хранікальных эпізодах;

— дзяцінства Ілюшы Абломава ў кінаэцамалёўках з іграваога фільма Н. Міхалкова "Некалькі дзён з жыцця І. І. Абломава";

— І, нарэшце, сама Ганна (дачка рэжысёра) у кінаназіраннях розных гадоў.

Супастаўленне Ганны з персанажам Ілюшам Абломавым выглядае штучным, некарэктным, бо хлопчык абсалютна выключаны з канкрэтнага гістарычнага кантэксту, а дзяўчынка, наадварот, "забарыкадавана" ценямі сацыяльных рэалій. Гэта — звонку. Знутры гераіня Ганна пастаўлена ва ўмовы жорсткага ўціску з боку бацькі. Ён быццам экзаменуе дачку, строгім тонам патрабуючы ад яе адказаў на пытанні. Дзяўчынка, адпаведна, баіцца гаварыць (раптам не тое!). І відавочнай становіцца каласальная дыстанцыя паміж двума роднымі людзьмі.

Здаецца, лепш рабіць падобнае кіно лірычным, мяккім, па-дамашняму далікатным...

У праграме фестывалю яшчэ два фільмы, зусім розныя па стылістыцы, рамяству сышліся на ўзроўні цікавых мастацкіх ідэй.

Кінаспроба А. Кавалава "Сады скарпіёна" (1991) — рэжысёрскі дэбют крытыка. У літаральным сэнсе гэта — мантажны фільм, для якога не было знята ніводнага кадра. А. Кавалаў сачыніў сваю аптычную пазму (так аўтар вызначыў жанр твора) незвычайным спосабам. Выбраўшы шматлікія кадры, эпізоды з разнастайных навукова-папулярных, хранікальных, іграваых карцін, ён ператасаваў іх у адпаведнасці са сваёй мастацкай логікай. Але не толькі. Рэжысёр даў новае значэнне кожнаму фрагменту, пераўтварыў "іншародцаў" у катэгорыі ўласнага мыслення і стварыў адметную мастацкую субстанцыю.

Аўтары фільма "Над цьмянай вадой" (1993) — сцэнарыст В. Тадароўскі, рэжысёр Д. Месхіеў — імкнуцца стварыць вобраз пакалення шасцідзесятнікаў... тыповымі сродкамі растабуіраванага кінематографа 80-х. Вобразныя паралелі, змест эпізодаў, кплівыя намёкі, пародыі на хрэстаматыйныя фільмы, — ўсё гэта... хутчэй угадваецца, чым увасабляецца ў экранным пасланні сыноў да бацькоў. Дарэчы, прысвячэнне бацькам заканчвае карціну...

Рэжысёр Т. Баблуані таксама прысвяціў бацьку свой кінатвор. Яго фільм "Сонца для тых, хто не спіць" (1992) пакінуў моцнае эмацыйнае ўражанне, бо хваля суперажывання нібы памкнула праз межы экрана. Пранізлівая кінарацыя Т. Баблуані — гэта прызнанне ў любові чалавеку. Чалавеку, які шукае дарогу да Храма. Простая і светлая ідэя — як і сама карціна.

Наталля АГАФОНАВА

У МЁРТВЫ СЕЗОН НА КУБЕ

(Пачатак на стар. 5)

І мы праехалі, гэтак, што аж вецер зашумеў у вушах — кубінскія коні інаходцы, ехаць на іх лёгка і прыемна. Наша забыццё і палёт перапыніў трэці хлапчук, які заставаўся пры сваім кані. З яго гаворкі мы зразумелі мала слоў, але сэнс дайшоў: дзеці турбаваліся, што "турысціка" ўпадзе і скалечыцца, тады і ім бяда будзе. За клопат і ён атрымаў ад нас пачак цыгарэт. А калі вярталіся ад коней да гульбішча, дзе ва ўсю валадарылі танцы, убачылі, што ў сметніцы, куды выкінулі астаткі з нашага святочнага стала, чародкай корпаліся дзеткі — выбіралі тое, што яшчэ можна было з'есці...

Напісаў гэтыя радкі і чамусьці ўспомніў нашага сённяшняга хлапчука ў былой "Катлетнай" ля вакзала. Гадоў дзесяці, бледнатвары, акуратна адзеты ў куртачку з крыху караткаватымі рукавамі, ён падышоў і спытаўся ў буфетчыцы, ці ёсць якая работа. Ён гатовы дапамагчы. Тая сумна і спачувальна адказала, што такое работы няма, і хлопчык пакорліва адступіў убок. Мужчына ў скуранцы, які купляў з сабой бутэльку нейкага імпартнага лікёру і пакет цукерак, запытальна зірнуў на буфетчыцу.

— Якая ў мяне работа? А ім шакаладку хочацца.

За шклом прылаўка і сапраўды быў выкладзены поўны набор імпартных шакаладак, якімі нашых дзяцей штодня закормлівае тэлебачанне.

Мужчына, не задумваючыся, працягнуў хлапчуку грошы:

— На, купі шакаладку.

Хлопчык злёгку сцяўся, прытуліўся да сцяны, пакруціў галавой:

— Не, мне так не трэба...

— Кінь ты, даюць — бяры...

— Не,— хлапчук перасіліў сябе і адступіў на крок да дзвярэй.

— Бач ты!..

Мужчыну зачапіла за жывое хлапчукоўская ганарлівасць, ён падцяў губы, але перасіліў сябе.

— Палічыце. І аддайце яму... Потым адробіць, — сказаў ён буфетчыцы, каб пачуў і хлопчык.

Наіўная дарослая хітрасць перамагла. Хлопчык забраў шакаладку "за тое, што адробіць". А, можа, і не хітрасць перамагла, зразумеў ён усё, але не змог перасіліць сваё дзіцячае жаданне і запомніць гэту шакаладку на ўсё жыццё.

Нас было трое дарослых у пустым буфеце, але, здаецца, усе мы адчулі тую нябачную і непераадольную заслону ў дзіцячым позірку, якой яна ўжо адмежавана ад нас і за якую зазірнуць нам не дадзена.

Роўна дзесяць гадоў аддзяляе тое святкаванне 67-годдзя Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі на Кубе ад сёлетняй восені на Беларусі, але вось жа ўсплылі ў памяці найперш тыя ўражанні і адчуванні, якія адклаліся ў свядомасці загадкаю. Ці толькі таму, што на двары восень, "мёртвы сезон"? Ці з-за таго, што калі гаворыш нават з блізкімі людзьмі, раптам, пры ўсёй шчырасці ў словах, бачыш, што вочы іхнія глядзяць на цябе праз нябачную, але непераадольную заслону, за якой жыве сваё — запаветнае, упартае, непераадольнае... Няўжо чаканне некага вялікага і багатага, ад каго, як па волі Божай, усяго усім хопіць, тое чаканне — цяпер працінае здагадка, — якое хавалася ў позірку людзей з далёкага заакіянскага вострава Свабоды?

Алесь ЧОБАТ

АРМІЯ КРАЁВА НА БЕЛАРУСІ

АРМІЯ КРАЁВА — польская падпольная ваенізаваная арганізацыя, якая ў гады II Сусветнай вайны дзейнічала на тэрыторыі Польшчы і падпарадкоўвалася польскаму эміграцыйнаму ўраду ў Лондане. Створана 14 лютага 1942 года і дзейнічала фармальна да 9 студзеня 1945 года. Але папярэднік АК "Саюз узброенай барацьбы" ("Звёнзэк валькі збройнэй") дзейнічаў з канца 1939 года, а асобныя арганізацыі і баявыя групы АК дзейнічалі на тэрыторыі Польшчы і СССР да пачатку 50-х гадоў.

Пасля 30 кастрычніка 1939 года да БССР была далучана Заходняя Беларусь — 4 млн. 815 тыс. чалавек; 98,4 тыс. кв. км, — якая да вайны ўваходзіла ў склад Польшчы. На большай частцы гэтай тэрыторыі ў 1939—56 гг. і дзейнічала Армія Краёва.

I. ЛЕТА 1941-га—ЛЕТА 1942-га.

З 17 верасня 1939 года да 22 чэрвеня 1941 Заходняя Беларусь разглядалася Масквой як асобая зона: фактычна існавала "даваенная мяжа", для пераезду якой патрабаваўся дазвол, "часовыя ўпраўленні" пасля выбараў у Народны Сход былі ліквідаваныя і замененыя сістэмай Саветаў пад кантолем ВКП(б) — усяго 5 абласцей, 101 раён. Мясцовыя жыхары, нават камуністы і спачуваючыя, дапускаліся ў адміністрацыю вельмі абмежавана — ад тых часоў усталяваўся тэрмін **"васточнік"**; чалавек, які прысланы "кіраваць" з БССР ці з Расіі. "Сацыялістычныя пераўтварэнні" — нацыяналізацыя зямлі і сродкаў вытворчасці і г. д. — і замена польскай адміністрацыі савецкай выглядалі як антыпольскі тэрор. **Па асобных ацэнках, за два гады былі рэпрэсаваны (вывезены на ўсход, забіты ці арыштаваны) каля 300 тыс. чалавек.** Але рэпрэсіі не выклікалі масавага польскага тэрору ў адказ, адзначаны толькі асобныя акцыі палякаў, як напад на Скідзель летам 1940 года і расстрэл савецкіх работнікаў і інш. Польскае падполле да лета 1941 года мела пасіўны характар: хаванне людзей, наладжванне сувязей, разведка і г. д.

З ліпеня 1941 года сітуацыя стала мяняцца. **Па-першае,** у тых мясцінах, дзе савецкі тэрор быў найбольш жорсткі і масавы, насельніцтва ледзь не вітала немцаў, як... **вызваліцеляў**! Пра што сведчыць, напрыклад, рапарт разведкі ЗВЗ-АК з Беласточчыны. **Па-другое,** з цэнтральнай Польшчы і Віленшчыны, ратуючыся ад СС і літоўскіх "шаулісаў", сюды масава ўцякалі палякі. **Па-трэцяе,** першую дапаможную паліцыю і мясцовую адміністрацыю фарміраваў Вермахт, чые афіцэры выходзілі выключна з сіюмінутных патрэб і адбіралі "пацярпелых ад саветаў", лепш адукаваных, ведаючых па-нямецку і маючых адміністрацыйны вопыт — зразумела, што ў выніку даваеннай "санацыі" беларусы раўняцца з палякамі тут не маглі, а таму практычна ўвесь акупацыйны апарат апынуўся ў руках палякаў!

"На Беласточчыне амаль уся адміністрацыя ў руках палякаў. Акупант вяртае на працу тых, хто займаў гэтыя ж месцы да 1939 года...".

"Апарат у Гродна — польскі. 72-асабовая служба парадку выключна з палякаў...".

"У Вілейскім павеце з'явіліся дзіўныя шыльдачкі накшталт "Постэрунэк Польскей Поліцыі Паньствовэй (Рэчы Паспалітай ці Рэйха, якой дзяржавы?! — Аўт.)...".

"На беларускія абшары вяртаюцца польскія землеўладальнікі пад аховай нямецкай жандармерыі. Гэта выклікае канфлікты з сялянамі, у якіх адбіраюць былую панскую, а потым падзеленую калгасную зямлю, інвентар, коней. Пад Лідай дайшло да пратэстаў і нават сутычак. Жандары застрэлілі некалькі дзесяткаў чалавек...".

"Немцы робяць выгляд, быццам "вяртаюць Польшчу", і гэтак распальваюць варожасць паміж палякамі і беларусамі...".

Гэта толькі асобныя вытрымкі з рапартаў контрразведкі СД, падпольнага і акупацыйнага друку, рапартаў АК, мемураў. Зразумела, што палякі выкарысталі сітуацыю і паставілі ў паліцыю і адміністрацыю "сваіх людзей". Але гэта разумелі і немцы. Ужо з восені — гаўляйтэр ГК "Беларусь" В. Кубэ прыступіў у Мінску да выканання абавязкаў у верасні 1941 года — нямецкая адміністрацыя і СД спынілі расстрэлы на месцы на падставе даносаў "гэрр офіцэр, тэн чловек то большэвік!", а нават часам пад расстрэл трапляў сам паклёпнік. 22 кастрычніка распараджэннем В. Кубэ была створана "Беларуская Народная Самапомач" на чале з І. Ермачэнкам. **Нягледзячы на "культурна-гаспадарчы" характар БНС, у значнай ступені яе паўстанне паўплывала на кадравую палітыку акупанта. У тую ж восень І. Ермачэнка атрымаў дазвол фарміраваць беларускую дапаможную паліцыю, пры гэтым немцы забяспечвалі яе зброяй, а вярбоўкай людзей займаўся апарат БНС на месцах.** Усё гэта прывяло да вострай канкурэнцыі ды ўзаемнага вынішчэння служачых немцам палякаў і беларусаў, але істотна падарваць польскі ўплыў у адміністрацыі і паліцыі не ўдалося. Таму з вясны 1942 года СД прыступіла да гэтак званай "Полен-акціон" — чысткі ўсяго апарату ад "польскага падполля". На гэты час прыпадаюць масавыя арышты і расстрэлы палякаў у Навагрудку, Лідзе, Слоніме, Баранавічах. "Полен-акціон" з рознай інтэнсіўнасцю працягвалася да лета 1943 года, калі немцы пачалі граць у "польскія карты". Тут трэба адзначыць, што дамагліся немцы адносна няшмат. Напрыклад, у Слонімскай акрузе за год "вычысцілі" больш тысячы палякаў — і адначасова каля пяцісот чалавек падалі заявы, што яны неправільна "запісаныя палякамі" беларусы... З другога ж боку, нямецкі тэрор даў адмоўны эфект: з лета 1942 года фарміруюцца першыя баявыя атрады АК, часам яны базіруюцца яшчэ на гарады і мястэчкі, знікаючы "до лясу" толькі на час ажыццяўлення канкрэтнай аперацыі, але восенню і зімой 1942/43 гадоў узнікаюць першыя рэгулярныя адзінкі АК. Летам жа 1942 года АК арганізуецца на Беларусі структурна і падзяляецца на чатыры аперацыйныя акругі: Віленская, Беластоцкая, Палеская і Навагрудская.

II. АК І САВЕЦКАЕ ПАДПОЛЛЕ.

Арганізацыя партызанскага руху на Беларусі бярэ пачатак з дырэктывы ЦК КП(б)Б ад 29 чэрвеня 1941 года — немцы былі ўжо ў Мінску. На ўсходняй Беларусі для падпольнай работы было пакінута 6,3 тыс. камуністаў і камсамольцаў, позняй восенню партызанскія атрады налічвалі да 12 тыс. чалавек. Але да вясны 1942 года гэтыя атрады ў асноўным былі ліквідаваныя немцамі альбо часткова перайшлі фронт.

Рэгулярная партызанская вайна пачалася 30 мая 1942 года, калі пры Галоўным Камандаванні Чырвонай Арміі быў арганізаваны Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху, а пазней яго пададдзел Беларускі Штаб Партызанскага Руху на чале адпаведна з першым і другім сакратарамі ЦК КП(б)Б П. Панамарэнкам і П. Калініным. Такім чынам, **Масква адгэтуль разглядала партызан як рэгулярную армію ў тыле ворага** — за два наступныя гады праз лінію фронту перакінулі толькі афіцэраў і інструктараў 13 тысяч чалавек! А яшчэ 20 тыс. аўтаматычнай зброі, 60 тыс. вінтовак, 100 млн. набояў, 400 т выбуховых рэчываў, тысячы мін, сотні гармат і мінамётаў — узбраенне дзесяці (!) пяхотных дывізій.

У канцы 1942 года на тэрыторыі даваеннай БССР дзейнічала 56,5 тыс. партызан, але з іх на тэрыторыі ГК "Беларусь" — толькі 11 тыс. чалавек, пры гэтым большасць пад Мінскам і Барысавам. На Заходняй жа Беларусі, па-за асобнымі невялікімі групамі, савецкіх партызан амаль не было: **калі на Усходзе на 10 тыс. цывільнага насельніцтва было 140—150 партызан, то на Захадзе не больш 20.** І вось з вясны 1942 года СД стала са здзіўленнем адзначаць факты савецка-польскага супрацоўніцтва ў ГК "Беларусь".

Яшчэ 30 ліпеня 1941 года ў Лондане быў падпісаны савецка-польскі ўклад паміж паслом СССР у Вялікабрытаніі І. Майскім і прэм'ерам польскага эміграцыйнага ўрада В. Сікорскім, які прадугледжваў, што **Польшча і СССР знаходзяцца ў становішчы вайны з Германіяй, а таму з'яўляюцца натуральнымі саюзнікамі**; справа ж савецка-польскай граніцы і інш. спрэчныя пытанні мелі быць вырашаны пазней. 3—4 снежня 1941 года ў Маскве адбыліся размовы В. Сікорскага і І. Сталіна — В. Сікорскі падкрэсліў, што граніца 1939 года не можа быць зменена; І. Сталін згадзіўся з тым, што Львоў належыць да Польшчы і што пра граніцы будзем гаварыць, як толькі армія генерала Андэрса пойдзе ў бой, але што СССР хацеў бы пачаць размовы "ад лініі Керзона"...

Такім чынам, на пытанне, каму будзе належаць Заходняя Беларусь, яснага адказу не было. Лондан перадаваў інструкцыі, што з "саветамі" ёсць паразуменне; Масква ж загадвала імкнуцца перацягваць польскія аддзелы непасрэдна пад савецкае аператыўнае камандаванне, а калі не — то не перашкаджаць ім і захоўваць нейтралітэт. **Сам сабе савецкі бок лічыў Заходнюю Беларусь савецкай тэрыторыяй, а польскі — польскай, аднак з прычыны слабасці абодвух партызанак прыблізна да вясны-лета 1943 года да адкрытых сутычак паміж імі не даходзіла.** Хоць і супольныя дзеянні таксама былі эпізадычныя.

Так, у лістападзе 1942 года начальнік Браслаўскага павета Васілеўскі і яго намеснік Кавалеўскі перадалі 2 кулямёты, 7 карабінаў і др. зброю савецкаму артаду "Спартак". Летам і восенню 1942 года адзначана паўтара дзесятка супольных акцый савецкіх і польскіх партызан на нямецкія пастарункі; тады ж вызначаліся "савецкія" і "польскія" вёскі, зоны ўплыву, калідоры і г. д. **Палітыку на месцы рабілі палявыя камандзіры. Несумненна інспіраванай праз Маскву была змена накірунку савецкага тэрору: у СД адзначалі, што прыблізна з мая 1942 года савецкія партызаны знішчалі паліцэйскіх, настаўнікаў, служачых і г. д. беларусаў і ашчаджалі палякаў!** Нагадаем, што працягвалася "Полен-акціон" — і такое рашэнне савецкага камандавання было яўна дэманстрацыйным: вось якія мы, а вось якія немцы... І ўсё ж **апошняя** супольная савецка-польская аперацыя адбылася **ўжо вясной 1943 года** — разгром нямецкага гарнізона ў Жалудку на Шчучыншчыне. Потым наступіў разлад, які перайшоў у адкрытую вайну...

У жніўні 1942 года па патрабаванні англічан з СССР на Бліжні Усход была выведзена 75-тысячная польская армія генерала Андэрса. У красавіку 1943 года, у выніку выйсця на свет расстрэлаў НКВД польскіх афіцэраў у Катыні, былі разарваны савецка-польскія дыпламатычныя адносіны. 4 ліпеня 1943 года ў авіякатастрофе над Гібралтарам загінуў генерал В. Сікорскі.

22 чэрвеня 1943 года пленум ЦК КП(б)Б прыняў пастанову "Аб ваенна-палітычных задачах працы ў заходніх абласцях Беларусі", якую варта прывесці цалкам:

"1. Заходнія вобласці Савецкай Беларусі з'яўляюцца неад'емнай часткай рэспублікі. На тэрыторыі БССР, акупіраванай Германіяй, дапускаецца дзейнасць толькі тых груп, арганізацый і атрадаў, якія кіруюцца інтарэсамі СССР.

2. Існаванне разнастайных арганізацый, якімі кіруюць польскія буржуазна-нацыяналістычныя цэнтры, трэба разглядаць як незаконнае ўмяшанне ў інтарэсы нашай Айчыны.

3. Нашай найпершай задачай ёсць шырокае развіццё партызанскага руху (увага: тут прызнана, што першыя два гады савецкай партызанкі на Заходняй Беларусі не толькі амаль не было, але да гэтай пастановы ЦШПР і не думаў яе развіваць! — Аўт.), далучэння да яго ўсіх слаёў насельніцтва, у тым ліку палякаў. Атрады і групы, створаныя польскімі рэакцыйнымі нацыяналістычнымі коламі, неабходна ізаляваць ад насельніцтва шляхам стварэння сярод польскіх працоўных савецкіх атрадаў і партызанскіх груп.

4. Неабходна ўсялякімі сродкамі весці барацьбу супраць польскіх буржуазна-нацыяналістычных атрадаў...".

Тым жа летам 1943-га лонданскі польскі ўрад і Галоўная Камендатура АК у Варшаве выдалі загад **"не ваяваць разам з "саветамі", але ім не перашкаджаць" ("не вспулдзяляць разам з советамі, але ім не пшэшкадзацъ!").**

І яшчэ тым жа летам, за подпісамі П. Панамарэнкі і П. Калініна, выйшлі адзін за адным **тры загады — першы: "спыніць супрацоўніцтва з АК"; другі: "нейтралізаваць палякаў у нашых (!) атрадах; трэці: "разброіць сілы АК на нашай тэрыторыі"** — апошняе азначала адкрытую вайну.

Дзеля выканання дырэктывы летам і восенню 1943 года на Заходняй Беларусі з'явілася 9 брыгад, 10 асобных атрадаў і 15 дыверсійных груп, перакінутых з усходу і з-за фронту — **гэта значыць, па атрадзе альбо групе на адзін даваенны адміністрацыйны раён!** За год замест 10 падпольных райкомаў ВКП(б) стала 87; выдавалася 14 газет, з іх 4 па-польску; пры кожным атрадзе рэкамендавалася мець некалькі палякаў альбо заходніх беларусаў, ведаючых па-польску і г. д. У канцы 1943 года на Заходняй Беларусі савецкіх партызан было 37 тыс. чалавек — у тры разы больш, чым год назад.

Тым часам, па смерці генерала В. Сікорскага, рэальная ўлада ў Лондане перайшла да Начальніка Збройных Сіл генерала К. Соснкоўскага, які 5 кастрычніка 1943 года перадаў камандзіру АК у Варшаве генералу Т. Камароўскаму (пс. "Бор"), што неабходна лічыцца з **трыма варыянтамі** развіцця сітуацыі:

— альбо будуць узноўлены дыпламатычныя адносіны паміж польскім эміграцыйным урадам і ўрадам СССР, і тады **паўстанне супраць немцаў будзе ўзгоднена з савецкім камандаваннем, а цывільная ўлада пасля паўстання пройдзе да палякаў;**

— калі ж нямецкі фронт разваліцца раней, то ўлады АК абавязаны пачаць паўстанне самастойна і **аднавіць польскі кантроль над даваеннай тэрыторыяй, не дапускаючы туды аніякіх войск;**

— калі ж дойдзе да спынення агню паміж СССР і Германіяй, **трэба заставацца ў падполлі і чакаць на рашаючы ўдар** пасля перамогі саюзнікаў на Захадзе Еўропы...

Такім чынам, аж у 1943 годзе польскае камандаванне на Захадзе і Галоўная Камендатура АК у Варшаве лічыліся з магчымасцю савецкай акупацыі і "вяртання ў падполле", не адкідаючы, аднак, і магчымасцей супрацоўніцтва з "саветамі". Гэтая **раздвоенасць** будзе вісець над палякамі ў апошні год нямецкай акупацыі і адальецца ім вялікай крывёй.

III. АК І НЯМЕЦКІЯ АКУПАНТЫ.

Калі восенню 1943 года быў забіты гаўляйтэр ГК "Беларусь" В. Кубэ, новага гаўляйтэра А. Гітлер не прызначыў — у такіх выпадках, паводле пастановы ад ліпеня 1941 года, уся ўлада пераходзіла да начальніка СС і паліцыі, гэта значыць, да генерала К. фон Готберга. Дарэчы, ёсць версія, што падначаленае Готбергу мінскае СД ведала пра падрыхтоўку замаху на Кубэ, але дазволіла падполлю ажыццявіць гэту акцыю...

Готберг ва ўмовах узмацнення савецкай партызанкі ды аслаблення нямецкіх акупацыйных сіл, — на дзве дывізіі аховы і дзве брыгады СС у параўнанні з 1942 годам, — павінен быў пашукаць другога выйсця. Так, ад восені 1943 года немцы пачалі аточваць партызанскія зоны "ўмацаванымі вёскамі", асельваючы паліцэйскіх з эвакуіраванай з-пад Бранска 7-тысячнай брыгады СС Камінскага, казакаў, "мусульман", "шаулісаў" і г. д. Былі адноўлены беларускія паліцэйскія батальёны, арганізацыя якіх спынілася вясной 1942-га ў сувязі з канфліктам Готберг — Кубэ, а 23 лютага 1944 года немцы абвясцілі мабілізацыю ў Беларускую Краёвую Абарону. Дарэчы, новых паплечнікаў шукалі сабе не адны немцы — штаб П. Панамарэнкі

(Працяг на стар.14)

ЗАПРАШЭННЕ НА БАЛЬ

У мінскім Палацы спорту прайшоў міжнародны фестываль спартыўнага бальнага танца.

У гэтых цікавых спаборніцтвах прынялі ўдзел 107 танцавальных пар з Рэспублікі Беларусь, Расіі, Літвы, Украіны, Малдавіі. Свята агністага танца спадабалася мінчанам і гасцям сталіцы.

На здымках: адкрыццё фестывалю; выступаюць танцавальныя пары ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў.

Фота Генадзя СЯМЁНАВА, БЕЛІНФАРМ

ВЕРНАСЦЬ ТЭАТРУ

Больш за 200 роляў сучаснага, класічнага і нацыянальнага рэпертуару ўвасобіла на сцэне заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Акцябрына Мельдзюкова. Прыйшоўшы на сцэну Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа ў маі 1945 года, яна застаецца яму верная. Тут сыграны лепшыя яе ролі, тут працуюць яе сябры і калегі, многім з якіх яна дапамагла спасцігнуць сутнасць акцёрскай прафесіі. Днямі яны сабраліся, каб павіншаваць Акцябрыну Францаўну з 50-годдзем творчай дзейнасці.

На здымку: Акцябрына Мельдзюкова прымае віншаванні.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛІНФАРМ

АРМІЯ КРАЁВА НА БЕЛАРУСІ

(Пачатак на стар. 13)

таксама змяніў тактыку: калі раней праводзіўся ў жыццё шляхам тэрору лозунг "Смерць здраднікам!", то цяпер абяцалася дараванне тым, хто "часова" паддаўся і пайшоў служыць ворагу, абвяшчалася г. зв. "усенародная вайна"... На працягу 1943 года на бок партызан перайшлі тысячы людзей з паліцэйскіх і дапаможных адзінак: беларусы, "мусульмане", рускія, славакі, казакі і г. д. На бок партызан перайшла, між іншым, **паліцэйская 2,5-тысячная брыгада М. Гіль-Радыёнава**, якая атрымала назву "І-й Антыфашысцкай", хоць раней запэцкала рукі ў крыві па локаць, удзельнічаючы ў карных аперацыях.

У пошуках саюзнікаў немцы з асабістай ініцыятывы К. фон Готберга сталі шукаць падтрымкі камандзіраў АК. Трэба сказаць, што, нягледзячы на невялікі вайсковы здабытак, патэнцыяльна АК уяўляла сабой значную сілу. Ад зімы 1939-40 гадоў структуры АК фарміраваліся ў наступнай паслядоўнасці: камандаванне зоны; камандаванне акругі; разведка; мясцовая адміністрацыя; атрады мясцовай самааабароны; дыверсійныя групы; "оддзялы тэрэновэ" (атрады ў 100—150 чалавек з базіраваннем у лесе); батальёны і брыгады. Паколькі АК мела дэфіцыт зброі, — англічане не скідвалі грузаў за "лінію Керзона", уважаючы Беларусь за савецкую тэрыторыю, — **то ў рэзерве АК было ў 8-10 разоў больш людзей, чым у лесе!** Канцэпцыя камандавання АК грунтавалася на падзеях 1918 года, калі ў Германіі наступіў палітычны крызіс і стала магчымым узброенае паўстанне — гэтаксама, лічылі ў ГК АК і ў Лондане, будзе і цяпер. Таму стратэгічны план АК прадугледжваў збіранне сіл і ўдар "у адпаведны момант". Што праўда, генерал К. Соснкоўскі лічыў, што без дамовы з СССР паўстанне не мае сэнсу, але большасць урада спадзявалася на англа-амерыканцаў, а таму ў 1943 годзе начальнік ГК АК Т. "Бор"-Камароўскі выдаў агульную канцэпцыю плана "Бура", якая прадугледжвала тры этапы: папершае, здабыванне зброі; па-другое, канцэнтрацыя і мабілізацыя рэзерву; па-трэцяе, паўстанне. Не трэба казаць лішні раз, што немцы цудоўна ведалі, чым спакусіць камандзіраў АКІ Гэта была зброя.

9 снежня 1943 года камандзір Стаўбцоўскага злучэння Наваградскай акругі АК **капітан Адольф Пільх (псеўданім "Гура")** падпісаў з немцамі пагадненне, адпаведна якому да канца акупацыі атрымліваў ад іх зброю і амуніцыю. 24 снежня 1943 года ў Лідзе аналагічнае пагадненне з немцамі падпісаў камандзір Наднёманскага злучэння **паручнік Юзэф Свіда (пс. "Лех")**, які толькі за студзень, люты і сакавік 1944 года атрымаў ад немцаў пяць транспартаў зброі. Санкцыю на змову з немцамі даў камандзір Наваградскай акругі АК **падпалкоўнік Я. Праўдзіц-Шляскі (пс. "Барсук"). Такія дзеянні працягваліся і далей, нягледзячы на тое, што 17 студзеня 1944 года ГК АК у Варшаве катэгарычна забараніла любыя кантакты з немцамі.**

19 студзеня 1944 года адбыліся размовы (у Вілейцы) камандзіра Віленскай акругі АК **палкоўніка Аляксандра Крыжаноўскага (пс. "Дзэмідо", "Вільк")** з супрацоўнікам мінскага СД Зэйдлерам, які прапанаваў АК ачысціць вызначаныя раёны ад савецкіх партызан у абмен на бесперапыннае забеспячэнне зброяй, амуніцыяй і г. д. Пазней размовы працягваў шэф вілейскага СД Гравэ. Аднак палкоўніка перахапіў больш спрытны маёр абвера, прадстаўнік армейскай разведкі ў Літве Ю. Хрысціянсен, які прапанаваў А. Крыжаноўскаму перадаць зброю... увогуле без пісьмовага пагаднення! Маёр і палкоўнік дамовіліся, што немцы створаць у малых вёсках цэлую сетку складоў зброі і амуніцыі пад слабай аховай, а атрады АК па ўзгадненні з Вермахтам месца і часу будуць на гэтыя склады "нападаць" і атрымліваць зброю — "здабываць у баях"! Такая сістэма бесперапынна дзейнічала да пачатку лета, а ўжо першага сакавіка на нарадзе ў Мінску генерал СС К. фон Готберг самазадаволена заявіў, што "на наш бок перайшлі тры польскія банды і ваююць з чырвонымі" — несумненна, меліся на ўвазе злучэнні Ю. Свіды-"Леха" ды А. Пільха-"Гуры" з Наваградскай і брыгада З. Шэндзеляжа-"Лупашкі" з Віленскай акругі АК.

Зброю трэба было адпрацоўваць — і яе адпрацоўвалі. За час ад канца 1942 года да канца нямецкай акупацыі сілы Наваградскай акругі АК правялі 81 аперацыю супраць партызан (102 супраць немцаў), пры гэтым Стаўбцоўскае злучэнне А. Пільха-"Гуры" супраць немцаў амаль не дзейнічала, а вось супраць "чэрвоных" правяло 32 аперацыі... Дарэчы, баі супраць "немцаў" у большасці былі нападамі на пастарункі паліцыі (беларускай, літоўскай і г. д.), РОА ці БКА, а таксама вынішчэнне цывільных служачых. Так, той жа А. Пільх-"Гура" сцвярджае, што яго людзі знішчылі 6 тысяч (!) "здрайцаў", Наднёманскае злучэнне Ю. Свіды-"Леха" тых "здрайцаў" ліквідавала каля 1,5 тыс. чалавек, а толькі на загад штаба Наваградскай акругі Я. Праўдзіца-Шляскага было расстраляна больш за 300 чалавек.

Актыўнасць АК супраць немцаў да восені 1943 года абмяжоўвалася нападамі на асобныя патрулі і пастарункі з мэтай здабывання зброі, а таксама адбіцця арыштаваных суайчыннікаў. Калі ж зімой 1944 года немцы далі зброю самі, то антынямецкія атакі АК спыніліся амаль да лета 1944 года; калі пачалася аперацыя "Бура", тады і былі разбіты буйныя гарнізоны немцаў у Жалудку, Шчучыне, Скрыбаўцах, Солах і г. д.

З найбольш антынямецкіх атрадаў АК на правым беразе Нёмана выдзяляўся VIII УБК (восьмы "ўдзжэнёвы батальон кадровы") каменданта Б. Пясецкага (пс. "Саблеўскі"). Батальёны "Удзжэне" ("Удар") фарміраваліся з 1942 года ў наваколлях Варшавы на базе вайсковай арганізацыі партыі "Канфедэрацыя Народа". Палітычная канцэпцыя КН звязвала будучае Польшчы з федэрацыяй народаў ад Балтыкі да Чорнага мора і Адрыятыкі, пры гэтым у бягучай палітыцы арыентавалася на рашучую барацьбу з Германіяй і нейтралітэт ці нават саюз з Расіяй. **Паколькі гэта лінія істотна адрозніваласа ад АК-оўскай канцэпцыі "двух ворагаў" і "чакання на зручны момант", то КН увайшла ў склад АК з правам аўтаноміі ў справах прапаганды і агітацыі, а атрады КН Галоўная Камендатура АК скіравала пад Ліду, "на крэсы".** З кастрычніка 1942 года да пачатку 1944 года КН паслядоўна накіравала на ўсход сем атрадаў, прычым з адносна малымі стратамі дайшоў толькі апошні, VII-мы. З яго ды з рэшткаў IV-га і VI-га Б. Пясецкі-"Саблеўскі" і сфарміраваў VIII УБК, які меў базу ў раёне Н. Двор — Васілішкі, а потым у раёне Суботнікаў.

"Сустрэўшы атрад "Леха", — піша партызанка VIII УВК З. Кабыляньска ў "Запісках санітаркі", — далей ішлі разам. Здзіўлялі нас паводзіны "мясцовых" на маршы: ішлі днём, дарогай, не толькі не маскіруючыся, але спяваючы на ўсю моц, на кватэры займалі цэлыя вёскі, вартавых амаль не выстаўлялі. Маршы рабілі конна ці на вазах. Мелі добрыя боты, добрыя мундуры і кажухі, былі сытыя і самаўпэўненыя. У параўнанні з імі мы выглядалі, як абарванцы. Але напярэдадні ляцела чутка, што варшавякі голыя і босыя, але маюць першакласную зброю і біцца ўмеюць...".

Эпізод вельмі характэрны для становішча ў раёне, адкуль немцы практычна эвакуіраваліся, утрымліваючы толькі гарады і большыя мястэчкі — справа ў тым, **што калі 23 лютага 1944 года К. фон Готберг абвясціў мабілізацыю ў Беларускую Краёвую Абарону, Лідская акруга была выключана з плана мабілізацыі, каб там правяла "сваю" мабілізацыю Армія Краёва, "саюзнікі"!**

А вось яшчэ характэрны эпізод. VIII УБК займаў вёску Моцевічы пад Нёманам. Раптам пачуліся стрэлы і вартавы далажыў, што "до Немна ідом чэрвоні!" — "Саблеўскі" вырашыў, што немцы выцясняюць нейкую савецкую адзінку і загадаў адступіць з вёскі ў лес і там заняць абарону: калі "чэрвоным" трэба праз брод за Нёман — няхай ідуць, калі будуць наступаць на нас — пераб'ём. "Чырвоныя" пераправіліся, а следам за імі прыйшлі не немцы, а ... батальён паручніка Ч. Заёнчкоўскага (пс. "Рагнэр")! Апошні наляцеў на "Саблеўскага" ледзь не з кулакамі: маўляў, я ж заганяў бальшавікоў на цябе, а ты іх выпусціў! Варшавяк адказаў, што яго людзі з "рускімі" не ваююць. Пасля гэтага VIII УБК адвялі на поўнач ад шашы Ліда—Шчучын, дзе савецкіх партызан не было — далей ад грэху...

За паўгода, ад пераходу з-пад Варшавы пад Ліду і да ліпеня 1944 года, VIII УБК знішчыў моцныя гарнізоны ў Дворышчах, Суботніках, Кяне, разбіў калону з 80 аўтамашын, правёў паўтара дзесятка баёў. 1 ліпеня "Саблеўскі" акружыў у Трабах батальён СС і разбіў яго ўшчэнт, палонячы камандзіра і яшчэ 152 чалавекі. Перад "маршам на Вільню" VIII УБК меў 699 чалавек — былі на ўзбраенні гарматы, мінамёты, каля 300 штук аўтаматычнай зброі, здабытай у баях.

У канцы зімы Галоўная Камендатура АК загадала правесці следства ў справе афіцэраў, якія бралі ад немцаў зброю. Старшынёй палявога суда быў Б. Пясецкі-"Саблеўскі", прысутнічалі таксама камандзір Наваградскай акругі Я. Праўдзіц-Шляскі і прадстаўнік ГК АК маёр М. Каленкевіч-"Котвіч" — перад судом паставілі "Леха", "Рагнэра" і К. Стыпулу (пс. "Грубы Бартэк"). Раён в. Вайковічы, дзе адбываўся суд, прыкрывала рота з VIII УБК — прыкрывала недарэмна: "Рагнэр" явіўся на чале сваёй конай разведкі...

"Лех" усю віну ўзяў на сябе і быў асуджаны на расстрэл. Але тут маёр М. Каленкевіч-"Котвіч" заявіў, што як прадстаўнік ГК ён **"прыпыняе"** рашэнне суда да канца вайны і... адсылае Ю. Свіду-"Леха" ў Варшаву! А на месца яго ставіць "Рагнэра"...

Між тым пачалася мабілізацыя. Вось як апісаны гэтыя дні ў справаздачы прадстаўніка ГК у Варшаву:

"Шчучынскі павет уваходзіць у склад Лідскага гебітскамісарыята. Гэта астравок Рэчы Паспалітай, дзе мясцовыя нямецкія ўлады дэманструюць максімум цярплівасці і разумення ў адносінах да арганізаваных і ўзброеных палякаў. Шчучынскі павет нагадвае наваколле Жлобіна і Бабруйска часоў Доўбура-Мусніцкага. Нямецкая ўлада існуе толькі ў мястэчках, а савецкая на левым беразе Нёмана. Польскія атрады праводзяць рэгулярную мабілізацыю — солтысы афіцыйна разносяць позвы. Кожную нядзелю, кожнае свята ідзе палявая імша. Млыны, маёнткі і гаспадаркі плоцяць на войска падаткі натурай і грашыма. Варшавякі з УБК сцвярджаюць, што нідзе ў Польшчы няма такіх добрых умоў для фарміравання падпольнай арміі, як у Шчучынскім павеце. Справа тут не толькі ў настроях людзей, але ў нямецкай паблажлівасці. Са шчучынскай турмы немцы выпусцілі дзевяць хлопцаў пры ўмове, што яны пойдуць да "бялых" (у дакументах немцы называлі АК "weissporlen" ці "белапалякі"! — Аўт.)".

Пазней Я. Праўдзіц-Шляскі пісаў, што сілы Наваградскай АК налічвалі 7,7 тыс. чалавек, **пры гэтым 40% (!) складалі мабілізаваныя праваслаўныя беларусы,** а на адзін Лідскі павет прыходзілася 6,5 тыс. байцоў! У планах К. фон Готберга было фарміраванне дапаможных польскіх паліцэйскіх адзінак, камісар у Вільні Лёзэ насіўся з ідэяй стварыць "польскае прадстаўніцтва" пры сваім "Остляндзе" і нават выкарыстаць АК для абароны (!) Вільні...

IV. АПЕРАЦЫЯ "ВОСТРАЯ БРАМА".

20 лістапада 1943 года камандуючы АК генерал Т. Камароўскі выдаў дырэктыву 1300/III пра падрыхтоўку аперацыі "Бура" — раптоўнага ўдару на нямецкія тылы і захоп найбольш значных гарадоў і чыгуначных вузлоў у момант, калі "праз іх будзе праходзіць фронт Чырвонай Арміі". **Камандаванне АК лічыла, што савецкія вайсковыя ўлады будуць трактаваць палякаў як саюзнікаў, а падтрымка англа-амерыканцаў і ўласны мілітарны патэнцыял АК гарантуюць устанаўленне ў занятых гарадах цывільнай улады і стварэнне рэгулярнай арміі, якая будзе падпарадкоўвацца Лондану.**

Першы кантакт АК з рэгулярнай Чырвонай Арміяй адбыўся на Валыні. Ужо 4 студзеня 1944 года савецкія войскі перайшлі старую польскую мяжу, 12 лютага занялі Луцк і выйшлі ў раён 27-й дывізіі пяхоты АК. Дывізія пад камандаваннем маёра Я. Ківерскага (пс. "Оліва") налічвала 6 тыс. чалавек, сканцэнтраваных на поўнач ад Ковеля. **20 сакавіка два батальёны 27-й дывізіі пры падтрымцы савецкай артылерыі занялі ст.Турыск і пачалі баі за Ковель. 26-27 сакавіка адбыліся размовы палякаў з генерал-лейтэнантам Сяргеевым; у выніку цяжка дасягнутага кампрамісу 27-я заставалася на фронце як частка "Польскіх Сіл Збройных, падпарадкаваных Лондану і Варшаве".** Баі за Ковель з пераменным поспехам ішлі да 7 красавіка, пасля чаго немцы нанеслі танкавы контрудар і адсеклі палякаў і два савецкія кавалерыйскія палкі ад фронту. Не было зроблена аніякай спробы іх вызваліць. Страціўшы паўтара батальёна, 27-я дывізія прарвалася на поўнач і выйшла на Падляшша, дзе працягвала партызанскую вайну. **Ніякіх палітычных наступстваў гэта аперацыя не прынесла.** Цікава, што ў мемуарах камандуючага фронтам маршала К. Ракасоўскага гаворыцца, што ў разгар баёў за Ковель яны з начальнікам штаба "раптам" прыйшлі да высновы, што са стратэгічнага пункту гледжання... браць Ковель няма патрэбы! Гэта ўсё вельмі падазрона. Хутчэй за ўсё І. Сталін яшчэ не меў гатовай канцэпцыі ў "польскай справе", а таму не хацеў мець заўчасных кантактаў з палякамі, якія не падпарадкоўваліся яму палітычна. А таму на флангах 27-й дывізіі АК савецкія войскі "адступілі" і такім спосабам "вярнулі" палякаў у партызанку.

Пасля "ковельскай гісторыі" ГК АК выдала батальёнам дадатковы загад, якім забаранялася складваць зброю перад савецкім камандаваннем альбо пераходзіць на яго бок. Загад мала што высвятляў, паколькі захоўваліся ўсе ранейшыя інструкцыі, а перадусім **"план "Бура" пачынае дзейнічаць, як толькі лінія фронту дасягне вызначанага аб'екта атакі"**, а пры такіх умовах АК не магла дзейнічаць самастойна, без Чырвонай Арміі, што пацвердзілі пазнейшыя падзеі.

У планах ГК АК і асабліва лонданскага ўрада ключавое значэнне мелі Вільня і Львоў — гэтыя гарады вызначалі прыналежнасць "крэсаў" да Польшчы. Аперацыя па авалоданні Вільняй мела крыптанім "Вострая Брама".

Генерал Т. Камароўскі аддаў загад пра авалоданне Вільняй 12 чэрвеня 1944 года. Аперацыяй "Вострая Брама" меў камандаваць палкоўнік А. Крыжаноўскі-"Вільк", начальнікам штаба і аўтарам плана аперацыі быў маёр М. Каленкевіч-"Котвіч". Штурм Вільні ўскладаўся на сілы АК Віленскай і Наваградскай акруг, яны разам павінны былі лічыць **18 тыс. чала-**

век; з іх 12 тыс. у самой Вільні мелі ўдарыць у тыл немцам.

Паводле плана "Котвіча", сілы АК павінны былі скрытна сканцэнтравацца за 15—20 км ад Вільні і ноччу адначасова і раптоўна ўдарыць трыма групамі, авалодаць умацаваннямі і днём ачысціць горад напярэдадні падыходу савецкіх войск.

Сігнал пра пачатак "Вострай Брамы" "Вільк" атрымаў з Лондана 2 ліпеня — у гэты дзень войскі 3 Беларускага фронту перайшлі старую польскую мяжу пад Радашковічамі. Палкоўнік "Вільк" аддаў загад: штурм Вільні — ноччу з 6 на 7 ліпеня, пачатак атакі ў 23.00. Але 5 ліпеня разведка АК паведаміла, што да Вільні прыбываюць свежыя нямецкія войскі: танкі, артылерыя, парашутысты... Па асобных звестках, немцы мелі ў Вільні на пачатку баёў каля 60 танкаў, 2 бронецягнікі, 270 гармат, каля 25 штурмавых самалётаў і да 5—6 тыс. чалавек.

Па плану "Вострая Брама" сілы АК мелі сканцэнтравацца ў тры групы: 1-я маёра А. Аляхновіча ("Пахарэцкі"), 2-я маёра М. Патоцкага ("Вэнгельны") і 3-я маёра Ч. Дэмбіцкага ("Ярэма"). Але ў ноч наступлення з усходу ўдарылі толькі 1-я і 3-я групы ў аслабленым складзе; 2-я група знаходзілася за 60 км ад Вільні і спазнілася ў раён канцэнтрацыі на адзін дзень.

У складзе "ўсходняй групы" былі: 3-я брыгада "Шчэрбец" — 800 чалавек; 8-я Ашмянская — 400; 9-я — 270; эскадрон "Гром" — 100; 1-ы батальён 77 палка — 350; 3-ы батальён 77 палка (былы VIII УБК) — 700; 5-ы батальён 77 палка — 600; у рэзерве 13-я Маладзечанская брыгада — 450 чалавек... **Разам 3620 чалавек і яшчэ каля 400 чалавек у самой Вільні замест планаваных 18 тыс. байцоў. Да таго ж, "Вільк" перанёс наступленне на адзін дзень раней, таму што 5 ліпеня савецкія войскі былі ўжо ў Смаргоні, а камандаванню надта ж хацелася ўзяць Вільню сваімі сіламі— у сувязі з пераносам атакі віленскае падполле не здолела сканцэнтраваць свае сілы ў тую ж ноч.** Дарэчы, і тут справа выглядае падазрона: батальёнамі АК у горадзе камандаваў падпалкоўнік Крэчоўскі-"Людвік", як пазней высветлілася, агент НКВД...

У начным баі батальёны АК прарвалі вонкавую лінію нямецкай абароны, але раніцай не здолелі прабіць пас асноўных умацаванняў — сістэму бетонных агнявых кропак, злучаных траншэямі. Немцы падцягнулі артылерыю і бронецягнік, з паветра атакавалі самалёты. Батальёны захыналіся крывёй і на дванаццатай гадзіне бесперапыннага бою пачалі адступаць. Толькі "Шчэрбец" і надышоўшыя дзве роты з рэзерву здолелі ўтрымаць захопленыя пазіцыі да змроку.

Між тым вечарам 7 ліпеня на прадмесцях Вільні з'явілася савецкая разведка, а з поўначы завілейскую частку горада ноччу атакавалі АК-оўцы з 2-й групы "Вэнгельнага", якая спазнілася на суткі і цяпер наступала разам з батальёнамі 27-й савецкай дывізіі. 8 ліпеня насустрач наступаючым з горада ўдарыў батальён капітана Б.Загорнага /пс. "Ян"/. Баі на вуліцах працягваліся да 13 ліпеня, апошнім пунктам нямецкай абароны быў універсітэт у старым горадзе.

Пасля канца баёў палкоўнік А.Крыжаноўскі-"Вільк" зноў пачаў сцягваць атрады АК да Вільні, спадзеючыся сфарміраваць з іх 19-ю дывізію пяхоты /як прадугледжваў план "одродзэня польскіх сіл збройных" ГК АК/, але **пасля 15 ліпеня савецкія войскі не прапускалі АК-оўцаў да Вільні. У той жа дзень вечарам "Вільк" з групай афіцэраў быў арыштаваны ў штабе 3 Беларускага фронту.** На месца канцэнтрацыі ў Меднікаx тым часам былі сцягнуты фарміраванні АК з тэрыторыі ад Стоўбцаў да Нарачы, якія разам налічвалі да 7 тыс. чалавек. Некалькі дзён афіцэры з 1 Польскай Арміі генерала З.Берлінга /1 Беларускі фронт/ агітавалі іх пераходзіць у 1 Польскую Армію. Але калі стала вядома пра арышт "Вілька" і пра тое, што побач канцэнтруюцца войскі НКВД, палякі некалькімі калонамі рушылі на захад, спадзеючыся перайсці фронт. Камандаваў адыходам падпалкоўнік З.Блюмскі-"Стрыханьскі". Апошнюю калону вёў маёр М.Каленкевіч-"Котвіч". Праз некалькі дзён калоны разбіліся на малыя групы і адступалі паасобку — войскі НКВД мелі значную перавагу, бранятэхніку, разведсамалёты, амфібіі і г.д. Большая частка рэгулярных сіл АК перастала існаваць. "Котвіч" і ўся яго група з 35 чалавек загінулі ў баі з НКВД на хутары Сурконты за 20 км ад Ліды — НКВД страціла забітымі 135 чалавек. Баі НКВД і Чырвонай Арміі супраць АК працягваліся да канца верасня, пасля чаго ацалелыя групы палякаў вярнуліся ў падполле — частка людзей адступіла ў пушчу, іншыя канспіраваліся ў мястэчках і вёсках.

Няўдача аперацыі "Вострая Брама" /па-за тактычнымі памылкамі, зменай тэрміну атакі і г.д./ тлумачыцца перадусім **недахопам сіл і сродкаў**, з-за чаго не ўдалося знішчыць аэрадром Парубанка, падарваць чыгунку і нейтралізаваць бронецягнікі, сходу прабіць галоўны пас абароны і перанесці баі на вуліцы, падняць агульнае паўстанне.

Хто ж не прыйшоў пад Вільню і чаму? Бо нават тыя, хто не паспеў да хвіліны "Х", біліся за Вільню ці на другі-трэці дзень, ці разам з савецкімі войскамі...

Не бронеці 5-й "Брыгады смерці" З.Шэндзеляжа—"Лупашкі" альбо 550 чалавек, не прыйшоў з 4 батальёнам 77 палка Ч.Заёнчкоўскі!-"Рагнэр" (800 чалавек), не прыйшоў на чале Стаўбцоўскага злучэння (900 чалавек) А.Пільх-"Гура" і г.д. Як бачым, не проста так бралі яны зброю ад немцаў — надышоў час плаціць. Найбольш характэрны прыклад А.Пільха-"Гуры", які вясной 1944 года два месяцы быў у рэйдзе і дайшоў аж да Мінска, удзельнічаючы ў карных аперацыях немцаў супраць партызан, а потым адступаў на захад у нямецкіх калонах і разам з немцамі пераправіўся за Буг, маючы ў кішэні "глейт" ад нямецкага каменданта Наваградка, дзе "Стаўбцоўскае злучэнне" ўжо іменавалася антыпартызанскай адзінкай.

А вось маёр М.Каленкевіч-"Котвіч", інжынер, парашутыст, адзін з лепшых афіцэраў АК, спачатку вясной 1944 года быў двойчы паранены і страціў руку, потым быў паранены пад Вільняй і нарэшце загінуў у Сурконтах, а той "Рагнэр", якога "Котвіч" **пашкадаваў** і не даў расстраляць за здраду і да "Рагнэра" падобныя дэзерціравалі і здрадзілі.

Дарэчы, "пашкадаваны" "Рагнэр" у маі 1944 года кінуў свой батальён на левы бераг Нёмана — на савецкую партызанскую зону; у баях АК згубіла 42 забітых і 56 параненых. А. "Гура" вывеў за Буг у нямецкай калоне каля 900 чалавек, 24 цяжкія і 555 ручных кулямётаў, 6 мінамётаў, 120 аўтаматаў, 900 карабінаў і г.д.

V. ПАСЛЯ НЯМЕЦКАЙ АКУПАЦЫІ. ЗАКЛЮЧЭННЕ.

Далейшыя падзеі і лёсы жаўнераў АК савецкаму чытачу вядомы хіба толькі па шпіёнскай аповесці В.Багамолава "У жніўні сорак чацвертага", дзе дзейнічаюць ліхія хлопцы са СМЕРШ, якія абясшкоджваюць-такі польскіх шпіёнаў, якія працуюць на Абвер... На самай жа справе ўсё было складаней і трагічней.. Ішло самае натуральнае "паляванне на палякаў" з боку спецаддзелаў СМЕРШ і такое ж "паляванне на афіцэраў" з боку АК — за 1944—45 гады на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне загінула 575 савецкіх афіцэраў! Частка "мабілізаваных" у АК вясной 1944-га разышлася па хатах, але ўжо восенню трапіла пад савецкую мабілізацыю "даёшь Берлін!"; іншыя працягвалі "партызанку" і пасля вайны, пры гэтым у 1947—48 гадах яна нават узмацнілася ў сувязі з новымі "вывазкамі" ды арыштамі. У Лідзе стралялі яшчэ ў 1950-м, у Воранаве — у 1953-м...

Частка сіл АК, якая была звязана з немцамі, адступіла за Нёман і Буг. На Беласточчыне атрады "Лупашкі" пачалі адкрыты антыбеларускі тэрор, палячы нават цэрквы — падрабязней пра гэта сказана на старонках беластоцкай "Нівы". У адказ беларусы пацягнуліся ў партызаны "службу бэзпечэньства" — не па камунізм, а па карабіны і аўтаматы. **Вайна стала ўжо нацыянальна-рэлігійнай; амністыя АК-оўскаму падполлю і выбары памаглі мала, тым болей, што тыя АК-оўцы, хто складаў зброю, праз кароткі час траплялі пад рэпрэсіі.**

Доўгі час у БССР існаванне АК альбо ўвогуле замоўчвалася, альбо падавалася выключна ў "чорных фарбах". Цяпер жа, калі, як пісаў Ю.Мацкевіч, **"погляды чарговы раз перакручваюцца на супрацьлеглыя"**, як і трэба было чакаць, знайшлося шмат жадаючых апрануць АК толькі ў белыя адзенні: "таксама ваявалі супраць немцаў" і г.д. Але нават з тых фактаў, што пададзеныя вышэй, відавочна, што аніводная крайнасць поглядаў не адлавядае таму, што было тут у 1939—56 гг. на самай справе.

З восені 1939 года да лета 1941 польскае падполле мела выразны антысавецкі характар, хоць і не магло весці шырокай узброенай барацьбы — адносіны ж "саветаў" не толькі да падполля, але да палякаў увогуле вызначаліся самымі жорсткімі рэпрэсіямі. У першай фазе акупацыі палякі замацаваліся ў паднямецкай адміністрацыі і паліцыі, узялі своеасаблівы рэванш, помсцячы ўсім, каго падазравалі ў непрыхільнасці да палякаў у 1939—41. Пазней стаўка немцаў на беларускі нацыяналізм і "Полен-акціон" 1942—43 гадоў прывяла да крайняга абвастрэння польска-беларускага канфлікту, але спрыяла як хуткаму росту шэрагаў АК, так і першым кантактам польскай і савецкай партызанкі. Але гэтыя кантакты выклікаліся не агульнымі сімпатыямі і нават не наяўнасцю агульнага ворага (немцы і беларусы з нямецкіх устаноў), але толькі ваеннай неабходнасцю — **да супрацоўніцтва даходзіла толькі тады, калі іншага выйсця абодва бакі не бачылі.** Адносны нейтралітэт захоўваўся да лета 1943 года, калі выбухнуў канфлікт паміж СССР і лонданскім польскім урадам, а ЦШПР выдаў дырэктыву пра развіццё савецкай партызанкі на захадзе Беларусі і раззбраенне ўсіх атрадаў, якія не падпарадкоўваліся савецкаму камандаванню. З восені 1943 года ўзброеныя сутычкі паміж АК і "саветамі" сталі рэгулярнымі. Зімой 1943—44 гадоў дайшло да шырокіх кантактаў паміж вышэйшымі чынамі акупацыйнай адміністрацыі, СС і Вермахта з палявымі камандзірамі АК, забеспячэння палякаў нямецкай зброяй і адкрытага супрацоўніцтва — гэтаму не здолела **(не хацела?)** перашкодзіць нават Галоўная Камендатура АК у Варшаве. Але ў сувязі з падрыхтоўкай акцыі "Бура" з лета 1944 года батальёны АК аднавілі ўзброеныя напады на немцаў, а пасля прарыву нямецкага фронту спрабавалі самастойна заняць Вільню. Канфлікт савецкага камандавання з палкоўнікам А.Крыжаноўскім-"Вількам", які дабіваўся **фарміравання польскай дывізіі і аднаўлення польскай адміністрацыі, падпарадкаваных Лондану**, прывёў да адкрытых баёў паміж Чырвонай Арміяй і АК, калі апошняя адмовілася скласці зброю. Гэта прывяло да "вяртання ў падполле" і партызанскай вайны супраць камуністычных уладаў СССР і Польшчы ў наступныя дзесяць гадоў. Вось асноўныя этапы АК-оўскага руху.

Але пры ўсіх зменах палітычнага становішча і тактыкі АК яе дзейнасць заўсёды была выразна антыбеларускай, была працягам іншымі сродкамі "санацыйнай палітыкі" II Рэчы Паспалітай.

Армія Краёва была апошняй спробай захаваць "польскасць" "на крэсах" — гэта сутнасць таго, што хаваецца пад ідэалогіяй тых часоў, баявымі дзённікамі, дакументамі архіваў і мемуарамі непасрэдных удзельнікаў тых падзей з усіх магчымых бакоў.

З гэтага пункту гледжання спробы прадстаўляць сёння на Беларусі АК-оўцаў як "нацыянальных герояў" выглядаюць, мякка кажучы, недарэчнымі. Калі гэта не частка чыйго-небудзь палітычнага курсу на "вяртанне справядлівасці" ды "свентэй для каждэго поляка граніцы двудзестэго першэго року"...

Ахвяры вайны — так. Але "нацыянальныя героі"?! Што датычыцца наймення "банды", то гэта зразумелае перабольшанне для 1942—44 гадоў, калі АК дзейнічала фактычна як рэгулярная армія. Але ў апошнія гады і на падсавецкай Беларусі, і на Беласточчыне "індывідуальны тэрор супраць чырвоных" выглядаў як самы натуральны разбой на начной дарозе. Гэта ўжо не мае нічога агульнага нават з палітычнымі поглядамі.

Дарэчы, у самой Польшчы пішучыя пра АК (у тым ліку самі ветэраны польскага падполля і партызанкі), як П.Лісевіч, Р.Кораб-Жэбрык і іншыя, падаюць **тыя ж самыя факты** пра "Рагнэра", "Гуру" і другіх камандзіраў АК, якія супрацоўнічалі з немцамі — а тут, "на крэсах", пачынаецца крык! Вось не было такога — і кропка! Наіўны разлік, што тут усе пагалоўна блытаюць АК з даваеннай польскай арміяй ці з арміяй Андэрса 1941—45 гадоў...

Армія Краёва — гэта гісторыя. Там нічога не пераменіш і не перапішаш.

А калягістарычныя гульні ў камбатанцкія з'езды, шумныя маніфестацыі, настальгічныя артыкулы, калектыўныя лісты, ананімныя званкі з пагрозамі — гэта ўжо прыкметы **нашага** часу...

Аляксей КЕЙЗАРАЎ

22 лістапада 1994 года памёр пісьменнік Аляксей Кейзараў (Аляксей Сцяпанавіч Кейзераў).

Нарадзіўся Аляксей Кейзараў 4.10.1928 г. у в. Бронніца Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Пасля заканчэння Гомельскага тэхнікума чыгуначнага транспарту (1948 г.) працаваў на чыгуначных станцыях у Казані і Калінкавічах. З 1950 г. — бібліятэкар, затым (1951—1967 гг.) настаўнік Бронніцкай сярэдняй школы. У 1955 годзе скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут. З 1967 года на журналісцкай працы ў рэспубліканскім друку і на радыё. У 1974—1988 гг. — літкансультант часопіса "Нёман".

Пісаў на рускай мове.

Першае апавяданне надрукаваў у 1957 г. Выдаў кнігу прозы "Нас было семеро" (1963), кнігі нарысаў "Не знающий покоя" (1963), "Эхо на Полесье" (1979),

кнігі для дзяцей "Хитрый гвоздик" (1966), "Первый разведвзвод" (1969), "У нас в Тополевке" (1979), "Возвратятся журавлі" (1988). У яго літаратурным запісе выйшла каля дзесяці кніг успамінаў у дзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Творы, напісаныя Аляксеем Кейзаравым, адметныя сваёй чалавечнасцю, наблізанасцю да рэальнага жыцця. Яны яшчэ доўга будуць спрыяць выхаванню моладзі на лепшых традыцыях нашага народа.

Светлая памяць пра пісьменніка назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Саюз пісьменнікаў Беларусі

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ БЕЛАРУСІ

Заснавальнікі:
Саюз пісьменнікаў Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь

Выходзіць з 1932 года

Газету рэдагавалі

Х.Дунец	*(1932-35)*
І.Гурскі	*(1935-41)*
А.Куляшоў	*(1945-46)*
М.Горцаў	*(1947-49)*
П.Кавалёў	*(1949-50)*
В.Вітка	*(1951-57)*
М.Ткачоў	*(1957-59)*
Я.Шарахоўскі	*(1959-61)*
Н.Пашкевіч	*(1961-69)*
Л.Прокша	*(1969-72)*
Х.Жычка	*(1972-76)*
А.Асіпенка	*(1976-80)*
А.Жук	*(1980-86)*
А.Вярцінскі	*(1986-90)*

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ
Андрэй ГАНЧАРОЎ
першы намеснік галоўнага рэдактара
Юрась ЗАЛОСКА
Міхась ЗАМСКІ
Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ
Барыс ПЯТРОВІЧ
намеснік галоўнага рэдактара
Юрась СВІРКА

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220600, ГСП, Мінск,
вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:
прыёмная рэдакцыі *332-461*
намеснікі галоўнага рэдактара *332-525, 331-985*
аддзелы:
публіцыстыкі *332-525*
пісьмаў і грамадскай думкі *331-985*
літаратурнага жыцця *332-462*
крытыкі і бібліяграфіі *332-204*
паэзіі і прозы *332-204*
музыкі *332-153*
тэатра, кіно і тэлебачання *332-153*
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў *332-462*
навін *332-462*
мастацкага афармлення *332-204*
фотакарэспандэнт *332-462*
бухгалтэрыя *268-640*

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з думкамі і меркаваннямі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра «ЛіМа»
Апаратныя сродкі і тэхнічная падтрымка — фірма «Дайнова»

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах
Друкарня "Беларускі Дом друку". (г.Мінск, пр. Ф.Скарыны, 77)
Індэкс 63856. Наклад 11534.
Нумар падпісаны 1.12.1994 г.

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Тэлетыдзень

ПАНЯДЗЕЛАК, 5.12

Беларускае тэлебачанне

16.15 Тэлебачанне — школе. Старажытныя беларускія гарады
16.40 "Бімбат"
17.00 Навіны
17.10 Кампазітары Беларусі. А.Літвіноўскі
17.40 Праспект
18.10 Навіны (Брэст)
18.35 Навіны ВВС
19.10 Аэробіка
19.40 Што на свеце пачуваецца?
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Імгненне шчырасці
21.45 Вертыкаль
22.20 Спартыўны тэлекур'ер
22.40 Пяць хвілін на жарты
22.45 Пад купалам Сусвету
23.00 НІКа
23.15 Дайджэст
23.25 "Паласа Сімарона"

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.30 "Дзікая Роза"
9.00 Што? Дзе? Калі?
14.00 Пад знакам Меркурыя
14.15 Хроніка дзелавога жыцця
14.25 Дазвольце прадставіцца
14.40 Фондавы рынак
15.00 Новыя імёны
15.30 Зорная гадзіна
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Ва ўсіх на вуснах
17.30 Асцярожна, СНІД
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Караян
18.00 Гадзіна пік
18.55, 21.25 Загадкі гісторыі
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Сустрэча з А.Салжаніцыным
20.55 Гол
22.05 Кабарэ "Усе зоркі"
23.00 Новыя абывацелі
23.30 Аўта-шоу
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25, 21.50 Кліп-антракт
8.30 Дэпеша
9.00 "Пятая пятніца", м/ф (Германія)
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 "Дзелавая Расія"
13.45 "Халасцякі", "Крэйзі", м/ф
15.10 Музычная мазаіка
15.25 Новая лінія
16.05 Там-там навіны
16.20 Свята кожны дзень
16.30 На шахматнай алімпіядзе
17.00 Ніхто не забыты
17.05 Выратаванне 911
18.00 "Фестываль прэм'ер". В.Арцёмаў
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Спрут-6"
20.35 Рэпарцёр
20.55 "Драма Андрэя Андрэевіча", д/ф
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 Сола
23.35 Экзотыка
0.35 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Тэст
13.30, 14.45, 17.35, 19.25 Музычны момант
13.35, 22.10 "Глушак", м/ф
14.05 "Капрызка", мульт
14.50 "Страсці", м/ф
16.25 Кідайка
17.05 "Сінюшчын калодзеж", т/ф
17.40 "Крыжыкі-нулікі"
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Два галасы", м/ф
20.35 "Рандэву". С.Галанін
21.05 Мультфільм
21.10 Тэлемагазін
21.15 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Сапртыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 Баскетбол. "Спартак" (Санкт-Пецярбург) — "Чырвоны-кацельшчык" (Таганрог)
23.15 "Гісторыя таблеткі", т/ф (Францыя), ч. 1

АЎТОРАК, 6.12

Беларускае тэлебачанне

8.00, 17.30, 18.10 (Віцебск), 18.35 (ВВС) Навіны
8.10, 23.45 Дайджэст
8.20, 19.50 Пяць хвілін на жарты
8.30 Дзелавы веснік
8.45 "Рамэо і Юлія". Фрагмент балета на музыку Г.Берліёза
9.00 Тэлебачанне — школе. Старажытныя беларускія гарады
9.25 "Паласа Сімарона"
10.40 "Чарапашкі ніндзя"
11.30 "АВС-клуб"
11.45 "Заўтра была вайна", м/ф
13.10 "Насталыгічны дывертысмент", ч. 5
14.10 "Не адлятай, зямлянін!", к/ф
14.45 "Нов і К"-топ-10
15.50 "Самотная, альбо Вершніка", д/ф
16.10 Тэлебачанне — школе. А.Дудараў. "Вечар"
16.40 "Бімбат"
17.10 "Дарога да дому", муз.фільм
17.30 "Я заўсёды быў беларусам", нарыс
17.50 Тэлеклуб "Удача"
19.10 Эканамікст
19.20 Мост
19.55 "Маё каханне, мой смутак"
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 "Добрыя намеры", с. 4
22.40 Хакей. "Цівалі" (Мінск) — "Сокал" (Кіеў)
23.30 НІКа
23.55 "Маленькая паслуга", м/ф

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 17.50, 20.00, 23.00 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.25 "Дзікая Роза"
9.00 Ты помніш, таварыш...
9.30 Канцэрт народнай музыкі
14.00 Дзверы ў малы бізнес
14.15 Хроніка дзелавога жыцця
14.25 Культура і бізнес
14.35 Аўтасалон
15.00 Вясёлыя ноткі
15.30 Чароўны свет, ці Сінема
16.00 Джэм
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Тайны Старой плошчы
17.30 Загадка СБ
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Ж.Кусто
18.00 Гадзіна пік
18.55 Тэма
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 З першых рук
20.50 Песня-94
21.35 "Па Таганцы ходзяць танкі", м/ф
23.10 Канал ілюзій
23.50 Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Вайсковы кур'ер
8.40 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 Выратаванне 911
15.10 Музычная мазаіка
15.20 "Жарабец-хітрун", с. 4
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Здарова жывеш
16.30 На шахматнай алімпіядзе
17.00 Бясшумныя лідэры
17.30 Кіно ў снежні
17.40 Парадак дня
18.05 L-клуб
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Бадзяга ў Беверлі Хілз", м/ф (ЗША)
21.20 Фільм-прэм'ер
21.40 ЭКП
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 Футбол. 1/4 кубка УЕФА, "Ювентус" (Турын) — "Адмірал-Вакер" (Вена)
0.35 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 "Вожык, сабака і хлопчык Ніка", мульт
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 14.25, 17.50, 18.30, 19.25, 21.30 Музычны момант
13.35, 22.10 "Глушак", м/ф
14.05 Мультфільмы
14.50 "На цябе спадзяюся", м/ф
16.15 Чароўная лінія
16.30 А.Фрэйндліх. Выбранае
17.25 Паласатая музыка
17.40 Студыя "Уяві"
17.55 Па ўсёй Расіі
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 Пецярбургскі ангажэмент
20.15 "Золата "Зеніта", д/ф
20.35 Кансерватар
21.10 Тэлемагазін
21.20 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Пікавая дама", м/ф

СЕРАДА, 7.12

Беларускае тэлебачанне

8.00, 17.00, 18.10 (Гомель), 18.35 (ВВС) Навіны
8.10 Эканамікст
8.20, 23.05 Дайджэст
8.30, 19.35 "Маё каханне, мой смутак"
9.00 Тэлебачанне — школе. А.Дудараў. "Вечар"
9.30, 22.40 Пяць хвілін на жарты
9.35 "Добрыя намеры", с. 4
10.30 "Дыназаўрыкі"
11.00 Мультклуб
11.30 "Планета людзей", ч. 1
12.05 "Распарадчык балю", м/ф (Польшча)
13.50 "Следства вядуць Калабкі"
14.10 Відзьма-нявідзьма
15.15 А.Брукнер. Сімфонія N 9
16.35 "Бімбат"
17.10 "Між часамі", т/ф
17.20 "Лясному рэху праўду раскажу..." Паэзія А.Куляшова
19.10 "Крок": "Карамболь"
19.40 Кола дзён
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 "Добрыя намеры". с. 5
22.50 НІКа
23.15 "Сірано дэ Бержэрак", спектакль, ч. 1

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 17.50, 20.00, 22.20 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.25 "Дзікая Роза"
9.00 Клуб падарожнікаў
14.00 Вытворчасць: буйны план
14.15 Хроніка дзелавога жыцця
14.25 Грошы і шчасце
14.35 Біржа працы
15.00 Паглядзі, паслухай...
15.20 "Лятаючы дом"
16.00 Цін-тонік
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 Кампанія "Мір"
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Е.Платон
18.00 Гадзіна пік
18.55 "Я цябе прысвячаю ў каханне..." М.Карачанцаў
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Веснікі
21.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. "Пары Сен-Жармен" (Францыя) — "Спартак" (Масква)
23.20 Прэс-экспрэс
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Агляд матчаў

Канал "Расія"

6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых ллюдзей
8.00 Навіны АВС
8.25 Тэатральны раз'езд
9.10 Раніцні канцэрт
9.25 "Урокі Арменіі"
10.10 Мемуары
10.35 Тэлегазета
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 "Бацькоўскі дзень", "Безнадзейная справа", к/ф
15.10 Музычная мазаіка
15.20 Студыя "Рост"
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Звычайная справа
16.30 На шахматнай алімпіядзе
17.00 Панове-таварышы
17.15 Кліп-антракт
17.20 Гаспадар
17.50 Зоркі Амерыкі
18.25 Вуснамі дзіцяці
19.25 Падрабязнасці
19.35 "Санта-Барбара"
20.30 Сам сабе рэжысёр
21.00 Пяць хвілін пра наша жыццё
21.10 Сем нот у цішыні
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 ЭКП
23.00 Творчасць шчаслівых сноў
23.30 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 17.50, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 14.25, 17.50, 19.25 Музычны момант
13.35, 22.10 "Глушак", м/ф
14.05 Мультфільмы
14.45 "Бег па сонечным баку", м/ф
16.15 Еўрапейскі калейдаскоп
16.40 "Жывыя струны, муз. фільм
17.15 Дзецям пра зверанят
17.55 Гістарычны альманах
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 Юбілей А.Фрэйндліх
20.00 "Добры настрой", канцэрт
20.35 Блеф-клуб
21.10 Тэлемагазін
21.20 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Цікая дама"

ЧАЦВЕР, 8.12

Беларускае тэлебачанне

8.00, 17.00 (Гродна), 18.35 (ВВС) Навіны
8.10, 21.40 Пяць хвілін на жарты
8.15, 23.30 Дайджэст
8.25 "Маё каханне, мой смутак"
8.55 Аўта-парк
9.15 "Добрыя намеры", с. 5
10.05 "Гэта зусім не пра гэта", мульт
10.10 Творчае маладзёжнае аб'яднанне "Крок": "Карамболь"
10.40 "Дзівосны манеж", "Пекар і гультай", мульт
10.55 "Тайна Снежнай каралевы", м/ф
13.10 Тэлевізійны Дом кіно
13.50 "Песню бярыце з сабою", ч. 1
14.40 "Вяселле старэйшага брата", м/ф
15.50 "Роздум ля палітры", д/ф
16.10 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Пуцявінамі Андрэя Лабановіча
16.40 "Бімбат"
17.10 "Абуза", к/ф
17.40 3 крыніц чысціні мінулага
19.10 Вытокі. Урокі беларускай мовы
19.25 "Адраджэнне беларускай капэлы", ч. 3
20.00 "Крок": "Правінцыя, альбо Тое-сёе пра каапераацыю"
20.35 Кальханка
21.00 Панарама
21.45 Пад купалам Сусвету
22.00 "Добрыя намеры", с. 6
22.50 Крымінальная хроніка
23.15 НІКа
23.40 "Сірано дэ Бержэрак", ч. 2

Канал "Астанкіна"

5.30, Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 15.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 "Топа Джыджыа"
8.25, 18.25 "Дзікая Роза"
9.00 У свеце жывёл (з сурдаперакладам)
9.40 "Вялікі Ух", мульт
14.00 Расія на сусветным рынку
14.15 Хроніка дзелавога жыцця
14.25 Гульня па правілах
14.40 Мой маленькі бізнес
15.00 Мульцітролія
15.30 На балі ў Папялушкі
16.00 Камп'ютэр-хол
16.20 "Элен і хлопцы"
16.50 Свет сёння
17.00 ...Да 16 і старэйшым
17.30 Чалавек і закон
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Франц Іосіф
18.00 Гадзіна пік
18.50 Баскетбол. ЦСКА — "Скаваліні" (Італія)
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Масква—Крэмль
21.00 Лато "Мільён"
21.30 "Не будзіце спячага паліцэйскага", м/ф (Францыя)
23.30 "Авацыя" прадстаўляе. У перапынку (23.50) — Прэс-экспрэс

Канал "Расія"

6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны Эй-бі-сі
8.25 Кліп-антракт
8.30 Паехалі
8.40 Тэлегазета
8.45, 19.35 "Санта-Барбара"
10.25 Гандлёвы дом "Ле-Монці"
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 Выратаванне 911
15.10 Музычная мазаіка
15.20 Студыя "Рост"
15.50 Там-там навіны
16.05 Свята кожны дзень
16.15 Штрыхі да партрэта
16.55 Жывём і кахаем
17.10 Будні
17.50 Ніхто не забыты
17.55 У свеце аўта-і мотаспорту
18.25 Свая гульня
19.25 Падрабязнасці
20.30 Шостае пачуццё
21.00 Аншлаг і К
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Альманах сучаснай фантастыкі
23.30 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 "Кошчын дом", мульт
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 14.40, 18.25, 19.25 Музычны момант
13.35, 22.10 "Глушак", м/ф
14.05 Урок нямецкай мовы
14.20 "Каштоўная бандэроль", мульт
14.45 Чароўная лінія
15.00 "Неправінцыяльная правінцыя", т/ф
15.20 Андрэй Рублёў", м/ф
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Закаханы манекен", м/ф
21.00 Мультфільмы
21.10 Тэлемагазін
21.20 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 "Тэлекампакт"
23.40 Баскетбол. "Спартак" (Санкт-Пецярбург) — "Лакаматыў" (Мінеральныя воды)

ПЯТНІЦА, 9.12

Беларускае тэлебачанне

8.00, 17.00, 18.10 (Магілёў), 18.35 (ВВС)
8.10, 20.20 Пяць хвілін на жарты
8.15, 0.05 Дайджэст
8.25 "Па-дакслён", балет
9.00 Тэлебачанне — школе. Беларуская літаратура. Пуцявінамі Андрэя Лабановіча
9.30 "Добрыя намеры", с. 2
10.20 "Казка пра старое рэха", мульт
10.25, 16.40 "Бімбат"
10.45 "Зялёны фургон", м/ф
13.05 Планета людзей. Жывапіс Заходняй Еўропы, ч. 2
14.05 "Песню бярыце з сабою", ч. 2
14.45 "Начныя прыгажуні", м/ф (Францыя)
16.10 "Адам і Марыля", "Іван Насовіч", д/ф
17.10 Рынак і мы
17.35 "Так гэта было..."
17.55 "Домік для ўсіх", мульт
18.25 Кантакт
19.10 Эканамікст
19.20 У нас дома
19.50 Процістаянне
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Падарункі на добры настрой
21.55 Пад купалам Сусвету
22.05 "Дурні паміраюць па пятніцах", м/ф
23.50 НІКа
0.15 "Я + Я"

Канал "Астанкіна"

5.30 Раніца
7.50, 8.50, 9.50, 14.50, 17.50, 20.00, 22.50 Навіны
8.00 Сарока
8.20, 18.20 "Дзікая Роза"
9.00 Агарод круглы год
9.30 Экслібрыс
9.40 "Вайна сланоў і насарогаў", мульт
14.00 Улада і рэформы
14.15 Наш прагноз
14.20 Хроніка дзелавога жыцця
14.30 Шоу і бізнес
15.00 У гасцях у казкі
16.20 Рок-урок
16.50 Свет сёння
17.00 Чалавек і закон
17.40, 20.30 Надвор'е
17.45 "Хто ёсць хто. XX стагоддзе". Г. Герынг
18.00 Бамонд
18.50 Поле цудаў
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.40 Чалавек тыдня
21.00 "Чорны квадрат", м/ф
23.15 Палітбюро
24.00 Прэс-экспрэс
0.10 Музагляд

Канал "Расія"

6.30 Формула-730
7.00, 11.00, 13.00, 15.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.20 Патрабуюцца... патрабуюцца...
7.30 Час дзелавых людзей
8.00 Навіны АВС
8.25, 20.55 Кліп-антракт
8.30 Зусім сакрэтна
9.20 Паехалі
9.30, 19.35 "Санта-Барбара"
10.20 Тэлегазета
10.25 Гандлёвы дом "Ле-Монці"
10.40 Сялянскае пытанне
11.05, 13.20 Дзелавая Расія
13.45 "Тата", "Барвовая трава", к/ф
15.10 Музычная мазаіка
15.20 Там-там навіны
15.35 Свята кожны дзень
15.45 Новая лінія
16.25 На шахматнай алімпіядзе
17.00 Дысней па пятніцах
17.55 Ваша права
18.10 Кар'ера
19.25 Падрабязнасці
20.30 Я — лідэр
21.05 К-2: "Ню"
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 "Звычайнае забойства", м/ф (Германія)
0.35 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

12.00, 14.30, 18.30, 21.30 Інфарм ТБ
12.10 Чароўная лінія
12.25 "Нямецкая хваля"
13.00 Хуткая дапамога
13.30, 14.45, 17.50, 19.25 Музычны момант
13.35, 22.10 "Глушак", м/ф
14.05 "Эскізы харэаграфіі", муз. фільм
14.50 "Закаханы манекен", м/ф
16.15 "Як Алдар-Касэ перахітрыў тыгра", мульт
16.25 Па ўсёй Расіі
16.35 "Фантазія", д/ф
16.45 "Казка пра Залатога пеўніка", мульт
17.15 Рознакаляровы сабака
17.35 Паласатая музыка
17.55 Храм
18.50 Спорт, спорт, спорт...
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Уяўленне зайздрасці", м/ф
20.45 "Ты памятаеш нашы сустрэчы", канцэрт
21.10 Тэлемагазін
21.20 Тэлеслужба бяспекі
21.45 Спартыўныя навіны
22.00 Ваш стыль
22.40 Хакей. СКА — "Цівалі" (Мінск)
23.15 "Смокі і банда Хатуаера", м/ф (ЗША)

СУБОТА, 10.12

Беларускае тэлебачанне

8.00 Навіны
8.10 Дайджэст
8.20 Аэробіка
8.50, 18.45 Пяць хвілін на жарты
8.55 Эканамікст
9.05 "Дурні паміраюць па пятніцах", м/ф
10.45 Здароўе
11.25 "Радзімічы"
12.20 "Вайна пад дахамі", м/ф
14.15 "Лупу — анёл кветак"
14.50 "Пасля 2000 года"
15.45 Армія і вера
16.15 Шматгалоссе
16.45 Сітуацыя
17.25 "Ліцадзеі", т/ф
17.55 Тэлекрама
18.05 "Чарапашкі ніндзя"
18.30 Фаварыты года
18.55 "Пал-Ці"-TV
19.55 Міжнародныя спартыўныя навіны
20.30 Кальханка
21.00 Панарама
21.40 Пад купалам Сусвету
21.50 "Прыватнае жыццё", м/ф
23.40 Каскад
0.05 Дзелавы веснік
0.20 Відзьма-нявідзьма
1.20 "Нов і К"-топ-10

Канал "Астанкіна"

6.30 Раніца дзелавога чалавека
7.15 Спорт-шанц
7.45 Слова пастыра
8.00 "Марафон-15"
8.30 Кампанія "Мір"
10.00 Раніцняя пошта
10.30 Я — жанчына
11.00 Без паўзы
11.15 Смак
11.30 Кніжны двор
12.00 Хакей. ЦСКА — "Дынама". У перапынку (13.20) — Навіны
14.15 Праблемы фермерства і ўласнасці на зямлю
14.55 "Не вер, не бойся, не прасі...", д/ф, с. 1
15.50 Жывое дрэва рамёстваў
15.55 Брэйн-рынг
16.45 Маналог
17.00 Да і пасля...
17.50 "Забойства ў раі", м/ф
19.40 Добрай ночы, малышы!
20.00 Навіны плюс
20.35, 23.00 Надвор'е
20.45 Што? Дзе? Калі?
21.55 Матадор
22.50, 23.50 Навіны
23.10 Хіт-парад "Астанкіна"

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.25 Мульці-пульці
7.55 Студыя "Рост"
8.25 Пілігрым
9.10 Парламенцкі тыдзень
9.55 Вінілавыя джунглі
10.25 Тэлеэрудыт
10.30 Зваротны адрас
11.15 "Васіліса Прыгожая", м/ф
12.25 Людзі
12.40 Сялянскае пытанне
13.20 Дэ'факта
13.35 Кліп-антракт
13.40 "Эдэра"
14.35 Спявае Л. Дзмітрыева
15.05 "Капальні цара Саламона", мульт (ЗША)
16.00 Футбол без межаў
16.45 На шахматнай алімпіядзе
17.15 Тэлевізійны тэатр Расіі. "Апошняе каханне Маякоўскага", прэм'ера. У перапынку — Тэлеэрудыт
18.45 Свята кожны дзень
19.25 "Кветачка ў яго ў роце", м/ф (Італія)
21.25 Гарадок
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 Праграма "А"
23.50 "На поўдні маёй душы", м/ф (Германія)
1.20 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

8.55 "Гадзіна Фрэйзера"
9.30 Чароўная лінія
9.45, 11.20 А. Бялінскі. "Пяты дзесятак", спектакль
10.50 Канцэрт па заяўках
12.15 Мультфільмы
13.00 Хуткая дапамога
13.30 "Вышыня", м/ф
15.05 Я і мой сабака
16.15 "Запаведнік у цэнтры Азіі", т/ф
17.20 "Дык хто ж ты, нарэшце?"
17.40 Экспрэс-кіно
17.55, 21.20 Уік-энд з дэтэктывам
18.30, 21.30 Інфарм ТБ
18.55 "Дыпламат", т/ф
19.10 Вялікі фестываль
19.30 "Страсці", м/ф
21.05 Мультфільм
21.45 Ваш стыль
21.55 "Не хочаш — не глядзі"
23.05 Баскетбол. "Спартак" (Санкт-Пецярбург) — "Акварыус" (Валгаград)

НЯДЗЕЛЯ, 11.12

Беларускае тэлебачанне

8.00 Аэробіка
8.30, 21.00 Пяць хвілін на жарты
8.40 Слова да чалавека
9.10 Добрыя весткі
9.20 Урокі здароўя
9.45 Архіварыус
10.15 Белыя і чорныя
10.45 Гасцёўня "Тэлебома-біс"
11.30 "АВС-клуб"
11.45 Кінаэкран-94. Снежань
12.50 Паміж намі, жанчынамі
13.35 КВЗ-94. Фінал
15.05 Данііл Хармс. "Цырк Шардам". Спектакль Акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа
16.05 Нацыянальны конкурс спевакоў імя Л. Александроўскай
16.35 "Чарапашкі ніндзя"
17.00 "Усе за ўсмешку"
17.35 "Формула кахання", м/ф
19.05 Праспект
19.35 Фаварыты года
20.00 Панарама
20.40 Кальханка
21.10 Пад купалам Сусвету
21.20 Вячэрні роздум
21.30 Шоу "Палігон"
22.00 "Сувязь праз піцарыю", м/ф (Італія)
0.05 Валейбол. СКА (Мінск) — "Халаэль" (Бат Ям, Ізраіль)

Канал "Астанкіна"

7.15 Алімпійская раніца
7.50 Спортлато
8.00 Марафон-15
8.30 Раным-рана
9.00 Палігон
9.30 Пакуль усе дома
10.00 Раніцняя зорка
10.50 Пад знакам "ні"
11.30 Люстэрка
12.05 "Не вер, не бойся, не прасі...", с. 2
13.00 "Падводная адысея каманды Кусто"
13.50, 17.00, 22.50, 23.50 Навіны
14.00 "Шпаргалка" з падарункам"
14.15 "Стратэгія Перамогі", ч. 11
15.10 Клуб падарожнікаў
16.00 Ахоўная грамата
16.30 Амерыка з М. Таратутам
17.10 Мультсерыялы (ЗША)
18.05 Тэлелоцыя
18.20 Уся Расія
18.45 Надвор'е
18.55 "Скалалаз", м/ф (ЗША)
21.00 Нядзеля
21.50 Спартыўны уік-энд
22.05 Вакзал мары
23.00 Хакей. "Крылы Саветаў" — "Спартак"

Канал "Расія"

7.00, 13.00, 19.00, 22.00 Весткі
7.25 "Мастак Міхаіл Несцераў", д/ф
7.45 Студыя "Рост"
8.15 Сусветная вёска
8.45 Суайнынніці
9.25 Добрай раніцы, Еўропа
9.55 Аты-баты...
10.25 Русае лато
11.10 "Каханне з першага погляду", м/ф
12.40 Шэсць сотак
13.20 Не высечы...
13.35 "Эдэра"
14.30 Кліп-антракт
14.35 Лепшыя гульні НБА
15.35 У свеце жывёл
16.30 На шахматнай алімпіядзе
17.05 Чароўны свет Дысней
18.00 Свята кожны дзень
18.10 "Магазін" М. Жванецкага
19.25 "Дапушчальная рызыка", м/ф (ЗША)
21.05 Каробка перадач
21.25 У Ксюшы
22.20 Рака часу
22.25 Аўтаімгненне
22.30 Спартыўная карусель
22.35 Шахматная ліхаманка
22.50 Поўня
23.50 Зоркі гавораць

Санкт-Пецярбург

8.55 "Гаючае слова"
9.30 Чароўная лінія
9.45 "Ірынчын дзённік", м/ф
10.00 Экспрэс-кіно
10.15 "Паглядзім"
10.30 "Рандэву". А. Разенбаум
11.00 Нядзельны лабірынт
12.35 "Хлопчык з ногцік", м/ф
13.50 М. Мусаргскі. "Карцінкі з выстаўкі"
14.40 "Музыкі хопіць усім"
15.25 Чэмпіянат Італіі па футболе
17.20 Залаты ключ
17.35 "Паласаты хіт"
18.15 "Раніца дзелавога чалавека", спектакль
18.55 "Тэлекампакт"
19.30 Інфарм ТБ
19.55 "Каханне. Смяротная гульня", м/ф
21.25 Ваш стыль
21.30 "Паглядзім"
21.45 Адамаў яблык
22.45 Хакей. Кубак МХЛ. СКА — "Хімік" (Воскрасенск)

5-11 СНЕЖНЯ